# Бібліятэчная прастора.

## Віцебскі рэгіён




Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН**

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Складальнікі:
**Воранава** Аксана Мікалаеўна,
**Мелькіна** Надзея Аляксандраўна,
**Пугачова** Наталля Аляксандраўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка і мастацкае афармленне А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210015 г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: biblioteka@mail.vlib.by

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

# БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Віцебск
2024

УДК 027
ББК 78.34(4Беи-4Вит)
Б 67

Складальнікі: *А. М. Воранава, Н. А. Мелькіна, Н. А. Пугачова*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

**Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён** : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Воранава, Н. А. Мелькіна, Н. А. Пугачова]. – Віцебск, 2024. – 104 с.

У штогадовым выданні прадстаўлены агляды дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна і публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці за 2023 год.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2024

*Дадатак № 17*
*Табліца 17*

**МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА**

| ЦБС | Сетка | | Будынкі | | Аг. плошча, м² | | Б-кі, якія маюць персанальныя камп'ютары | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | сельск. мясц.* | усяго | сельск. мясц.* | усяго | сельск. мясц.* | усяго | сельск. мясц.* |
| Бешанковіцкая | 11 | 10 | 11 | 10 | 2502 | 1303 | 11 | 10 |
| Браслаўская | 13 | 10 | 13 | 10 | 1321 | 720 | 13 | 10 |
| Верхнядзвінская | 17 | 14 | 16 | 14 | 1898 | 1302 | 17 | 14 |
| **Віцебская*** | **21** | **19*** | 21 | **19*** | 1816 | **1665*** | 21 | **19*** |
| Глыбоцкая | 25 | 21 | 25 | 22 | 3844 | 2414 | 25 | 21 |
| Гарадоцкая | 14 | 12 | 14 | 12 | 2030 | 1503 | 14 | 12 |
| Докшыцкая | 19 | 16 | 18 | 16 | 2794 | 1752 | 14 | 11 |
| Дубровенская | 17 | 15 | 17 | 15 | 2539 | 1862 | 17 | 15 |
| Лепельская | 16 | 14 | 15 | 14 | 1916 | 1283 | 16 | 14 |
| Лёзненская | 15 | 13 | 15 | 13 | 2151 | 1133 | 15 | 13 |
| Мёрская | 18 | 15 | 18 | 15 | 1839 | 1134 | 16 | 13 |
| Аршанская | 34 | 21 | 34 | 21 | 8953 | 5007 | 34 | 21 |
| Полацкая | 35 | 24 | 35 | 24 | 6968 | 2289 | 35 | 24 |
| Пастаўская | 18 | 13 | 18 | 13 | 1762 | 824 | 18 | 13 |
| Расонская | 9 | 8 | 9 | 8 | 2052 | 1891 | 9 | 8 |
| Сенненская | 15 | 12 | 15 | 12 | 1410 | 857 | 15 | 12 |
| Талачынская | 15 | 12 | 15 | 12 | 1899 | 1137 | 15 | 12 |
| Ушацкая | 9 | 8 | 10 | 8 | 1151 | 594 | 9 | 8 |
| Чашніцкая | 15 | 11 | 15 | 11 | 2789 | 1578 | 15 | 11 |
| Шаркаўшчынская | 13 | 11 | 13 | 11 | 1510 | 958 | 13 | 11 |
| Шумілінская | 14 | 10 | 13 | 10 | 1750 | 745 | 14 | 10 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **363** | **289** | **360** | **290** | **54894** | **31951** | **356** | **282** |
| г.Віцебск | 16 | 0 | 15 | 0 | 6964 | 0 | 16 | 0 |
| г.Наваполацк | 7 | 0 | 7 | 0 | 5547 | 0 | 7 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **23** | **0** | **22** | **0** | **12511** | **0** | **23** | **0** |
| **УСЯГО па** | **386** | **289** | **382** | **290** | **67405** | **31951** | **379** | **282** |
| Абласная б-ка | 1 | 0 | 1 | 0 | 4213 | 0 | 1 | 0 |
| **УСЯГО** | **387** | **289** | **383** | **290** | **71618** | **31951** | **380** | **282** |
| 2022 год | 392 | 291 | 387 | 292 | 68355 | 27962 | 382 | 281 |

| ЦБС | З агульнай колькасці па напрамках | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Краязнаўчыя | Літаратурна-мастацкія | Эстэтычныя | Духоўнага накірунку | Экалагічныя | Здаровы лад жыцця | Адукацыйныя | Дасугавыя | Шматпрофільныя | Патрыятычныя | Прававыя |
| Бешанковіцкая | 3 | 3 | 1 | 0 | 0 | 2 | 0 | 7 | 1 | 0 | 0 |
| Браслаўская | 1 | 4 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 3 | 5 | 0 | 0 |
| Верхнядзвінская | 1 | 1 | 3 | 0 | 3 | 2 | 0 | 5 | 1 | 0 | 0 |
| Віцебская | 1 | 8 | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 | 2 | 8 | 0 | 0 |
| Глыбоцкая | 0 | 3 | 2 | 2 | 2 | 0 | 0 | 7 | 1 | 1 | 1 |
| Гарадоцкая | 0 | 1 | 1 | 1 | 3 | 0 | 0 | 8 | 4 | 0 | 1 |
| Докшыцкая | 3 | 5 | 2 | 0 | 4 | 0 | 0 | 12 | 0 | 0 | 0 |
| Дубровенская | 0 | 0 | 5 | 0 | 3 | 0 | 0 | 4 | 2 | 0 | 0 |
| Лепельская | 1 | 2 | 1 | 0 | 1 | 1 | 0 | 8 | 0 | 0 | 1 |
| Лёзненская | 1 | 5 | 1 | 0 | 3 | 0 | 0 | 6 | 1 | 0 | 0 |
| Мёрская | 0 | 1 | 2 | 0 | 3 | 0 | 0 | 11 | 0 | 0 | 0 |
| Аршанская | 2 | 13 | 7 | 0 | 4 | 1 | 1 | 3 | 0 | 0 | 0 |
| Полацкая | 1 | 0 | 1 | 0 | 4 | 1 | 0 | 12 | 8 | 2 | 0 |
| Пастаўская | 2 | 1 | 0 | 0 | 3 | 0 | 0 | 0 | 7 | 0 | 0 |
| Расонская | 3 | 1 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 | 2 | 0 | 0 | 0 |
| Сенненская | 1 | 4 | 1 | 0 | 2 | 0 | 0 | 6 | 4 | 0 | 0 |
| Талачынская | 0 | 2 | 0 | 0 | 3 | 1 | 0 | 6 | 0 | 0 | 0 |
| Ушацкая | 3 | 1 | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 | 6 | 0 | 0 | 1 |
| Чашніцкая | 0 | 1 | 1 | 2 | 1 | 0 | 0 | 3 | 6 | 0 | 0 |
| Шаркаўшчынская | 0 | 5 | 2 | 0 | 2 | 0 | 0 | 1 | 3 | 0 | 0 |
| Шумілінская | 1 | 6 | 3 | 0 | 2 | 0 | 1 | 0 | 2 | 1 | 0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **24** | **67** | **36** | **5** | **46** | **8** | **2** | **112** | **53** | **4** | **4** |
| г.Віцебск | 1 | 4 | 2 | 0 | 1 | 1 | 0 | 5 | 1 | 0 | 0 |
| г.Наваполацк | 0 | 1 | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1** | **5** | **3** | **0** | **2** | **1** | **0** | **6** | **1** | **0** | **0** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **25** | **72** | **39** | **5** | **48** | **9** | **2** | **118** | **54** | **4** | **4** |



# ЗМЕСТ


ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА Ў 2023 ГОДЗЕ 4
*Камендантава В.М. – намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна*

АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА 2023 ГОД 14

САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ 61

ДАДАТКІ 73
Табліца № 1. Сетка публічных бібліятэк Віцебскай вобласці 73
Табліца № 2. Рэарганізацыйныя працэсы публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2023 годзе 75
Табліца № 3. Інтэграваныя бібліятэкі (аб’яднаныя публічныя і школьныя) у 2023 годзе 77
Табліца № 4. Спіс бібліятэк змяшанага тыпу ў Віцебскай вобласці 78
Табліца № 5. Карыстальнікі 80
Табліца № 6. Наведванні 82
Табліца № 7. Дакументавыдача 84
Табліца № 8. Стан бібліятэчных фондаў 86
Табліца № 9. Аб’ём бюджэтнага фінансавання ў 2023 годзе 88
Табліца № 10. Камп’ютарызацыя і аўтаматызацыя 90
Табліца № 11. Платныя паслугі 93
Табліца № 12. Бібліятэчныя кадры 95
Табліца № 13. Бібліятэкі ў СМІ 96
Табліца № 14. Арганізацыя работы бібліёбусаў 97
Табліца № 15. Абслугоўванне карыстальнікаў з парушэннямі зроку 99
Табліца № 16. Клубы па інтарэсах і аматарскія аб’яднанні 101
Табліца № 17. Матэрыяльна-тэхнічная база 103

# ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА Ў 2023 ГОДЗЕ

***Камендантава В.М.,***
*намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці*
*Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*

Асноўнымі задачамі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна ў 2023 годзе былі развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, цікавасці да вывучэння гісторыі і культуры Віцебшчыны, максімальна поўнае забеспячэнне запытаў карыстальнікаў, далучэнне іх да найлепшых узораў беларускай кніжнай спадчыны, творчасці дзеячаў беларускай і замежнай літаратуры, культуры, мастацтва.

Аддзеламі бібліятэкі было абслужана 31 567 непасрэдных карыстальнікаў пры плане 33 400 (94,5% да плана), з іх чытачы з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі склалі больш за 100 чалавек. За справаздачны год абанентам бібліятэкі было прадастаўлена ў часовае карыстанне 650 231 экз. дакументаў (92,9% да запланаванага). Праз сістэму МБА абслугоўвалася 219 абанентаў, якім было выдана 510 адзінак захоўвання.

Агульная колькасць наведванняў склала 1 894 476 (100,9% да плана). У справаздачным годзе колькасць віртуальных наведванняў на афіцыйны сайт бібліятэкі склала 1 741 724 наведванняў, непасрэдных – 152 752. На працягу года ў бібліятэцы і па-за яе сценамі прайшло 591 масавае мерапрыемства, іх наведалі 17 205 чалавек.

У структуры бібліятэкі адбыліся змяненні: з 1 лістапада ў выніку аб'яднання аддзела «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» і электроннай чытальнай залы пачаў работу аддзел прававой інфармацыі і электронных рэсурсаў. Такім чынам, на канец справаздачнага года ў бібліятэцы працавала 7 функцыянальных аддзелаў і 11 аддзелаў абслугоўвання, якія былі адкрытыя для карыстальнікаў 298 дзён. З 14 верасня 2023 года пры аддзеле рэдкай кнігі функцыянуе выставачная зала «ExLibris», экспазіцыя якой уключае больш за сотню рэдкіх і асабліва каштоўных кніг з фондаў бібліятэкі.

У 2023 годзе ў бібліятэцы працаваў 81 бібліятэчны работнік. З 45 супрацоўнікаў аддзелаў абслугоўвання 33 бібліятэчныя кіраўнікі і спецыялісты былі заняты непасрэдна абслугоўваннем чытачоў.

На камплектаванне бібліятэчнага фонду зрасходавана 286,3 тыс. руб. бюджэтных сродкаў. У тым ліку: на набыццё бібліятэчных дакументаў (кніг, брашур, нот, выяўленчых і аўдыявізуальных дакументаў) – 123,8 тыс. руб., на перыядычныя выданні – 114,2 тыс. руб., на набыццё электронных інфармацыйных рэсурсаў і праў доступу да іх – 48,3 тыс. руб.

Усяго ў бібліятэку паступіла 10 676 экз. дакументаў (з іх сацыяльна значных – 651 экз.). У тым ліку набыта за бюджэтныя сродкі – 9 006 экз.





**КЛУБЫ ПА ІНТАРЭСАХ І АМАТАРСКІЯ АБ'ЯДНАННІ**

| ЦБС | Усяго | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | з іх | | | |
| | **Кольк. клубаў** | **Кольк. удзельн.** | ***для дзяцей*** | ***кольк. удзельн.*** | ***для дарослых*** | *кольк. удзельн.* |
| Бешанковіцкая | 17 | 176 | 8 | 89 | 9 | 87 |
| Браслаўская | 14 | 217 | 5 | 97 | 9 | 120 |
| Верхнядзвінская | 16 | 145 | 10 | 83 | 6 | 62 |
| Віцебская | 21 | 274 | 7 | 92 | 14 | 182 |
| Глыбоцкая | 19 | 294 | 12 | 198 | 7 | 96 |
| Гарадоцкая | 19 | 231 | 11 | 141 | 8 | 90 |
| Докшыцкая | 26 | 237 | 13 | 123 | 13 | 114 |
| Дубровенская | 14 | 145 | 8 | 80 | 6 | 65 |
| Лепельская | 15 | 165 | 10 | 123 | 6 | 42 |
| Лёзненская | 17 | 219 | 11 | 135 | 6 | 84 |
| Мёрская | 17 | 147 | 7 | 58 | 10 | 89 |
| Аршанская | 31 | 411 | 15 | 187 | 16 | 224 |
| Полацкая | 29 | 387 | 15 | 209 | 14 | 178 |
| Пастаўская | 13 | 176 | 4 | 63 | 9 | 113 |
| Расонская | 7 | 65 | 4 | 39 | 3 | 26 |
| Сенненская | 18 | 195 | 7 | 65 | 11 | 130 |
| Талачынская | 12 | 108 | 7 | 55 | 5 | 53 |
| Ушацкая | 13 | 112 | 8 | 78 | 5 | 34 |
| Чашніцкая | 14 | 279 | 8 | 138 | 6 | 141 |
| Шаркаўшчынская | 13 | 137 | 6 | 54 | 7 | 83 |
| Шумілінская | 16 | 157 | 13 | 104 | 3 | 53 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **361** | **4277** | **189** | **2211** | **173** | **2066** |
| г.Віцебск | 15 | 227 | 4 | 74 | 11 | 153 |
| г.Наваполацк | 4 | 86 | 1 | 26 | 3 | 60 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **19** | **313** | **5** | **100** | **14** | **213** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **380** | **4590** | **194** | **2311** | **187** | **2279** |
| 2022 год | 404 | 5031 | 205 | 2412 | 199 | 2683 |

*Працяг табліцы 15*

| ЦБС | Паступіла агучанай літаратуры | | Колькасць выданых дакументаў | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | кольк. экз. | на суму (руб.) | УСЯГО | У т.л. | |
| | | | | агуч. літ. | шр. Брайля |
| Бешанковіцкая | 18 | 179,76 | 236 | 0 | 0 |
| Браслаўская | 22 | 402,00 | 359 | 0 | 0 |
| Верхнядзвінская | 28 | 921,74 | 401 | 14 | 0 |
| Віцебская | 0 | 0,00 | 208 | 12 | 0 |
| Гарадоцкая | 20 | 746,31 | 199 | 0 | 0 |
| Глыбоцкая | 30 | 428,97 | 49 | 3 | 0 |
| Докшыцкая | 38 | 520,70 | 228 | 66 | 0 |
| Дубровенская | 11 | 163,84 | 457 | 0 | 0 |
| Лепельская | 11 | 116,99 | 180 | 3 | 3 |
| Лёзненская | 13 | 333,13 | 187 | 3 | 0 |
| Мёрская | 7 | 161,99 | 102 | 7 | 0 |
| Аршанская | 91 | 2039,30 | 7062 | 2503 | 0 |
| Полацкая | 76 | 1351,48 | 406 | 406 | 0 |
| Пастаўская | **0** | 0,00 | 0 | 0 | 0 |
| Расонская | 10 | 168,88 | 0 | 0 | 0 |
| Сенненская | 9 | 182,22 | 101 | 14 | 0 |
| Талачынская | 17 | 350,37 | 444 | 14 | 0 |
| Ушацкая | **0** | 0,00 | 60 | 0 | 0 |
| Чашніцкая | 20 | 302,78 | 145 | 7 | 0 |
| Шаркаўшчынская | 10 | 77,97 | 645 | 5 | 0 |
| Шумілінская | 8 | 66,89 | 59 | 30 | 0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **439** | **8515,32** | ***11528*** | ***3087*** | ***3*** |
| г.Віцебск | 112 | 3490,11 | 2362 | 2314 | 0 |
| г.Наваполацк | **0** | 0,00 | 1 | 1 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **112** | **3490,11** | ***2363*** | ***2315*** | ***0*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **551** | **12005,43** | **13891** | **5402** | **3** |
| Абласная | 204 | 2698,68 | 336 | 19 | 177 |
| **УСЯГО** | **755** | **14704,11** | **14227** | **5421** | **180** |
| 2022 год | 861 | 18459,81 | 14316 | 6266 | 327 |



дакументаў, за пазабюджэтныя – 24 экз. Паказчык ад агульнага бюджэту на камплектаванне складаў 12,7%, працэнт абнаўлення фонду – 1,0%. На пачатак 2024 года бібліятэчны фонд складаў 668 267 адзінак захоўвання.

Для максімальна поўнага задавальнення інфармацыйных запытаў карыстальнікаў бібліятэкі былі набыты правы доступу да ліцэнзійных электронна-бібліятэчных сістэм «Znanium.com», «Университетская библиотека онлайн», электроннай бібліятэкі «ЛитРес».

У справаздачным годзе была працягнута генерацыя ўласных інфармацыйных рэсурсаў: электронны каталог павялічыўся на 40 960 запісаў. Прайшлі алічбаванне 142 дакументы агульнай колькасцю 79 891 старонка. На працягу года быў распрацаваны макет і напоўнены асноўныя раздзелы лакальнай базы даных «Рэгіянальны архіў перыядычных выданняў», якая змяшчае электронныя версіі алічбаваных газет, якія выходзілі на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў перыяд з 1946 года.

2023 год быў вызначаны новым віртуальным праектам «Святыя заступнікі Віцебшчыны», створаным у рамках мэтавай комплекснай праграмы «Жывое слова мудрасці духоўнай» і прадстаўленым на штогадовы рэспубліканскі конкурс Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі.

На працягу мінулага года супрацоўнікі бібліятэкі забяспечвалі аператыўнае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў у зале каталогаў і аддзелах абслугоўвання бібліятэкі. Па запытах непасрэдных карыстальнікаў было выканана 12 369 бібліяграфічных і фактаграфічных даведак.

Для пошуку нацыянальных заканадаўчых дакументаў, а таксама заканадаўчых актаў Расійскай Федэрацыі ў аддзеле прававой інфармацыі і электронных рэсурсаў шырока выкарыстоўвалася электронная інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС) «Эталон» версіі 6.9. За 2023 год да яе звярнуліся 1 747 карыстальнікаў бібліятэкі.

У мэтах павышэння інфармацыйнай культуры карыстальнікаў у 2023 годзе былі праведзены 44 экскурсіі па бібліятэцы, акрамя іх 39 экскурсій прайшло па аддзеле рэдкай кнігі і выставачнай зале «ExLibris». Агульная колькасць традыцыйных бібліятэчных выстаў склала 419, з якіх 70 былі адрасаваны чытачам-дзецям. Акрамя іх супрацоўнікамі бібліятэкі былі распрацаваны 39 анлайн-выстаў, электронных прэзентацый і віртуальных аглядаў.

Найбольш значныя сацыякультурныя мерапрыемствы мелі патрыятычную і інтэрнацыянальную накіраванасць, а галоўнымі тэмамі года сталі народнае адзінства, стваральная праца, ваенная гісторыя і генацыд беларускага народа.

Сярод астатніх вялікі рэзананс мелі прэзентацыя кнігі журналіста, аглядальніка БЕЛТА па асвятленні дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пісьменніка, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Аліны Тадэвушаўны Грышкевіч «Судьбы женщин – судьба единой Беларуси», гадзіна інфармацыі «На шляху да адзінства», круглы стол «Сіла народа – у адзінстве».

Шэраг бібліятэчных мерапрыемстваў быў прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны, слаўнай і трагічнай гістарычнай мінуўшчыне краіны і Віцебскага рэгіёна. Сярод іх асаблівай увагі заслугоўвае вечар-рэквіем «Беларусь памятае. Галасы спаленых вёсак» да 80-годдзя трагедыі ў Хатыні, што прайшоў 20 сакавіка. Пра невядомыя шырокай аўдыторыі падзеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, работу па стварэнні рэсурсаў, прысвечаных яе старонкам, расказалі прадстаўнікі Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, музеяў горада.

23 сакавіка ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі «Геноцид белорусского народа. Лагеря смерти» пад агульнай рэдакцыяй Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Андрэя Шведа, у якой прадстаўлены звесткі пра лагеры смерці на тэрыторыі Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі. На мерапрыемстве слова ўзялі намеснік начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства ў войсках, старшы саветнік юстыцыі пракуратуры Віцебскай вобласці Ігар Мяцеліца, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Андрэй Бялецкі, намеснік дырэктара Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці Тацццяна Буевіч.

Мінулы год быў вызначаны не толькі прэзентацыямі ваенна-патрыятычных выданняў нашых сучаснікаў, але і ўспамінамі пра іх папярэднікаў – віцебскіх даследчыках перыяду Вялікай Айчыннай вайны: Уладзіміра Хазанскага, Ніну і Мікалая Дарафеенкаў. Вечарына памяці апошніх прайшла ў бібліятэцы 18 мая пад назвай «Летапісцы гераічнага мінулага» і была прысвечана 100-годдзю з дня іх нараджэння.

Тэма падпольнай барацьбы была ўзгадана ў бібліятэцы і на ўрачыстым вечары «Сустрэча пакаленняў», што адбыўся 22 снежня – у дзень 100-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, ганаровага грамадзяніна горада Віцебска Ефрасінні Зяньковай.

На працягу справаздачнага года мэтанакіравана праводзілася работа па далучэнні карыстальнікаў да вывучэння нацыянальнай культуры, мовы і літаратуры. Добрай традыцыяй бібліятэкі стала святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы, які ў мінулым годзе быў адзначаны літаратурна-музычнай вечарынай і агульнай дыктоўкай, што прайшлі 21 лютага.

Відавочна, што асаблівая ўвага ў 2023 годзе надавалася папулярызацыі творчасці віцебскіх аўтараў. На працягу справаздачнага перыяду адбыліся святочная вечарына да 75-гадовага юбілею нязменнага старшыні Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратара і грамадскага дзеяча Тамары Красновай-Гусачэнкі, творчая сустрэча з паэтэсай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам Саюза пісьменнікаў Расіі, лаўрэатам міжнародных літаратурных конкурсаў Аленай Крыклівец, ураджэнкай Бешанковіцкага раёна, аўтаркай, што неаднаразова друкавалася на старонках газет «Віцебскі рабочы», «Народнае слова», «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Маладосць», «Алеся», літаратурных альманахаў і паэтычных зборнікаў Наталляй





**АБСЛУГОЎВАННЕ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ З ПАРУШЭННЯМІ ЗРОКУ**

| ЦБС | Колькасць чытачоў-інвалідаў па зроку | | | Фонд для інвалідаў па зроку | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | УСЯГО | у т.л. наведв. б-ку | у т.л. абслуг. у хатніх умовах | УСЯГО | у т.л. агуч. літ. | у т.л. павяліч. шр. | у т.л. шр. Брайля |
| Бешанковіцкая | 7 | 7 | 0 | 159 | 159 | 0 | 0 |
| Браслаўская | 3 | 1 | 2 | 604 | 604 | 0 | 0 |
| Верхнядзвінская | 7 | 6 | 1 | 451 | 451 | 0 | 0 |
| Віцебская | 11 | 8 | 3 | 452 | 452 | 0 | 0 |
| Гарадоцкая | 11 | 8 | 3 | 174 | 174 | 0 | 0 |
| Глыбоцкая | 4 | 3 | 1 | 581 | 581 | 0 | 0 |
| Докшыцкая | 6 | 4 | 2 | 920 | 914 | 0 | 6 |
| Дубровенская | 15 | 9 | 6 | 160 | 133 | 0 | 27 |
| Лепельская | 20 | 18 | 2 | 267 | 266 | 0 | 1 |
| Лёзненская | 7 | 5 | 2 | 181 | 181 | 0 | 0 |
| Мёрская | 7 | 6 | 1 | 311 | 311 | 0 | 0 |
| Аршанская | 280 | 280 | 0 | 3934 | 3933 | 0 | 1 |
| Полацкая | 9 | 71 | 3 | 3163 | 3157 | 2 | 4 |
| Пастаўская | 0 | 0 | 0 | 201 | 201 | 0 | 0 |
| Расонская | 0 | 0 | 0 | 200 | 200 | 0 | 0 |
| Сенненская | 8 | 7 | 1 | 687 | 687 | 0 | 0 |
| Талачынская | 15 | 14 | 1 | 500 | 500 | 0 | 0 |
| Ушацкая | 8 | 8 | 0 | 346 | 346 | 0 | 0 |
| Чашніцкая | 9 | 8 | 1 | 251 | 251 | 0 | 0 |
| Шаркаўшчынская | 8 | 8 | 8 | 120 | 120 | 0 | 0 |
| Шумілінская | 13 | 7 | 6 | 215 | 215 | 0 | 0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***448*** | ***478*** | ***43*** | ***13877*** | ***13836*** | ***2*** | ***39*** |
| г.Віцебск | 207 | 206 | 1 | 3128 | 3126 | 0 | 2 |
| г.Наваполацк | 0 | 0 | 0 | 1040 | 1040 | 0 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***207*** | ***206*** | ***1*** | ***4168*** | ***4166*** | ***0*** | ***2*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **655** | **684** | **44** | **18045** | **18002** | **2** | **41** |
| Абласная | 34 | 18 | 15 | **1714** | **1420** | **0** | 294 |
| **УСЯГО** | **689** | **702** | **59** | **19759** | **19422** | **2** | **335** |
| 2022 год | 729 | 642 | 87 | 19031 | 18704 | 0 | 327 |

*Працяг табліцы 14*

| ЦБС | Маршруты, выезды | | | | Кольк. жыхароў у зоне абслуг. | Паказчыкі | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Маршруты | Кольк. пунктаў на маршруце | Кольк. выездаў | Наведаны кожны пункт у сярэднім | | чытачоў | кнігавыдач | наведванняў | % ахопу насельн. у зоне абслуг. |
| Бешанковіцкая | 12 | 1-5 | 126 | 10,5 | 1782 | 234 | 10690 | 1811 | 13,1 |
| Браслаўская | 11 | 4-14 | 113 | 10,3 | 1965 | 248 | 16617 | 2161 | 12,6 |
| Верхнядзвінская | 11 | 2-4 | 48 | 4,4 | 1214 | 135 | 3379 | 641 | 11,1 |
| Віцебская | 12 | 2-3 | 47 | 3,9 | 5826 | 535 | 7646 | 1899 | 9,2 |
| Глыбоцкая | 8 | 3-4 | 75 | 9,4 | 2817 | 330 | 9345 | 1775 | 11,7 |
| Гарадоцкая | 11 | 3-8 | 107 | 9,7 | 2281 | 575 | 18128 | 3639 | 25,2 |
| Докшыцкая | 8 | 2-8 | 66 | 8,3 | 1886 | 214 | 8555 | 1815 | 11,3 |
| Дубровенская | 7 | 2-5 | 98 | 14,0 | 602 | 307 | 8232 | 1874 | 51,0 |
| Лепельская | 6 | 4-9 | 52 | 8,7 | 1795 | 314 | 8252 | 1808 | 17,5 |
| Лёзненская | 7 | 3 | 75 | 10,7 | 1756 | 175 | 4092 | 1089 | 10,0 |
| Мёрская | 0 | 0 | 0 | 0,0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0,0 |
| Аршанская | 23 | 2-3 | 131 | 5,7 | 4336 | 629 | 13410 | 2801 | 14,5 |
| Полацкая | 15 | 1-5 | 110 | 7,3 | 2411 | 301 | 7043 | 1392 | 12,5 |
| Пастаўская | 0 | 0 | 0 | 0,0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0,0 |
| Расонская | 6 | 6-9 | 53 | 8,8 | 1542 | 180 | 8322 | 1000 | 11,7 |
| Сенненская | 14 | 2-6 | 161 | 11,5 | 2337 | 405 | 17092 | 4007 | 17,3 |
| Талачынская | 11 | 1-5 | 140 | 12,7 | 2795 | 384 | 10455 | 2558 | 13,7 |
| Ушацкая | 0 | 0 | 0 | 0,0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0,0 |
| Чашніцкая | 10 | 1-5 | 64 | 6,4 | 2123 | 185 | 6698 | 775 | 8,7 |
| Шаркаўшчынская | 10 | 3-5 | 55 | 5,5 | 2894 | 381 | 11872 | 1623 | 13,2 |
| Шумілінская | 15 | 4-6 | 84 | 5,6 | 2644 | 652 | 17153 | 2626 | 24,7 |
| **Усяго па РЦБС** | **197** | **1-14** | **1605** | **8,1** | **43006** | **6184** | **186981** | **35294** | **14,4** |
| 2022 год | 200 | 1-14 | 1522 | 7,6 | 42428 | 6119 | 177429 | 32468 | 14,4 |



Галавач, наваполацкім літаратарам, членам Віцебскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Ірынай Багданавай.

Адна з цэнтральных літаратурных падзей года адбылася ў бібліятэцы 21 снежня: у гэты дзень прайшла літаратурна-музычная вечарына «Альманаху “Дзвіна” – 65!» і прэзентацыя 7-га выпуску выдання «Дзвіна: Віцебшчына літаратурная». Супрацоўнікі бібліятэкі нагадалі гасцям мерапрыемства гісторыю абласнога літаратурна-мастацкага альманаха, а паэты-аўтары выступілі перад прысутнымі са сваімі новымі творамі. Традыцыйна літаратурны год у бібліятэцы быў завершаны ўручэннем «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама: у мінулым годзе ў намінацыі «паэзія» яе ўладальнікам стаў Антон Параскевін (Віктар Улюценка), а ў намінацыі «літаратура для дзяцей» – Лідзія Піскун.

Папулярызацыі беларускай літаратуры не ў меншай ступені чым масавыя мерапрыемствы спрыялі выставы-прагляды і кніжна-ілюстрацыйныя выставы, што праходзілі як у бібліятэцы, так і за яе межамі. Самая маштабная з апошніх была прадстаўлена 2–3 верасня на XXX Дні беларускага пісьменства ў Гарадку. Акрамя яе на бібліятэчнай пляцоўцы адбыліся прэзентацыі кнігі «Городокский край» і зборніка Святланы Дзядзінкінай і Сяргея Кавалеўскага «Река памяти», былі прадстаўлены для галасавання гледачоў лепшыя работы ўдзельнікаў гарадскога конкурсу аўтарскіх кніжных ілюстрацый «Малюем чароўны свет Хатабыча», што праводзіла бібліятэка сумесна з рэдакцыяй газеты «Віцьбічы» да 120-годдзя з дня нараджэння ўраджэнца Віцебска пісьменніка Лазара Лагіна і 85-годдзя першага выдання чароўнай аповесці-казкі «Стары Хатабыч».

Акрамя літаратурнага актыўна развіваўся напрамак гістарычнага краязнаўства. Асноўныя мерапрыемствы ў яго рамках у сваёй большасці былі прысвечаны 85-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, сярод іх – пашыранае пасяджэнне Каардынацыйнага савета грамадскіх арганізацый і палітычных партый г. Віцебска, тэматычная гасцёўня «АРХІВАЖНА: Гісторыя Віцебшчыны ў асобах», краязнаўчыя гадзіны «Слаўлю цябе, сінявокая Віцебшчына», «Дакументальная спадчына Віцебскага краю», «Гонар і слава роднага краю».

Тэме выбітных землякоў, што праславілі рэгіён, была прысвечана прэзентацыя кнігі кандыдата гістарычных навук, загадчыка аддзела навукова-інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра Бараноўскага «Дзмітрый Прышчэпаў. Старонкі жыцця». Мерапрыемства адбылося 27 красавіка.

Праз тыдзень у бібліятэцы ўзгадалі яшчэ аднаго знакамітага дзеяча вобласці – былога першага сакратара Віцебскага абкама партыі, ганаровага грамадзяніна г. Віцебска Сяргея Міхайлавіча Шабашова, з дня нараджэння якога 1 мая споўнілася 100 гадоў.

На працягу года ў бібліятэцы праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю літаратуры па мастацтве, у дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў сферы культуры, мастацкай адукацыі, знаёмства з рознымі відамі мастацтва і творчасцю віцебскіх аўтараў. У

рамках праекта «Адлюстраванне» былі арганізаваны і прадстаўлены шырокай аўдыторыі 10 мастацкіх выстаў прафесійных мастакоў і творцаў-аматараў, 8 выстаў дзіцячай творчасці. У рамках праекта «Бібліятэка – тэрыторыя творчасці» былі падрыхтаваны і праведзены 83 майстар-класы па папяровай пластыцы, цестапластыцы, арыгамі і аплікацыі. Прайшлі 52 заняткі школы малявання для дарослых «MASTAK».

Трэнд правядзення разнастайных лекцыйных заняткаў на базе агульнадаступных бібліятэк для ўсіх жадаючых па-ранейшаму не здае сваіх пазіцый. У 2023 годзе быў працягнуты цыкл лекцый кампазітара, педагога, члена Беларускага саюза кампазітараў Аляксандра Іванова «Музыка для ўсіх», што распачаўся яшчэ ў лютым 2019 года. На працягу справаздачнага года ў рамках цыкла было прадстаўлена дзевяць публічных лекцый па гісторыі музыкі.

У мінулым годзе была завершана рэалізацыя мэтавай комплекснай праграмы «Жывое слова мудрасці духоўнай», што па ўзгадненні з кіраўніцтвам камісіі па праваслаўных бібліятэках і кафедрах праваслаўнай літаратуры Віцебскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы была разлічана на 2021–2023 гады. Асноўныя мерапрыемствы, накіраваныя на духоўную асвету і выхаванне на праваслаўных традыцыях, у справаздачным годзе былі праведзены ў рамках рэалізацыі вышэй адзначанай праграмы і мелі вялікую разнастайнасць формаў і тэм.

Асаблівай падзеяй у жыцці бібліятэкі стала стварэнне батлеечнага тэатра, пастаноўкі якога ў класічным варыянце прадугледжваюць звяртанне да біблейскай тэматыкі. Аўтарскія лялькі былі выраблены студэнтамі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, а рэквізіт і мастацкае афармленне тэатра забяспечаны супрацоўнікамі бібліятэкі, з іх складу былі сфарміраваны тэатральная трупа і сцэнарна-рэжысёрская група. На канец года ў рэпертуары бібліятэчнага тэатра налічвалася дзве пастаноўкі, якія былі 13 разоў прадстаўлены ўвазе звыш за 400 гледачоў розных узроставых груп.

Свабодны доступ усіх катэгорый грамадзян да прававой інфармацыі і актыўную сацыякультурную дзейнасць, накіраваную на павышэнне прававой граматнасці насельніцтва, забяспечвае аддзел прававой інфармацыі і электронных рэсурсаў. У адпаведнасці з мэтавай комплекснай праграмай прававой асветы дзяцей і моладзі ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна, разлічанай на 2021–2023 гады, аддзелам быў падрыхтаваны і праведзены шэраг інфармацыйна-асветніцкіх і сацыякультурных мерапрыемстваў розных форм і тэматыкі. Нагадаем найбольш значныя з іх: урок-папярэджанне «Скажы наркотыкам: не!», прававая размова «Канстытуцыя. Чалавек. Дзяржава», гадзіна прававых ведаў «Мір у сям'і за ўсё даражэй», пазнавальная гадзіна «Права на інфармацыю».

У рамках адзначанай праграмы на працягу года ажыццяўляўся асветніцкі праект «Правазнайка», мэтавай аўдыторыяй якога сталі малодшыя школьнікі ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Віцебска». На працягу года ў яго рамках адбылося восем заняткаў прававой тэматыкі.



*Дадатак № 14*
*Табліца 14*

**АРГАНІЗАЦЫЯ РАБОТЫ БІБЛІЁБУСАЎ**

| ЦБС | Бібліёбус | Год выпуску | Год набыцця | Колькасць населеных пунктаў у раёне: усяго | з іх: пус-туюць | з іх: малана-селеныя (да 10 пражы-ваючых) | Кольк. населен. пунктаў, якія не ўзяты на бібл. абслуг. | Кольк. населен. пунктаў, што абслуг. бібліёбусам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бешанковіцкая | 1 | 2007 | 2007 | 239 | 26 | 102 | 90 | 43 |
| Браслаўская | 1 | 2010 | 2010 | 591 | 132 | 212 | 191 | 64 |
| Верхнядзвінская | 1 | 2006 | 2006 | 256 | 46 | 116 | 96 | 26 |
| Віцебская | 1 | 2010 | 2010 | 358 | 22 | 136 | 101 | 27 |
| Глыбоцкая | 1 | 2006 | 2006 | 393 | 97 | 120 | 120 | 26 |
| Гарадоцкая | 1 | 2006 | 2006 | 328 | 63 | 174 | 172 | 60 |
| Докшыцкая | 1 | 2010 | 2010 | 270 | 34 | 121 | 35 | 42 |
| Дубровенская | 1 | 2008 | 2009 | 144 | 23 | 58 | 24 | 25 |
| Лепельская | 1 | 2010 | 2010 | 224 | 20 | 83 | 50 | 39 |
| Лёзненская | 1 | 2020 | 2020 | 165 | 16 | 74 | 91 | 21 |
| Мёрская | 0 | 0 | 0 | 442 | 79 | 220 | 114 | |
| Аршанская | 1 | 2021 | 2021 | 259 | 13 | 93 | 47 | 50 |
| Полацкая | 1 | 2010 | 2010 | 401 | 14 | 112 | 45 | 36 |
| Пастаўская | 0 | 0 | 0 | 456 | 88 | 221 | 269 | |
| Расонская | 1 | 2012 | 2012 | 125 | 15 | 63 | 53 | 46 |
| Сенненская | 1 | 2018 | 2018 | 326 | 30 | 138 | 154 | 53 |
| Талачынская | 1 | 2007 | 2007 | 256 | 33 | 118 | 78 | 34 |
| Ушацкая | 0 | 0 | 0 | 250 | 16 | 179 | 172 | |
| Чашніцкая | 1 | 2012 | 2012 | 208 | 10 | 71 | 57 | 31 |
| Шаркаўшчынская | 1 | 2006 | 2006 | 254 | 37 | 102 | 99 | 44 |
| Шумілінская | 1 | 2005 | 2005 | 253 | 37 | 146 | 67 | 70 |
| **Усяго па РЦБС** | **18** | | | **6198** | **851** | **2659** | **2125** | **737** |
| 2022 год | 18 | | | | 847 | 2529 | 2040 | 723 |

*Дадатак № 13*
*Табліца 13*

## БІБЛІЯТЭКІ Ў СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

| ЦБС | Выступленні | | Колькасць публікацый аб дзейнасці бібліятэк | | | | | Выданні бібліятэк | Выданні і публікацыі ў СМІ супрацоўнікаў, усяго (1-бібліятэка, код |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | на радыё | на тэлебачанні | Усяго | у т.л. у мясц. друку | у т.л. інш. выданнях | публікацыі супрацоўнікаў: з графы "усяго" | у т.л. праф. выданнях | | |
| Бешанковіцкая | 0 | 0 | 18 | 15 | 3 | 8 | 3 | 7 | 15 |
| Браслаўская | 0 | 0 | 27 | 24 | 3 | 15 | 2 | 16 | 31 |
| Верхнядзвінская | 0 | 0 | 26 | 26 | 0 | 5 | 0 | 13 | 18 |
| Віцебская | 0 | 0 | 8 | 8 | 0 | 0 | 0 | 6 | 6 |
| Глыбоцкая | 0 | 0 | 38 | 35 | 3 | 6 | 1 | 37 | 43 |
| Гарадоцкая | 0 | 0 | 21 | 19 | 2 | 0 | 0 | 20 | 20 |
| Докшыцкая | 0 | 0 | 27 | 25 | 2 | 6 | 0 | 9 | 15 |
| Дубровенская | 0 | 0 | 9 | 9 | 0 | 9 | 0 | 2 | 11 |
| Лепельская | 0 | 0 | 37 | 34 | 3 | 21 | 1 | 17 | 38 |
| Лёзненская | 0 | 0 | 79 | 75 | 4 | 28 | 0 | 17 | 45 |
| Мёрская | 0 | 0 | 46 | 45 | 1 | 0 | 0 | 5 | 5 |
| Аршанская | 4 | 0 | 41 | 40 | 1 | 7 | 1 | 5 | 12 |
| Полацкая | 0 | 1 | 50 | 49 | 1 | 11 | 1 | 24 | 35 |
| Пастаўская | 0 | 4 | 12 | 9 | 3 | 4 | 2 | 15 | 19 |
| Расонская | 0 | 0 | 3 | 2 | 1 | 0 | 0 | 6 | 6 |
| Сенненская | 0 | 0 | 37 | 35 | 2 | 0 | 0 | 6 | 6 |
| Талачынская | 0 | 0 | 14 | 14 | 0 | 5 | 0 | 9 | 14 |
| Ушацкая | 0 | 0 | 4 | 3 | 1 | 4 | 1 | 15 | 19 |
| Чашніцкая | 0 | 0 | 46 | 46 | 0 | 0 | 0 | 5 | 5 |
| Шаркаўшчынская | 0 | 0 | 31 | 31 | 0 | 0 | 0 | 8 | 8 |
| Шумілінская | 0 | 0 | 14 | 13 | 1 | 3 | 0 | 4 | 7 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **4** | **5** | **588** | **557** | **31** | **132** | **12** | **246** | **378** |
| г.Віцебск | 0 | 0 | 20 | 17 | 3 | 1 | 0 | 17 | 18 |
| г.Навапалацк | 1 | 1 | 45 | 43 | 2 | 2 | 0 | 39 | 41 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1** | **1** | **65** | **60** | **5** | **3** | **0** | **56** | **59** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **5** | **6** | **653** | **617** | **36** | **135** | **12** | **302** | **437** |
| Абласная б-ка | 0 | 12 | 129 | 100 | 29 | 16 | 5 | 17 | 33 |
| **УСЯГО** | **5** | **18** | **782** | **717** | **65** | **151** | **17** | **319** | **470** |



Найбуйнейшыя сацыякультурныя мерапрыемствы для дзяцей і юнацтва былі прымеркаваны да святочных падзей і знакавых дат календара: Міжнароднага дня роднай мовы, Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі, Дня бібліятэк Беларусі, Тыдня бацькоўскай любові. Да першай з іх у лютым супрацоўнікі аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці правялі бібліятэчныя ўрокі «Каб мова гучала!» для выхаванцаў старэйшых груп дзіцячых садкоў Віцебска. Падчас веснавых канікул прайшло традыцыйнае свята Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі пад назвай «З ордэнам Усмешкі на грудзях», а Дзень бібліятэк Беларусі супрацоўнікі дзіцячага і юнацкага аддзелаў правялі ў рэжыме нон-стоп на гульнявой пляцоўцы «І зноў Хатабыч». Наступная дзіцячая нон-стоп праграма пад назвай «Сем цудаў бібліятэкі для ўсёй сям'і» прайшла ў кастрычніку і была прымеркавана да Тыдня бацькоўскай любові.

Пры ўсёй разнастайнасці напрамкаў работы з дзіцячым чытачом патрыятычнае выхаванне заставалася прыярытэтным. У справаздачным годзе юнацкі аддзел распачаў работу па праекце «Беларусь – краіна маёй будучыні», накіраваным на знаёмства юнакоў з гісторыяй, прыродай, традыцыямі, знакамітымі постацямі краіны. У яго рамках былі праведзены бібліякалаж «Беларусь – краіна запаведная», гадзіна інфармацыі да Дня Перамогі «Не парушайце мірны рух зямны», гадзіна памяці «Трагедыя спаленых вёсак», гадзіна ведаў «Сімвалы беларускай дзяржаўнасці», бібліятур «Беларусь непаўторная», бібліяэкскурс «ТОП-20 славутасцей Беларусі», сузор'е цікавых ведаў «Беларусы ў космасе», літаратурны бенефіс «Вялікія і Славутыя: да 70-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Бутрамеева».

Сумеснымі намаганнямі аддзелаў абслугоўвання ў 2023 годзе былі працягнуты сацыякультурныя праекты для юных чытачоў: «Я в этом городе живу, я этот город знаю», «Паклон беларускаму Слову!», «Пра Беларусь па-англійску», «Суразмоўца», «Адкрыты свет», «Гісторыя кнігі сваімі рукамі», «Бібліятэчныя кінаўрокі для школьнікаў», «Бяспечнае дзяцінства. Азбука правільных рашэнняў», «Школа фінансавай пісьменнасці для дзяцей», «Моўнае дрэва», «Падарожжа па землях Германіі».

Паспяховым і запатрабаваным напрамкам работы застаецца арганізацыя вольнага часу віцебскіх школьнікаў у канікулярныя перыяды. Так, больш за 450 навучэнцаў пазнавальна правялі восеньскія вакацыі ў бібліятэцы. Кожны візіт пачынаўся з агляднай экскурсіі, пасля якой аддзелы бібліятэкі прапанавалі свае аўтарскія праекты і асобныя мерапрыемствы для розных узроставых катэгорый і на любы густ.

У 2023 годзе працягвалася работа з людзьмі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва. Цэнтральным падраздзяленнем па ажыццяўленні інклюзіўнай дзейнасці ў бібліятэцы заставаўся аддзел перыядычных выданняў. Яго супрацоўнікамі пры рэалізацыі бібліятэчнага праекта «Разам!» быў праведзены шэраг сацыякультурных мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыю вольнага часу людзей з абмежаванымі

фізічнымі магчымасцямі. Узгадаем буйнейшыя з іх: майстар-клас па ткацтве паясоў на бёрдышках «Самабытныя вобразы сучаснасці», святочны канцэрт «Спадарыня Вясна», конкурсна-забаўляльная праграма «Міс Вясна», конкурсная праграма «Містэр Восень», выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці людзей з інваліднасцю па зроку «Прамяні сэрца».

У мінулым годзе ў рамках дабрачыннага праекта «Дакраніся», які рэалізуецца як частка бібліятэчнай мэтавай комплекснай праграмы «Міласэрнасць» і быў распачаты два гады таму, супрацоўнікі аддзела перыядычных выданняў перадалі ў дар ДУА «Дзіцячы сад № 96 г. Віцебска», дзе ёсць спецыяльныя групы для дзяцей з парушэннямі зроку, самаробныя тактыльныя кнігі. Яны цалкам адаптаваныя для дзяцей з парушэннямі зроку, ілюстраваныя аб'ёмнымі малюнкамі і тактыльнымі ўстаўкамі, а таксама подпісамі, выкананымі шрыфтам Брайля.

Традыцыйна напрыканцы восені адбылося галоўнае навуковае мерапрыемства года – навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Дзявятая па ліку, яна была прысвечана 85-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці і прайшла ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 23 лістапада. Больш за 70 гісторыкаў, археолагаў, архівістаў, настаўнікаў, супрацоўнікаў музеяў і бібліятэк, краязнаўцаў з розных гарадоў Беларусі і Расіі падзяліліся вынікамі сваіх даследаванняў у вочным фармаце. Акрамя бібліятэкі арганізатарамі канферэнцыі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Па выніках канферэнцыі будзе падрыхтаваны аднайменны зборнік матэрыялаў.

У 2023 годзе Віцебская абласная бібліятэка ўпершыню ўвайшла ў склад арганізатараў адкрытых абласных адукацыйных Срэценскіх чытанняў, якія пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі праводзіць Віцебская епархія Беларускай праваслаўнай царквы. Чарговыя, 21-я чытанні, у мінулым годзе былі прысвечаны тэме патрыятызму і грамадзянскасці як духоўнаму выбару чалавека. У канферэнц-зале бібліятэкі 23 лютага для ўдзелу ў працы секцыі «Бібліятэка – цэнтр духоўна-маральнай асветы і выхавання» сабраліся прадстаўнікі ўстаноў бібліятэчнай сферы рэгіёна, у полі зроку якіх былі праблемы духоўна-маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання дзяцей, лепшыя практыкі гэтага працэсу, сямейныя каштоўнасці і шэраг іншых пытанняў.

Двойчы за год адбыліся сходы кіраўнікоў цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Віцебшчыны ў фармаце Савета дырэктараў. Першы з іх, выніковы, прайшоў 9 лютага па тэме «Бібліятэкі і бібліятэчная практыка ў Год гістарычнай памяці», другі – «Актуальныя праблемы ў дзейнасці публічных бібліятэк» адбыўся напрыканцы года і пераважна быў прысвечаны пытанням падрыхтоўкі гадавых справаздач.

Галоўнай тэмай павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк вобласці ў 2023 годзе стала прасоўванне бібліятэкі, яе паслуг і рэсурсаў. 21 красавіка ў Віцебскай



*Дадатак № 12*
*Табліца 12*

## БІБЛІЯТЭЧНЫЯ КАДРЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

| ЦБС | Штаты | Спісачная кольк. | | па катэгорыях з бібліятэчнай адукацыяй | | | | З бібл. адукац. | % спец. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | з іх бібл. работн. | кіраўнікі | | спецыялісты | | | |
| | | | | выш. | ср /сп. | выш. | ср /сп. | | |
| Бешанковіцкая | 43,50 | 42 | 32 | 4 | 2 | 6 | 6 | 18 | 56,3 |
| Браслаўская | 44,00 | 40 | 30 | 2 | 0 | 6 | 4 | 12 | 40,0 |
| Верхнядзвінская | 43,25 | 43 | 33 | 2 | 3 | 4 | 6 | 15 | 45,5 |
| Віцебская | 47,50 | 37 | 31 | 3 | 0 | 6 | 9 | 18 | 58,1 |
| Глыбоцкая | 81,75 | 79 | 48 | 4 | 7 | 8 | 10 | 29 | 60,4 |
| Гарадоцкая | 57,50 | 53 | 36 | 5 | 2 | 3 | 14 | 24 | 66,7 |
| Докшыцкая | 65,00 | 62 | 40 | 4 | 5 | 5 | 10 | 24 | 60,0 |
| Дубровенская | 60,53 | 61 | 37 | 4 | 4 | 2 | 9 | 19 | 51,4 |
| Лепельская | 52,00 | 46 | 36 | 5 | 1 | 11 | 7 | 24 | 66,7 |
| Лёзненская | 47,50 | 43 | 31 | 1 | 2 | 4 | 11 | 18 | 58,1 |
| Мёрская | 47,75 | 42 | 35 | 5 | 0 | 7 | 7 | 19 | 54,3 |
| Аршанская | 153,25 | 147 | 95 | 13 | 3 | 18 | 32 | 66 | 69,5 |
| Полацкая | 145,25 | 145 | 103 | 10 | 5 | 15 | 19 | 49 | 47,6 |
| Пастаўская | 51,36 | 43 | 31 | 6 | 0 | 9 | 2 | 17 | 54,8 |
| Расонская | 29,25 | 26 | 19 | 2 | 2 | 3 | 1 | 8 | 42,1 |
| Сенненская | 44,50 | 36 | 31 | 2 | 0 | 4 | 9 | 15 | 48,4 |
| Талачынская | 47,25 | 42 | 30 | 4 | 3 | 5 | 7 | 19 | 63,3 |
| Ушацкая | 28,85 | 34 | 27 | 2 | 3 | 1 | 5 | 11 | 40,7 |
| Чашніцкая | 49,00 | 55 | 43 | 4 | 3 | 9 | 11 | 27 | 62,8 |
| Шаркаўшчынская | 38,88 | 38 | 29 | 3 | 4 | 2 | 11 | 20 | 69,0 |
| Шумілінская | 42,50 | 39 | 32 | 3 | 3 | 1 | 8 | 15 | 46,9 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***1220,37*** | ***1153*** | ***829*** | ***88*** | ***52*** | ***129*** | ***198*** | ***467*** | ***56,3*** |
| г.Віцебск | 148,50 | 129 | 102 | 19 | 3 | 33 | 15 | 70 | 68,6 |
| г.Навапалацк | 91,50 | 84 | 56 | 16 | | 10 | 11 | 37 | 66,1 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***240,00*** | ***213*** | ***158*** | ***35*** | ***3*** | ***43*** | ***26*** | ***107*** | ***67,7*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **1460,37** | **1366** | **987** | **123** | **55** | **172** | **224** | **574** | **58,2** |
| Абласная б-ка | 140,00 | 108 | 83 | 19 | 0 | 40 | 1 | 60 | 72,3 |
| **УСЯГО** | **1600,37** | **1474** | **1070** | **142** | **55** | **212** | **225** | **634** | **59,3** |

*Працяг табліцы 11*

| ЦБС | Выкарыст. на кампл. бібл. фондаў, руб | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | набыццё дакументаў | перыядычных выданняў | эл. рэсурсаў і правоў доступу *Эталон | ***% кампл. ад пазабюдж. сродкаў*** |
| Бешанковіцкая | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Браслаўская | 922,05 | 922,05 | 0,00 | 0,00 | 6,2 |
| Верхнядзвінская | 1313,66 | 632,90 | 680,76 | 0,00 | 14,0 |
| Віцебская | 2850,96 | 1601,12 | 1249,84 | 0,00 | 33,5 |
| Глыбоцкая | 1087,87 | 881,05 | 206,82 | 0,00 | 12,8 |
| Гарадоцкая | 512,18 | 0,00 | 512,18 | 0,00 | 5,5 |
| Докшыцкая | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Дубровенская | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Лепельская | 1102,82 | 1102,82 | 0,00 | 0,00 | 7,9 |
| Лёзненская | 1063,06 | 829,06 | 0,00 | 234,00 | 19,9 |
| Мёрская | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Аршанская | 500,00 | 500,00 | 0,00 | 0,00 | 1,4 |
| Полацкая | 518,94 | 518,94 | 0,00 | 0,00 | 2,0 |
| Пастаўская | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Расонская | 198,91 | 198,91 | 0,00 | 0,00 | 2,1 |
| Сенненская | 1202,51 | 980,24 | 222,27 | 0,00 | 12,4 |
| Талачынская | 34,67 | 34,67 | 0,00 | 0,00 | 0,3 |
| Ушацкая | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Чашніцкая | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| Шаркаўшчынская | 66,67 | 66,67 | 0,00 | 0,00 | 1,2 |
| Шумілінская | 66,89 | 66,89 | 0,00 | 0,00 | 0,9 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***11441,19*** | ***8335,32*** | ***2871,87*** | ***234,00*** | ***4,7*** |
| г.Віцебск | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| г.Наваполацк | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,00 | 0,0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***0,00*** | ***0,00*** | ***0,00*** | ***0,00*** | ***0,0*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | ***11441,19*** | ***8335,32*** | ***2871,87*** | ***234,00*** | ***4,2*** |
| Абласная б-ка | 832,71 | 832,71 | 0,00 | 0,00 | 3,1 |
| **УСЯГО** | **12273,90** | **9168,03** | **2871,87** | **234,00** | **4,1** |



абласной бібліятэцы прайшоў навучальны семінар-практыкум «Сучасная бібліятэка: стратэгія работы ў сацыяльных медыя», а 23 чэрвеня – семінар-практыкум «Узаемадзеянне бібліятэк са сродкамі масавай інфармацыі ў рамках рэалізацыі сацыяльна значных праектаў». Інфармацыйную і тэхнічную падтрымку абодвух сустрэч забяспечыў Медыяцэнтр Віцебскай вобласці.

Напрыканцы года ў бібліятэцы прайшоў круглы стол «Актуальныя пытанні фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве» з удзелам супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі пытанні фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў, якія могуць дапамагчы ў вывучэнні краязнаўства.

Акрамя рэспубліканскіх, мінулы год вызначыўся правядзеннем абласнога прафесійнага спаборніцтва – конкурсу дзіцячых бібліятэчных гульнявых праграм «Задума». Са студзеня па красавік у гарадскіх і сельскіх бібліятэках вобласці ў яго рамках адбыліся 38 гульнявых праграм, гледачамі якіх сталі больш за 600 дзяцей ва ўзросце ад 4 да 16 гадоў. Вынікі конкурсу былі падведзены 25 мая: у святочным мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм рэгіёна, журы абласнога спаборніцтва і гледачы – віцебскія школьнікі. За круглым сталом «Тэатралізавана-гульнявыя формы публічных бібліятэк» журы і ўдзельнікі абласнога конкурсу падзяліліся сваімі ўражаннямі ад удзелу ў «Задуме», абмеркавалі праблемы, з якімі сутыкнуліся падчас работы.

Міжнароднае прафесійнае супрацоўніцтва дазваляе бібліятэцы ўлічваць у сваёй рабоце тэндэнцыі сусветнага развіцця, ацэньваць сваю дзейнасць, дасягненні і праблемы ў больш шырокім кантэксце, арыентавацца на міжнародныя стандарты бібліятэчнай дзейнасці. Найбольш актыўнае супрацоўніцтва звязвае Віцебскую абласную бібліятэку з бібліятэкамі Расійскай Федэрацыі і, у першую чаргу, з бліжэйшымі суседзямі – калегамі з прыгранічных Смаленскай і Пскоўскай абласцей.

У рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве 19 мая з прафесійным візітам бібліятэку наведалі кіраўнікі і спецыялісты Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкі імя А.Т. Твардоўскага. Падчас сустрэчы адбыўся навукова-практычны семінар «Смаленск–Віцебск: кніжны свет без межаў». У яго праграму ўвайшлі прэзентацыя мультымедыйнага праекта «Святыя заступнікі Віцебшчыны» і абмен калекцыямі кніг патрыятычнай, гістарычнай, краязнаўчай накіраванасці, духоўнай літаратуры, кніг для дзіцячага чытання. Атрыманая ад смаленскіх калег падборка кніг і выяўленчых дакументаў у колькасці 146 экз. на суму 2 130 беларускіх рублёў была зарэгістравана Дэпартаментам па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У мінулым годзе было працягнута супрацоўніцтва з ДБУК «Пскоўская абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка імя В.Я. Курбатава». Асноўныя сумесныя мерапрыемствы з ёй былі

рэалізаваныя ў інтэрнэт-прасторы: віртуальны праект «Чытаем разам: Мой любімы верш», сеткавы анлайн-праект «Лепшы казачнік свету. Шарль Перо: віртуальнае падарожжа па казках», сеткавы лінгвалітаратурны квэст па творчасці Жуля Габрыэля Верна.

У межах падпісанага ў 2020 годзе Дагавора аб творчым супрацоўніцтве з Курскай абласной бібліятэкай для дзяцей і юнацтва (філіял АБУК «Абласная бібліятэка імя М.М. Асеева», Расійская Федэрацыя) 6 снежня справаздачнага года адбылася анлайн-дыскусія для бібліятэчных спецыялістаў «Дзеці і кніга: насустрач адзін аднаму. Што замінае і што можа дапамагчы ім сустрэцца?».

Пра жыццё і творчасць татарскага кампазітара Фарыда Яруліна расказалі сваім гасцям у фармаце тэлемаста «Фарыд Ярулін – кампазітар і воін» Віцебская абласная бібліятэка і Рэспубліканская дзіцячая бібліятэка імя Роберта Міннуліна (г. Казань, Рэспубліка Татарстан). Малавядомымі фактамі з жыцця заснавальніка татарскага нацыянальнага балета, аўтара камерна-інструментальных твораў, апрацовак татарскіх народных песень Фарыда Яруліна падзяліліся татарскія калегі, з боку Віцебскай абласной бібліятэкі было падрыхтавана паведамленне пра баі за вызваленне Дубровенскага раёна, дзе ён загінуў.

Мінулы год быў адзначаны пашырэннем кола міжнародных партнёраў бібліятэкі. На працягу года былі падпісаны Пагадненне аб супрацоўніцтве з федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай установай «Прэзідэнцкая бібліятэка імя Б.М. Ельцына» (Расійская Федэрацыя), мемарандумы з Шыракскай абласной бібліятэкай (Рэспубліка Арменія), МКУК ЦБС Канавінскага раёна г. Ніжні Ноўгарад (Расійская Федэрацыя).

Бібліятэка не замыкаецца на міжнародным бібліятэчным супрацоўніцтве і актыўна развівае сувязі з іншымі культурна-асветніцкімі ўстановамі замежжа. 12 ліпеня ў рамках пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае» (Расійская Федэрацыя) і Віцебскай абласной бібліятэкай адбылося адкрыццё выставы работ фотакарэспандэнта Агенцтва «Фото ИТАР-ТАСС» Юрыя Бялінскага «Запавет унуку», прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння Сямёна Сцяпанавіча Гейчанкі – легендарнага захавальніка, першага пасляваеннага дырэктара музея-запаведніка А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае» ў Пскоўскай вобласці.

Напрыканцы ліпеня ў рамках правядзення Дзён Пскоўскай вобласці ў горадзе Віцебску ў бібліятэцы адкрылася наступная фотавыстава Юрыя Бялінскага «Валянцін Курбатаў. Пісьменнік. Пскоўскі грамадзянін», а 5 снежня ўвазе наведвальнікаў бібліятэкі былі прадстаўлены 9 банерных палотнаў з расповедам пра гісторыю Пушкінскага запаведніка, якія быў заснаваны ў 1899 годзе.

У справаздачным годзе капітальны рамонт у бібліятэцы не адбываўся, затраты на бягучы рамонт склалі 19 230 руб. бюджэтных асігнаванняў, якія былі зрасходаваны на рамонт унутранай эвакуацыйнай лесвіцы, усталяванне асвятлення і пажарнай сігналізацыі. На набыццё



*Дадатак № 11*
*Табліца 11*

**ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ**

| ЦБС | 2023 сетка | Колькасць відаў платных паслуг 2023 | Выканана ў 2022 г. (руб.) | План 2023 (руб.) | Выканана ў 2023 г. (руб.) | % выканання |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Бешанковіцкая | 11 | 90 | 15361,50 | 16595,00 | 16601,00 | 100,0 |
| Браслаўская | 13 | 56 | 13745,55 | 14845,00 | 14850,88 | 100,0 |
| Верхнядзвінская | 17 | 42 | 8700,37 | 9369,00 | 9411,97 | 100,5 |
| Віцебская | 21 | 24 | 8536,69 | 8700,00 | 8507,20 | 97,8 |
| Глыбоцкая | 25 | 20 | 8422,44 | 10000,00 | 8530,98 | 85,3 |
| Гарадоцкая | 14 | 43 | 8580,04 | 9200,00 | 9272,97 | 100,8 |
| Докшыцкая | 19 | 50 | 10528,14 | 11370,00 | 11330,33 | 99,7 |
| Дубровенская | 17 | 40 | 5581,52 | 6111,00 | 5277,03 | 86,4 |
| Лепельская | 16 | 47 | 12987,45 | 14027,00 | 13988,00 | 99,7 |
| Лёзненская | 15 | 31 | 4832,92 | 5220,00 | 5338,81 | 102,3 |
| Мёрская | 18 | 39 | 6507,00 | 7028,00 | 7090,00 | 100,9 |
| Аршанская | 34 | 43 | 29777,98 | 32160,00 | 34584,39 | 107,5 |
| Полацкая | 35 | 37 | 19698,46 | 25610,00 | 25639,10 | 100,1 |
| Пастаўская | 18 | 31 | 7991,58 | 8631,00 | 8726,45 | 101,1 |
| Расонская | 9 | 28 | 8642,00 | 9330,00 | 9348,20 | 100,2 |
| Сенненская | 15 | 29 | 9729,29 | 9730,00 | 9733,66 | 100,0 |
| Талачынская | 15 | 46 | 12225,90 | 12000,00 | 10584,23 | 88,2 |
| Ушацкая | 9 | 34 | 11641,90 | 12000,00 | 12002,96 | 100,0 |
| Чашніцкая | 15 | 31 | 10426,59 | 11261,00 | 9955,33 | 88,4 |
| Шаркаўшчынская | 13 | 32 | 5833,35 | 6375,00 | 5546,76 | 87,0 |
| Шумілінская | 14 | 37 | 7318,15 | 7428,00 | 7439,30 | 100,2 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***363*** | ***830*** | **227068,82** | ***246990,00*** | ***243759,55*** | ***98,7*** |
| г.Віцебск | 16 | 58 | 2608,60 | 3005,00 | 2982,51 | 99,3 |
| г.Наваполацк | 7 | 77 | 25772,19 | 21230,14 | 23102,95 | 108,8 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***23*** | ***135*** | **28380,79** | ***24235,14*** | ***26085,46*** | ***107,6*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **386** | ***965*** | **255449,61** | ***271225,14*** | ***269845,01*** | ***99,5*** |
| Абласная б-ка | 1 | 44 | 25485,76 | 27233,00 | 27024,27 | 99,2 |
| **УСЯГО** | **387** | *42<br>ср. ЦБС | **280935,37** | **298458,14** | **296869,28** | **99,5** |

*Працяг табліцы 10*

| ЦБС | бібліятэкі маюць | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | інтэрнэт | з іх у 2023 | % | e-mail | з іх у 2023 | % | тэл. | з іх у 2023 | % | сайт |
| Бешанковіцкая | 11 | 0 | 100,0 | 11 | 0 | 100,0 | 11 | 0 | 100,0 | 1 |
| Браслаўская | 11 | 0 | 84,6 | 11 | 0 | 84,6 | 13 | 0 | 100,0 | 1 |
| Верхнядзвінская | 11 | 1 | 64,7 | 11 | 1 | 64,7 | 13 | 0 | 76,5 | 1 |
| Віцебская | 20 | 0 | 95,2 | 20 | 0 | 95,2 | 21 | 0 | 100,0 | 1 |
| Глыбоцкая | 19 | 1 | 76,0 | 19 | 1 | 76,0 | 23 | 0 | 92,0 | 1 |
| Гарадоцкая | 10 | 0 | 71,4 | 10 | 0 | 71,4 | 12 | 0 | 85,7 | 1 |
| Докшыцкая | 10 | 3 | 52,6 | 10 | 3 | 52,6 | 18 | 1 | 94,7 | 2 |
| Дубровенская | 15 | 0 | 88,2 | 15 | 0 | 88,2 | 17 | 0 | 100,0 | 1 |
| Лепельская | 16 | 0 | 100,0 | 16 | 0 | 100,0 | 16 | 0 | 100,0 | 1 |
| Лёзненская | 15 | 0 | 100,0 | 15 | 0 | 100,0 | 15 | 0 | 100,0 | 1 |
| Мёрская | 12 | 0 | 66,7 | 12 | 0 | 66,7 | 18 | 0 | 100,0 | 1 |
| Аршанская | 22 | 2 | 64,7 | 22 | 2 | 64,7 | 34 | 2 | 100,0 | 1 |
| Полацкая | 35 | 1 | 100,0 | 35 | 1 | 100,0 | 35 | 0 | 100,0 | 1 |
| Пастаўская | 5 | 0 | 27,8 | 5 | 0 | 27,8 | 14 | 0 | 77,8 | 1 |
| Расонская | 8 | 0 | 88,9 | 8 | 0 | 88,9 | 9 | 0 | 100,0 | 1 |
| Сенненская | 14 | 1 | 93,3 | 14 | 1 | 93,3 | 14 | 1 | 93,3 | 1 |
| Талачынская | 15 | 0 | 100,0 | 15 | 0 | 100,0 | 15 | 0 | 100,0 | 1 |
| Ушацкая | 9 | 0 | 100,0 | 9 | 0 | 100,0 | 9 | 0 | 100,0 | 1 |
| Чашніцкая | 15 | 0 | 100,0 | 15 | 0 | 100,0 | 15 | 0 | 100,0 | 1 |
| Шаркаўшчынская | 9 | 0 | 69,2 | 9 | 0 | 69,2 | 13 | 0 | 100,0 | 1 |
| Шумілінская | 9 | 1 | 64,3 | 9 | 1 | 64,3 | 14 | 0 | 100,0 | 1 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **291** | **10** | **80,2** | **291** | **10** | **80,2** | **349** | **4** | **96,1** | **22** |
| г.Віцебск | 16 | 0 | 100,0 | 16 | 0 | 100,0 | 16 | 0 | 100,0 | 1 |
| г.Наваполацк | 7 | 0 | 100,0 | 7 | 0 | 100,0 | 7 | 0 | 100,0 | 1 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **23** | **0** | **100,0** | **23** | **0** | **100,0** | **23** | **0** | **100,0** | **2** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **314** | **10** | **81,3** | **314** | **10** | **81,3** | **372** | **4** | **96,4** | **24** |
| Абласная б-ка | 1 | 0 | **100,0** | 1 | 0 | **100,0** | 1 | 0 | **100,0** | 1 |
| **УСЯГО** | **315** | **10** | **81,4** | **315** | **10** | **81,4** | **373** | **4** | **96,4** | **25** |
| 2022 год | 309 | | 78,8 | 309 | | 78.8 | 373 | | 95,2 | 25 |



асноўных сродкаў (2 ПК, 1 ноўтбук, лесвічны гусенічны пад'ёмнік для інвалідаў «БАРС») па бюджэтным каштарысе было выдаткавана 13 199 руб. Для забеспячэння навігацыі інвалідаў па зроку па бібліятэцы набыты і ўсталяваны моўны гукавы інфарматар і тактыльная мнемасхема.

Па стане на 01.01.2024 парк ПК бібліятэкі склаў 120 адзінак, у лакальную сетку аб'яднаны 117 камп'ютараў. Функцыяніравалі 24 прынтары, 16 шматфункцыянальных прылад, 6 сканераў, 45 блокаў бесперапыннага сілкавання.

У мінулым годзе па-ранейшаму перад бібліятэкай стаяла задача павелічэння долі пазабюджэтных сродкаў у яе фінансаванні. Выкананне плана платных паслуг у бягучых цэнах склала 104% (26 648,74 руб.).

У мінулым годзе высокімі ўзнагародамі былі адзначаны кіраўнікі бібліятэкі. За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё рэгіёну і ў сувязі з 85-годдзем з дня заснавання Віцебскай вобласці дырэктару ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» Таццяне Мікалаеўне Адамян была аб'яўлена Падзяка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагародамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі адзначаны намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці В.М. Камендантава і загадчык аддзела фарміравання бібліятэчнага фонду В.А. Раманчанка.

# АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА 2023 ГОД

## Бібліятэчная сетка

Колькасць бібліятэк Віцебскай вобласці, якія знаходзяцца ў распараджэнні Міністэрства культуры, складае 387 адзінак, з іх:

- абласная бібліятэка;
- 23 цэнтральныя (21 раённая і 2 гарадскія);
- 32 гарадскія;
- 18 гарпасялковых;
- 25 дзіцячых,
- 288 сельскіх бібліятэк.

За 2023 год бібліятэчная сетка скарацілася на **5** адзінак (-1,3% да 2023). Сваю дзейнасць, акрамя сельскіх, спыніла Бешанковіцкая гарпасялковая бібліятэка. Дзіцячая раённая бібліятэка Бешанковіцкай ЦБС рэарганізавана ў сектар па абслугоўванні дзіцячага чытача цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Працягвалася рэарганізацыя сельскіх бібліятэк ва установы культуры **змяшанага тыпу** (бібліятэка-клуб, клуб-бібліятэка). Глінская сельская бібліятэка Докшыцкай ЦБС, Бабініцкая сельская бібліятэка Аршанскай ЦБС, Заборская сельская бібліятэка Расонскай ЦБС, Івесьская сельская бібліятэка Глыбоцкай ЦБС рэарганізаваны ў бібліятэкі-клубы. Велеўшчанская сельская бібліятэка-клуб Лепельскай ЦБС пераўтворана ў сельскую бібліятэку. Сетка бібліятэк Глыбоцкай ЦБС папоўнілася Гатаўшчынскай сельскай бібліятэкай-клубам, якая была рэарганізавана з Гатаўшчынскага сельскага клуба-бібліятэкі.

Колькасць бібліятэк-клубаў у параўнанні з 2022 годам павялічылася і складае 45 (+3) адзінак. Зменшылася колькасць такіх устаноў змяшанага тыпу, як бібліятэкі-музеі: рэарганізаваны ў бібліятэкі Азярэцкая сельская бібліятэка-музей этнаграфіі Глыбоцкай ЦБС, Чарэйшчынская сельская бібліятэка-музей вёскі, Баброўская сельская бібліятэка-музей Я. Мароза, Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага Лепельскай ЦБС. Агульная колькасць бібліятэк-музеяў па выніках года складае 3 (-4) адзінкі.

Бібліятэчным абслугоўваннем жыхароў 7 раёнаў Віцебшчыны займаюцца **17 інтэграваных бібліятэк**, 16 з якіх знаходзяцца ў ведамаснай падпарадкаванасці Міністэрства культуры, 1 – Міністэрства адукацыі. Колькасць інтэграваных устаноў у параўнанні з 2022 годам зменшылася на адну, інтэграваная Заборская сельская бібліятэка-філіял № 10 Расонскай ЦБС рэарганізавана ў бібліятэку-клуб Забор’е.

Бібліятэчныя паслугі жыхарам **сельскай мясцовасці** аказваюць 288 бібліятэк, што складае 74,4% ад іх агульнай колькасці.

Колькасць бібліятэк, што працуюць няпоўны рабочы дзень, за год паменшылася на 2 адзінкі і складае 57 бібліятэк (15%): (на 0,5 ст. –



*Працяг табліцы 10*

| ЦБС | Колькасць камп’ютараў | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | на пач. 2023 | паступіла | выбыла | на канец 2023 | % абн. камп. парка | ад 5 год | 6-10 год | звыш за 10 год |
| Бешанковіцкая | 35 | 4 | 0 | 39 | 10,3 | 8 | 20 | 11 |
| Браслаўская | 35 | 0 | 0 | 35 | 0,0 | 1 | 8 | 26 |
| Верхнядзвінская | 37 | 6 | 6 | 37 | 16,2 | 3 | 7 | 27 |
| Віцебская | 35 | 1 | 0 | 36 | 2,8 | 4 | 8 | 24 |
| Глыбоцкая | 52 | 1 | 0 | 53 | 1,9 | 2 | 5 | 46 |
| Гарадоцкая | 38 | 6 | 0 | 44 | 13,6 | 12 | 7 | 25 |
| Докшыцкая | 25 | 2 | 0 | 27 | 7,4 | 3 | 5 | 19 |
| Дубровенская | 34 | 0 | 0 | 34 | 0,0 | 2 | 2 | 30 |
| Лепельская | 45 | 2 | 0 | 47 | 4,3 | 16 | 11 | 20 |
| Лёзненская | 40 | 0 | 0 | 40 | 0,0 | 5 | 19 | 16 |
| Мёрская | 36 | 3 | 3 | 36 | 8,3 | 9 | 12 | 15 |
| Аршанская | 102 | 10 | 0 | 112 | 8,9 | 63 | 42 | 7 |
| Полацкая | 109 | 2 | 2 | 109 | 1,8 | 7 | 21 | 81 |
| Пастаўская | 38 | 0 | 3 | 35 | 0,0 | 0 | 10 | 25 |
| Расонская | 18 | 0 | 0 | 18 | 0,0 | 0 | 2 | 16 |
| Сенненская | 31 | 0 | 0 | 31 | 0,0 | 4 | 8 | 19 |
| Талачынская | 27 | 0 | 0 | 27 | 0,0 | 4 | 9 | 14 |
| Ушацкая | 24 | 2 | 0 | 26 | 7,7 | 5 | 3 | 18 |
| Чашніцкая | 52 | 0 | 1 | 51 | 0,0 | 0 | 11 | 40 |
| Шаркаўшчынская | 25 | 0 | 0 | 25 | 0,0 | 5 | 4 | 16 |
| Шумілінская | 24 | 4 | 2 | 26 | 15,4 | 3 | 15 | 8 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **862** | **43** | **17** | **888** | **4,8** | **156** | **229** | **503** |
| г.Віцебск | 122 | 5 | 0 | 127 | 3,9 | 3 | 19 | 105 |
| г.Наваполацк | 74 | 5 | 0 | 79 | 6,3 | 6 | 21 | 52 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **196** | **10** | **0** | **206** | **4,9** | **9** | **40** | **157** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **1058** | **53** | **17** | **1094** | **4,8** | **165** | **269** | **660** |
| Абласная б-ка | 125 | 17 | 22 | 120 | **14,2** | 14 | 24 | 82 |
| **УСЯГО** | **1183** | **70** | **39** | **1214** | **5,8** | **179** | **293** | **742** |

*Дадатак № 10*
*Табліца 10*

**КАМП'ЮТАРЫЗАЦЫЯ І АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

| ЦБС | Сетка 2023 | Камп'ютарыз. б-к 01.01.2024 | | % камп'ютарызацыі |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | з іх у 2023 | |
| Бешанковіцкая | 11 | 11 | 0 | 100,0 |
| Браслаўская | 13 | 13 | 0 | 100,0 |
| Верхнядзвінская | 17 | 17 | 0 | 100,0 |
| Віцебская | 21 | 21 | 0 | 100,0 |
| Глыбоцкая | 25 | 25 | 0 | 100,0 |
| Гарадоцкая | 14 | 14 | 0 | 100,0 |
| Докшыцкая | 19 | 14 | 1 | 73,7 |
| Дубровенская | 17 | 17 | 0 | 100,0 |
| Лепельская | 16 | 16 | 0 | 100,0 |
| Лёзненская | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Мёрская | 18 | 16 | 2 | 88,9 |
| Аршанская | 34 | 34 | 0 | 100,0 |
| Полацкая | 35 | 35 | 0 | 100,0 |
| Пастаўская | 18 | 18 | 0 | 100,0 |
| Расонская | 9 | 9 | 0 | 100,0 |
| Сенненская | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Талачынская | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Ушацкая | 9 | 9 | 0 | 100,0 |
| Чашніцкая | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Шаркаўшчынская | 13 | 13 | 0 | 100,0 |
| Шумілінская | 14 | 14 | 0 | 100,0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***363*** | **356** | **3** | **98,1** |
| г.Віцебск | 16 | 16 | 0 | 100,0 |
| г.Наваполацк | 7 | 7 | 0 | 100,0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***23*** | **23** | **0** | **100,0** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **386** | **379** | **3** | **98,2** |
| Абласная б-ка | 1 | 1 | 0 | 100,0 |
| **УСЯГО** | **387** | **380** | **3** | **98,2** |
| 2022 год | 392 | 382 | 4 | 97,4 |



18 бібліятэк (4,6%); на 0,75 ст. – 39 бібліятэк (10%). Усе яны знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Найбольшая колькасць бібліятэк са скарочаным рабочым днём функцыянуюць у Лёзненскім (7), Дубровенскім (5), Талачынскім раёнах (5).

Свабодны доступ да эталоннай прававой інфармацыі забяспечваюць 107 публічных цэнтраў прававой інфармацыі, якія дзейнічаюць на базе абласной, 23 цэнтральных, 14 гарадскіх, 11 гарпасялковых, 53 сельскіх і 4 дзіцячых бібліятэк.

Штатная колькасць работнікаў ЦБС Віцебскай вобласці амаль не змянілася ў параўнанні з мінулым годам і на 01.01.2024 г. складае **1 600,37** адзінак.

## Асноўныя паказчыкі дзейнасці

У 2023 годзе ахоп насельніцтва Віцебскай вобласці бібліятэчным абслугоўваннем склаў 37,4% (у мінулым годзе 37,6%). Усяго ў 2023 годзе зарэгістравана 420 339 (100,2% да плана) **карыстальнікаў**, што на 1,1% менш, чым у 2022 годзе (425 162). З агульнай колькасці карыстальнікаў 11 536 (2,7%) – аддаленыя. Сярэдняя колькасць карыстальнікаў на 1 бібліятэку склала 1 056,3 чалавек.

За мінулы год паказчык **наведанняў** бібліятэк вобласці склаў 5 296 728 (103,2% да плана), што на 7,7% меньш, чым у 2022 годзе (5 736 795). Прагнозны паказчык Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг. «Колькасць наведванняў публічных бібліятэк на 1000 чалавек насельніцтва» пры заданні 4 553 склаў 4 851 адзінак. З агульнай колькасці зафіксаваных наведванняў 41,2% (2 182 163) складаюць віртуальныя.

У параўнанні з мінулым годам колькасць **дакументавыдач** зменшылася на 1,6% і склала 7 487 635 (102% да плана) экзэмпляраў (2022 – 7 605 966).

Такім чынам, па выніках года ўсе асноўныя планавыя паказчыкі, вызначаныя гадавымі планамі работ публічнымі бібліятэкамі Віцебскай вобласці выкананы больш чым на 100%.

Адносныя (сярэднія) паказчыкі па вобласці засталіся на ўзроўні мінулага года і выглядаюць наступным чынам:

- абарачальнасць – 1,2;
- наведвальнасць – 7,6;
- кнігазабяспечанасць (на аднаго карыстальніка) – 14,9;
- чытальнасць – 18,3.

## Камплектаванне бібліятэчных фондаў

Сукупны аб'ём бібліятэчнага фонду публічных бібліятэк Віцебшчыны скараціўся ў параўнанні з 2022 годам на 123,6 тыс. экзэмпляраў (-2%) і налічвае на 01.01.2024 г. 6 075,7 тыс. экзэмпляраў. Відавы склад бібліятэчных фондаў выглядае наступным чынам:

- 5 240,8 тыс. экзэмпляраў кніг (86,3%);

• 737,5 тыс. перыядычных выданняў (12,1%);
• 46,6 тыс. аудыявізуальных дакументаў (0,8%);
• 9,2 тыс. электронных дакументаў (0,2%);
• 11,0 тыс. выяўленчых дакументаў (0,2%);
• 30,6 тыс. іншых дакументаў (0,5%).

Аб'ём фондаў літаратуры спецыяльных фарматаў для людзей з паслабленым зрокам павялічыўся на 825 адзінак і склаў 19 759 экзэмпляраў або 0,3% ад агульнага аб'ёму бібліятэчных фондаў.

Вядучыя пазіцыі ў галіновай структуры дакументнага фонду бібліятэк Віцебшчыны належаць мастацкай літаратуры – 60,5%, у сувязі з яе папулярнасцю і вялікім попытам сярод карыстальнікаў, што ўлічваецца пры камплектаванні фондаў. 27,8% ад агульнай колькасці фонду складае дзіцячая літаратура. Амаль што кожны чацвёрты дакумент у бібліятэках – на беларускай мове.

У бібліятэкі вобласці паступіла 203,5 тыс. экз. дакументаў. Колькасць новых паступленняў павялічылася на 1% (201,4 тыс. экз. дакументаў у 2022 годзе). У 2023 годзе павелічэнне бібліятэчнага фонду назіраецца толькі ў ЦБС г. Віцебска. Больш за ўсіх скараціліся бібліятэчныя фонды ў бібліятэках Мёрскай ЦБС (-6,2%), Чашніцкай РЦБС (-5,9%), Віцебскай РЦБС (-5,2%), Шаркаўшчынскай ЦБС (-4,5%), Шумілінскай ЦБС (-4,5%).

Асноўнай крыніцай фінансавання **камплектавання** публічных бібліятэк рэгіёна па-ранейшаму з'яўляецца мясцовы бюджэт (99%). На гэтыя мэты ў 2023 годзе накіравана **3 005,5** тыс. руб., што на 12,4% больш чым у 2022 годзе (2022 г. – 2632,5 тыс. руб.). Даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 кастрычніка 2016 года, якое ўстанавіла нарматыў бюджэтнага фінансавання на папаўненне фондаў у 12% ад агульнага фінансавання, выканана ў поўнай меры ўсімі цэнтралізаванымі бібліятэчнымі сістэмамі Віцебскай вобласці. У сярэднім па вобласці нарматыў у 2023 годзе склаў **12,6%** (2022 г. – 12,4%). Найвышэйшых паказчыкаў дасягнулі наступныя раёны: Бешанковіцкі (14,4%), Віцебскі (13,9%), Пастаўскі (13,1%).

Ад агульнага аб'ёму бюджэтнага фінансавання на камплектаванне бібліятэчных фондаў на набыццё дакументаў зрасходавана 1 445,5 тыс. рублёў, што на 15,5% больш, чым у 2022 годзе (1 216,6 тыс. рублёў у 2022 годзе). На аплату падпіскі на перыядычныя выданні было накіравана 1 456,6 тыс. руб. – 48,5% ад сукупнага аб'ёму фінансавання (у 2022 годзе – 51,6%). У той жа час грашовыя сродкі, выкарыстаныя на падпіску, склалі больш за 70% ад сумы, затрачанай на камплектаванне ў двух раёнах вобласці: Талачынскім – 75,4% і Расонскім – 72,5%. Павялічылася доля сродкаў (на 24%) на набыццё сацыяльна значнай літаратуры – 389,9 тыс. руб. (у 2022 годзе – 312,7 тыс. руб.). У сярэднім на камплектаванне адной бібліятэчнай установы вобласці затрачана 7,8 тыс. руб. (2022 – 6,7 тыс. руб., 2021 – 5,1 тыс. руб.).



*Працяг табліцы 9*

| | Объем бюджетного финансирования на комплектование библиотечных фондов и приобретение прав доступа к электронным информационным ресурсам, рублей | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | в том числе: | | | |
| | план | факт | % | приобрет. (закупка) док. | приобрет. (закупка) СЗЛ | подписка | права доступа к электр. ресурсам |
| **1** | **6** | **7** | **8** | **9** | **9а** | **10** | **11** |
| **Областная библиотека** | **286267,26** | **286267,26** | **12,7** | **123778,68** | **11742,19** | **114178,58** | **48310,00** |
| ЦБС, в т. ч. | | | | | | | |
| Бешенковичская | 94818,72 | 94818,72 | **14,4** | 50734,76 | 7995,33 | 40460,55 | 3623,41 |
| Браславская | 58306,00 | 58305,62 | **12,3** | 24315,15 | 8773,52 | 29486,87 | 4503,60 |
| Верхнедвинская | 76721,04 | 76721,04 | **12,6** | 36867,25 | 13423,57 | 35447,39 | 4406,40 |
| Витебская | 91228,33 | 91228,33 | **13,9** | 34614,43 | 11951,92 | 56613,90 | 0,00 |
| Глубокская | 128695,24 | 128695,24 | **12,4** | 59605,17 | 10453,46 | 68006,66 | 1083,41 |
| Городокская | 112025,00 | 108415,15 | **12,2** | 59200,11 | 25289,99 | 45359,44 | 3855,60 |
| Докшицкая | 100245,00 | 100244,94 | **12,1** | 44575,66 | 8171,17 | 52329,96 | 3339,32 |
| Дубровенская | 95770,97 | 96898,84 | **12,1** | 41070,69 | 11121,48 | 55249,65 | 578,50 |
| Лепельская | 109183,63 | 109183,63 | **12,9** | 56316,08 | 10477,85 | 46684,98 | 6182,57 |
| Лиозненская | 80660,00 | 80655,91 | **12,7** | 36893,80 | 12979,62 | 41999,31 | 1762,80 |
| Миорская | 97000,00 | 97000,00 | **12,4** | 51677,79 | 14391,37 | 45322,21 | 0,00 |
| Оршанская | 307734,00 | 306652,35 | **12,6** | 146066,50 | 60040,12 | 158061,35 | 2524,50 |
| Полоцкая | 281194,94 | 281194,94 | **12,5** | 146389,34 | 17868,03 | 130146,96 | 4658,64 |
| Поставская | 92498,00 | 92497,48 | **13,1** | 37197,44 | 16088,92 | 53647,64 | 1652,40 |
| Россонская | 48815,67 | 48815,67 | **12,3** | 13446,84 | 2089,79 | 35368,83 | 0,00 |
| Сенненская | 73093,65 | 73093,65 | **12,8** | 29488,36 | 11994,65 | 41080,79 | 2524,50 |
| Толочинская | 86702,00 | 86701,47 | **12,7** | 20126,82 | 7851,22 | 65344,02 | 1230,63 |
| Ушачская | 63015,00 | 63014,38 | **12,8** | 20007,34 | 7506,10 | 41923,64 | 1083,40 |
| Чашникская | 117765,62 | 117765,62 | **12,5** | 65869,76 | 11806,08 | 50886,06 | 1009,80 |
| Шарковщинская | 66605,00 | 66604,82 | **12,6** | 33851,55 | 9274,80 | 31743,47 | 1009,80 |
| Шумилинская | 77329,00 | 77328,90 | **12,9** | 37658,35 | 6120,29 | 38180,75 | 1489,80 |
| **Всего по РЦБС** | **2259406,81** | **2255836,70** | 12,7 | **1045973,19** | **285669,28** | **1163344,43** | **46519,08** |
| г. Витебск | 288512,36 | 288512,36 | **12,6** | 165678,97 | 80884,41 | 119501,05 | 3332,34 |
| г. Новополоцк | 174900,00 | 174902,72 | **12,6** | 110095,86 | 11616,59 | 59609,19 | 5197,67 |
| **Всего по ГЦБС** | **463412,36** | **463415,08** | 12,6 | **275774,83** | **92501,00** | **179110,24** | **8530,01** |
| **ВСЕГО** | **3009086,43** | **3005519,04** | 12,6 | **1445526,70** | **389912,47** | **1456633,25** | **103359,09** |

*Дадатак № 9*
*Табліца 9*

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕМАХ БЮДЖЕТНОГО ФИНАНСИРОВАНИЯ, НАПРАВЛЯЕМОГО НА КОМПЛЕКТОВАНИЕ ФОНДОВ БИБЛИОТЕК В 2023 ГОДУ**

| | Общий объем бюджетного финансирования на содержание библиотек, рублей | | Объем бюджетного финасирования (без учета средств, затраченных по статьям 2.40.00.00 «Капитальные вложения в основные фонды» и 1.10.10.03 «Оплата текущего ремонта зданий и помещений», рублей | |
|---|---|---|---|---|
| | план | факт | план | факт |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **Областная библиотека** | **2295068,00** | **2292939,49** | **2261972,00** | **2259846,67** |
| ЦБС, в т. ч. | | | | |
| Бешенковичская | 760180,85 | 758810,67 | 659591,83 | 658435,85 |
| Браславская | 479244,00 | 477652,20 | 473935,00 | 472407,47 |
| Верхнедвинская | 789780,00 | 762108,44 | 634152,00 | 608135,85 |
| Витебская | 675193,22 | 667195,39 | 661568,22 | 655148,07 |
| Глубокская | 1045104,37 | 1045104,37 | 1035551,08 | 1035551,08 |
| Городокская | 910823,00 | 894294,25 | 902688,00 | 886358,52 |
| Докшицкая | 842967,00 | 834932,22 | 839928,00 | 831907,56 |
| Дубровенская | 820781,07 | 817438,92 | 798095,36 | 798091,39 |
| Лепельская | 861644,00 | 853222,16 | 854434,00 | 846175,35 |
| Лиозненская | 658410,00 | 646467,46 | 648111,00 | 636195,99 |
| Миорская | 804528,18 | 790827,84 | 798584,59 | 785117,16 |
| Оршанская | 2712576,00 | 2586327,78 | 2531945,00 | 2439413,94 |
| Полоцкая | 2692619,00 | 2519542,01 | 2420598,00 | 2252046,10 |
| Поставская | 710389,00 | 707042,01 | 708551,00 | 705205,42 |
| Россонская | 421085,00 | 412664,58 | 406519,00 | 398114,31 |
| Сенненская | 591640,00 | 579570,59 | 582949,00 | 570880,98 |
| Толочинская | 703004,00 | 690175,14 | 697018,00 | 684485,25 |
| Ушачская | 516608,99 | 509802,95 | 498864,99 | 492113,51 |
| Чашникская | 964989,52 | 944488,35 | 961746,52 | 941407,11 |
| Шарковщинская | 569825,66 | 567180,52 | 531493,44 | 528865,34 |
| Шумилинская | 630389,00 | 612136,15 | 616663,00 | 599416,50 |
| **Всего по РЦБС** | **19161781,86** | **18676984,00** | **18262987,03** | **17825472,75** |
| г. Витебск | 2320745,40 | 2320745,40 | 2293258,29 | 2293258,29 |
| г. Новополоцк | 1402847,00 | 1383610,13 | 1402797,00 | 1383561,93 |
| **Всего по ГЦБС** | **3723592,40** | **3704355,53** | **3696055,29** | **3676820,22** |
| **ВСЕГО** | **25180442,26** | **24674279,02** | **24221014,32** | **23762139,64** |



Літаратура набывалася праз дзяржаўныя і камерцыйныя выдавецтвы, кнігагандлёвыя фірмы, кнігарні: РУП «Выдавецтва «Беларусь», ВРУП «Мастацкая літаратура», РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», РУП «Народная асвета», ООО «БукЛайнГрупп», ООО «Вермонт-В», ООО «Книжный сад» і інш. Асноўная крыніца камплектавання бібліятэк вобласці выданнямі прававой тэматыкі – НЦПІ.

Дзякуючы падарункам чытачоў і розных арганізацый фонды бібліятэк папоўніліся на 20 609 экз. кніг на агульную суму 153,3 тыс. рублёў. Бібліятэкі атрымлівалі кнігі ў дар ад Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (праз ААТ «Белкніга»), Дзяржаўнага архіву Віцебскай вобласці, навукова-выдавецкай кампаніі «Тэхналогія», ФДБУК «Дзяржаўны мемарыяльны гісторыка-літаратурны і прыродна-ландшафтны музей-запаведнік А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае», дэлегацый гарадоў Смаленска, Цвяры. Больш за 50 кніг атрымалі бібліятэкі Віцебскай вобласці ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў рамках цыкла акцый «Падаруй кнігу – падаруй сусвет». Уласныя кнігі бібліятэкам дарылі аўтары Галіна і Сяргей Трафімавы, Тамара Бунта, Валерый Рыбакоў, А. Дзюбайла, А. Грышкевіч і інш. Пэўная частка кніг была атрымана ў дар ад чытачоў бібліятэк. На працягу года бібліятэкамі вобласці праводзіліся акцыі «Часопіс – у дар бібліятэцы», «Кніга – у дар бібліятэцы».

За кошт пазабюджэтных сродкаў публічнымі бібліятэкамі Віцебшчыны набыта 1 571 экз. дакументаў на агульную суму 12,3 тыс. руб. За кошт уласных прыбыткаў не папаўняўся фонд бібліятэк Бешанковіцкага, Докшыцкага, Дубровенскага, Мёрскага, Пастаўскага, Ушацкага, Чашніцкага раёнаў, г. Віцебска, г. Наваполацка.

Бібліятэкі ажыццяўлялі выключэнне з фонду зношаных, састарэлых і дублетных выданняў, а таксама выданняў, якія страцілі актуальнасць. За 2023 год з сукупнага фонду спісана 327,1 тыс. экз. дакументаў, што на 16,9% меней, чым у мінулым годзе. (393,6 тыс. экз.), аднак перавышае аб'ём новых паступленняў у 1,6 разоў. Колькасць кніг, выключаных з бібліятэк, склала 63,6% ад агульнай колькасці спісаных дакументаў.

Сярэднеабласны паказчык абнаўляльнасці фондаў публічных бібліятэк нязначна павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам і склаў 3,3% (у 2022 годзе 3,2%). Найвышэйшы працэнт абнаўляльнасці фондаў назіраецца ў бібліятэках Мёрскага (5,1%), Шаркаўшчынскага (5,1%), Глыбоцкага (5,0%), Гарадоцкага (4,7%), Лепельскага (4,6%), Верхнядзвінскага (4,6%), Лёзненскага (4,5%), Полацкага (4,1%), Бешанковіцкага (4,0%) раёнаў.

У 2023 годзе працягнуўся працэс змяншэння сукупнага аб'ёму фондаў бібліятэк вобласці, што звязана найперш за ўсё са скарачэннем сеткі бібліятэк, выключэннем з фондаў састарэлай літаратуры. На працягу апошніх гадоў назіраецца перавышэнне выбыцця дакументаў над іх паступленнем.

## Аўтаматызацыя, інфарматызацыя

У Віцебскай вобласці 380 бібліятэк аснашчаны камп'ютарнай тэхнікай (98,2% ад агульнай колькасці). Узровень камп'ютарызацыі ў параўнанні з мінулым годам павялічыўся на 1,2%, аднак яна застаецца незавершанай ў Докшыцкім (73,7%) і Мёрскім (88,9%) раёнах.

Камп'ютарны парк бібліятэк вобласці на працягу года папоўніўся на 70 адзінак і налічвае 1 214 камп'ютараў. Аналізуючы тэрмін карыснага выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі, неабходна адзначыць, што машыны, што выкарыстоўваюцца менш за 5 год, складаюць толькі 14,7% ад агульнай колькасці. У абнаўленні тэхнічнага абсталявання асабліва маюць патрэбу Пастаўскі, Расонскі, Чашніцкі, Браслаўскі, Глыбоцкі, Дубровенскі раёны.

На 01.01.2024 г. да сеткі інтэрнэт падключаны 315 бібліятэк Віцебскай вобласці, што складае 81,4% ад агульнай колькасці (78,8% у 2022 годзе), у тым ліку 223 бібліятэкі у сельскай мясцовасці, што складае 77,2% ад іх агульнай колькасці (74,2% у 2022 годзе). Кожная з бібліятэк цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы падключана да сеткі інтэрнэт у Бешанковіцкім, Лепельскім, Лёзненскім, Полацкім, Талачынскім, Ушацкім, Чашніцкім раёнах., а таксама ў г. Віцебску і г. Наваполацку Самыя нізкія паказчыкі – у Пастаўскім (27,8%) і Докшыцкім (52,6%) раёнах.

У бібліятэках вобласці абсталявана 350 аўтаматызаваных рабочых месцаў для карыстальнікаў. Усе цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы вобласці падтрымліваюць эксплуатацыю аўтаматызаванай інфармацыйнай бібліятэчнай сістэмы «ALIS-Web».

На працягу 2023 года працягвалася работа па фарміраванні Рэгіянальнага зводнага электроннага каталога Віцебскай вобласці на платформе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Да ўдзелу ў праекце нароўні з абласной бібліятэкай, цэнтральнымі бібліятэкамі ЦБС г. Віцебска і г. Наваполацка, Аршанскай, Лёзненскай і Лепельскай ЦБС, Віцебскай, Полацкай і Чашніцкай РЦБС у 2023 годзе падключылася цэнтральная бібліятэка Гарадоцкага культурна-асветніцкага цэнтра і сеткі публічных бібліятэк. Агульны аб'ём бібліяграфічных запісаў Рэгіянальнага зводнага электроннага каталога Віцебскай вобласці склаў 829,7 тыс. (779,2 тыс. у 2022 годзе).

Кожная бібліятэчная сістэма Віцебскай вобласці прадстаўлена ў сеціве інтэрнет уласным сайтам. Усяго налічваецца 25 сайтаў бібліятэк вобласці (абласной бібліятэкі, 23 раённых і гарадскіх ЦБС, дзіцячай бібліятэкі Докшыцкай ЦБС). У 2023 годзе колькасць віртуальных карыстальнікаў, зарэгістраваных на веб-сайтах, склала 11,5 тыс., што на тысячу больш у параўнанні з мінулым годам. Сэрвіс «Віртуальная даведачная служба» функцыянаваў на сайтах Гарадоцкай, Докшыцкай, Аршанскай, Талачынскай ЦБС, Полацкай РЦБС, ЦБС гг. Віцебска і Наваполацка, Віцебскай абласной бібліятэкі.

2023 год паклаў пачатак новым віртуальным рэсурсам бібліятэк. Электронны рэсурс «Святыя заступнікі Віцебшчыны» быў распрацаваны ў



*Працяг табліцы 8*

| ЦБС | **ВЫБЫЛА** ў 2023 усяго | **ФОНД** на канец 2023 года | **% абнаўлення фонду** | **% выканання нарматыву на кампл.** |
|---|---|---|---|---|
| Бешанковіцкая | 12448 | 177892 | 4,0 | 14,4 |
| Браслаўская | 9769 | 168039 | 3,1 | 12,3 |
| Верхнядзвінская | 9937 | 115945 | 4,6 | 12,6 |
| Віцебская | 17641 | 251677 | 1,8 | 13,9 |
| Глыбоцкая | 15328 | 277509 | 5,0 | 12,4 |
| Гарадоцкая | 12302 | 160301 | 4,7 | 12,2 |
| Докшыцкая | 10866 | 190461 | 3,4 | 12,1 |
| Дубровенская | 10917 | 160166 | 3,8 | 12,1 |
| Лепельская | 8851 | 174481 | 4,6 | 12,9 |
| Лёзненская | 5926 | 112931 | 4,5 | 12,7 |
| Мёрская | 14610 | 129234 | 5,1 | 12,4 |
| Аршанская | 38513 | 702356 | 3,0 | 12,6 |
| Полацкая | 31059 | 496891 | 4,1 | 12,5 |
| Пастаўская | 9135 | 202041 | 3,8 | 13,1 |
| Расонская | 5621 | 86019 | 3,9 | 12,3 |
| Сенненская | 9389 | 186496 | 3,1 | 12,8 |
| Талачынская | 8274 | 139341 | 3,9 | 12,7 |
| Ушацкая | 4953 | 92649 | 3,7 | 12,8 |
| Чашніцкая | 20913 | 219030 | 3,6 | 12,5 |
| Шаркаўшчынская | 12085 | 125158 | 5,1 | 12,6 |
| Шумілінская | 7821 | 104543 | 2,9 | 12,9 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **276358** | **4273160** | **3,7** | |
| г.Віцебск | 17009 | 746346 | 3,0 | 12,6 |
| г.Наваполацк | 17172 | 387899 | 2,7 | 12,6 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **34181** | **1134245** | **2,9** | |
| **УСЯГО па ЦБС** | **310539** | **5407405** | **3,6** | |
| Абласная б-ка | 16589 | 668267 | 1,6 | 12,7 |
| **УСЯГО** | **327128** | **6075672** | **3,3** | **12,6** |

*Дадатак № 8*
*Табліца 8*

**СТАН БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ**

| ЦБС | ФОНД на канец 2022 года | ПАСТУПІЛА Ў 2023 | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | СЗЛ | агучанай літ. |
| Бешанковіцкая | 183303 | 7037 | 543 | 18 |
| Браслаўская | 172577 | 5231 | 871 | 22 |
| Верхнядзвінская | 120552 | 5330 | 933 | 28 |
| Віцебская | 264840 | 4478 | 807 | 0 |
| Глыбоцкая | 278930 | 13907 | 755 | 30 |
| Гарадоцкая | 164999 | 7604 | 1252 | 20 |
| Докшыцкая | 194879 | 6448 | 695 | 38 |
| Дубровенская | 165001 | 6082 | 512 | 11 |
| Лепельская | 175265 | 8067 | 761 | 11 |
| Лёзненская | 113727 | 5130 | 940 | 13 |
| Мёрская | 137317 | 6527 | 988 | 7 |
| Аршанская | 719633 | 21236 | 4054 | 91 |
| Полацкая | 507790 | 20160 | 1305 | 76 |
| Пастаўская | 203508 | 7668 | 1339 | 0 |
| Расонская | 88296 | 3344 | 137 | 10 |
| Сенненская | 190121 | 5764 | 868 | 9 |
| Талачынская | 142200 | 5415 | 478 | 17 |
| Ушацкая | 94203 | 3399 | 431 | 0 |
| Чашніцкая | 232003 | 7940 | 856 | 20 |
| Шаркаўшчынская | 130810 | 6433 | 749 | 10 |
| Шумілінская | 109333 | 3031 | 393 | 8 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **4389287** | **160231** | **19667** | **439** |
| г.Віцебск | 741084 | 22271 | 5383 | 112 |
| г.Наваполацк | 394723 | 10348 | 737 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1135807** | **32619** | **6120** | **112** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **5525094** | **192850** | **25787** | **551** |
| Абласная б-ка | 674180 | 10676 | 651 | 204 |
| **УСЯГО** | **6199274** | **203526** | **26438** | **755** |



Віцебскай абласной бібліятэцы. У бібліятэках вобласці створаны рэсурсы і базы даных «Гарадскія гісторыі» (ЦГБ імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска), «Працоўная слава Глыбоччыны», «Каталіцкія храмы Глыбоччыны» (Глыбоцкая ЦБС), «Вуліцы нашага горада», «Героі Сацыялістычнай Працы – нашы землякі» (Талачынская ЦБС), «Мая Ушаччына» (Ушацкая ЦБС), віртуальны праект «Пётр Прусаў – стваральнік легендарнай “Нівы“» (Лёзненская ЦБС).

Агульны аб’ём электронных каталогаў бібліятэк вобласці склаў 3 072,2 тыс. запісаў. Павелічэнне колькасці бібліяграфічных запісаў у электронных каталогах, у параўнанні з мінулым годам, адбылося на 3,2% (2 976,9 тыс. запісаў у 2022 годзе).

Значныя магчымасці інфармаванняі прыцягнення новых чытачоў даюць сацыяльныя сеткі. Карыстаецца гэтымі тэхналогіямі прыкладна трэцяя частка публічных бібліятэк Віцебскай вобласці. На 01.01.2024 г. у сацыяльных сетках зарэгістравана 206 (199 у 2022 годзе) прадстаўніцтваў, якія вядуць 100 публічных бібліятэк (99 у 2022 годзе). Акаунты ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» мае 81 бібліятэка, «Одноклассники» – 54, «Instagram» – 40, «YouTube» – 15, «Facebook» – 6, «Telegram» – 5, «TikTok» – 5. Прытрымліваючыся актуальных тэндэнцый развіцця сацыяльных медыя, бібліятэкі павялічылі прысутнасць у такіх сацыяльных сетках, як «Instagram» (на 5 прадстаўніцтваў), «Telegram» (на 3), «TikTok» (на 3) у параўнанні з мінулым годам. Па ахопу зацікаўленай аудыторыі лідзіруючыя пазіцыі займаюць старонка «Бібліятэкі Оршы» Аршанскай ЦБС ў «Одноклассниках» (5 077 сяброў і падпісчыкаў), група «Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка» Гарадоцкай ЦБС у сетцы «ВКонтакте» (4 654 сябры і падпісчыка), старонка «Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка» ў «Одноклассниках» (4 584 сябры і падпісчыка), старонка «Бібліятэка Горкага» цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска ў «Одноклассниках» (4 389 сяброў і падпісчыкаў), канал ДУК «Лепельская ЦБС» у «TikTok» (4 349 падпісчыка), старонка «Цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны» Полацкай цэнтральная бібліятэкі ў сетцы «ВКонтакте» (4 015 сяброў і падпісчыкаў).

## Матэрыяльна-тэхнічная база

Агульны аб’ём бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2023 годзе склаў 24 674 279,02 руб. (21 466 420,87 руб. у 2022 г.).

387 бібліятэк Віцебшчыны размясціліся ў 383 будынках, з іх спецыяльна пабудаваных – 91 (23,8%), прыстасаваных – 292 (76,2%). Сумесна з іншымі арганізацыямі выкарыстоўваюцца 279 (72,8%) будынкаў.

Агульная плошча памяшканняў складае 71 618 м² ( 68355,00 м² у 2022 г.).

Будынкаў, якія патрабуюць капітальнага рамонту ці знаходзяцца ў аварыйным стане, няма.

Тэлефанізавана 96,4% бібліятэк вобласці (373 установы).

У 2023 годзе была працягнута станоўчая дынаміка ва **ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы** публічных бібліятэк. Быў праведзены рамонт Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. За кошт сродкаў, выдаткаваных на ўтрыманне бібліятэк, праведзена замена ўваходных дзвярэй і касметычны рамонт фасадаў у двух бібліятэках, рамонт даху будынкаў двух бібліятэк, рамонт газавага катла, замена часткі вітрыннага акна адной бібліятэкі ў ЦБС г. Віцебска. За кошт сродкаў раённага бюджэту ў ліпені 2023 года закуплены будаўнічыя матэрыялы для рамонту даху будынка, фасада, санвузлоў Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі, зроблены касметычны рамонт Мяжанскай бібліятэкі-клуба Гарадоцкай ЦБС. Здзейснены бягучы рамонт памяшканняў у бібліятэках Пастаўскай, Талачынскай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай, Дубровенскай, Лепельскай, Расонскай ЦБС, Чашніцкай і Віцебскай РЦБС.

За кошт сродкаў спонсарскай дапамогі зроблены бягучы рамонт у цэнтральнай і дзіцячай бібліятэках Лепельскай ЦБС, набыта мэбля для экспазіцыйнай залы «Книга – времен связующая нить».

У рамках рэалізацыі Комплексу мер па развіццю Полацкага раёна для Полацкай бібліятэчнай сістэмы набыты сучасны бібліёбус, абсталяваны рабочым месцам бібліятэкара і кніжнымі стэлажамі. Новы транспарт дазволіць палепшыць якасць нестацыянарнага абслугоўвання раёна і павялічыць колькасць абслугоўваемых населеных пунктаў.

На працягу года за бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі набывалася тэхнічнае абсталяванне, праводзілася **мадэрнізацыя камп'ютарнай тэхнікі**, тэхнічнае абслугоўванне бібліёбусаў. Камп'ютарная тэхніка набывалася ў Бешанковіцкай, Віцебскай, Глыбоцкай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Лепельскай, Лёзненскай, Мёрскай, Аршанскай, Полацкай, Ушацкай, Шумілінскай, ЦБС г. Наваполацка.

У якасці спонсарскай дапамогі на бязвыплатнай аснове ААТ «Ашчадны банк "Беларусбанк"» передала 5 камп'ютараў для бібліятэк ЦБС г. Віцебска, 4 камп'ютары – для Шумілінскай ЦБС. Пры дапамозе спонсараў папаўняўся таксама камп'ютарны парк Верхнядзвінскай і Лепельскай ЦБС.

## Платныя паслугі

Платныя паслугі прадастаўляюцца бібліятэкамі з мэтай задавальнення дадатковых інфармацыйных патрэб карыстальнікаў, пашырэння спектра паслуг, павышэння камфортнасці, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк.

У 2023 годзе сродкі, атрыманыя ад выканання бібліятэкамі дадатковых паслуг, склалі 296,9 тыс. руб., што на 5,7% больш, чым ў 2022 годзе (2022 – 280,9 тыс. руб.). Найвышэйшых паказчыкаў дасягнулі Аршанская ЦБС (34,6 тыс. руб.), Віцебская абласная бібліятэка (27,0 тыс. руб.), Полацкая РЦБС (25,6 тыс. руб.), ЦБС г. Наваполацка (23,1 тыс. руб.), Бешанковіцкая ЦБС (16,6 тыс. руб.), Браслаўская ЦБС (14,8 тыс. руб.),





| ЦБС | ДАКУМЕНТАВЫДАЧА | | | |
|---|---|---|---|---|
| | пл./мін да 2022 | у сярэд. на б-ку | Абарачальнасць 2023 | Кнігазабяспечанасць 2023 |
| Бешанковіцкая | -10386 | 14428,0 | 0,9 | 22,2 |
| Браслаўская | -13282 | 14076,2 | 1,1 | 18,6 |
| Верхнядзвінская | -2080 | 10586,7 | 1,6 | 11,9 |
| Віцебская | -11848 | 12304,2 | 1,0 | 18,5 |
| Глыбоцкая | -10135 | 11831,4 | 1,1 | 17,6 |
| Гарадоцкая | -6986 | 15334,1 | 1,3 | 13,7 |
| Докшыцкая | -11142 | 11161,4 | 1,1 | 15,5 |
| Дубровенская | -2938 | 8932,5 | 0,9 | 19,1 |
| Лепельская | -14909 | 17844,3 | 1,6 | 12,9 |
| Лёзненская | -569 | 9255,2 | 1,2 | 14,5 |
| Мёрская | -2030 | 9747,4 | 1,4 | 13,7 |
| Аршанская | -11756 | 28062,6 | 1,4 | 15,1 |
| Полацкая | 4122 | 23535,2 | 1,7 | 11,0 |
| Пастаўская | -10413 | 10976,1 | 1,0 | 18,7 |
| Расонская | 4258 | 13954,4 | 1,5 | 17,8 |
| Сенненская | -3694 | 13867,1 | 1,1 | 18,1 |
| Талачынская | -4572 | 11318,5 | 1,2 | 14,8 |
| Ушацкая | -12914 | 11305,2 | 1,1 | 13,7 |
| Чашніцкая | -2096 | 18216,3 | 1,2 | 15,2 |
| Шаркаўшчынская | 2181 | 11097,2 | 1,2 | 15,1 |
| Шумілінская | 1203 | 12763,9 | 1,7 | 11,6 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **-119986** | **14961,4** | **1,3** | **15,0** |
| г.Віцебск | 18919 | 60292,6 | 1,3 | 11,8 |
| г.Наваполацк | 17 | 63105,6 | 1,1 | 13,3 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **18936** | **61148,7** | **1,2** | **12,3** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **-101050** | **17713,5** | **1,3** | **14,3** |
| Абласная б-ка | -17281 | 650231,0 | 1,0 | 21,2 |
| **УСЯГО** | **-118331** | **19347,9** | **1,2** | **14,9** |
| 2022 год | | 19403 | 1,2 | 14,9 |

*Дадатак № 7*
*Табліца 7*

**ДАКУМЕНТАВЫДАЧА**

| ЦБС | Фонд 2023 | +/- да 2022 | ДАКУМЕНТАВЫДАЧА | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Выканана 2022 | План 2023 | Выканана / Факт | % выкан. |
| Бешанковіцкая | 177892 | -5411 | 169 094 | 147200 | 158708 | 107,8 |
| Браслаўская | 168039 | -4538 | 196 272 | 165010 | 182990 | 110,9 |
| Верхнядзвінская | 115945 | -4607 | 182 054 | 176470 | 179974 | 102,0 |
| Віцебская | 251677 | -13163 | 270 236 | 264100 | 258388 | 97,8 |
| Глыбоцкая | 277509 | -1421 | 305 919 | 292000 | 295784 | 101,3 |
| Гарадоцкая | 160301 | -4698 | 221 663 | 212900 | 214677 | 100,8 |
| Докшыцкая | 190461 | -4418 | 223 208 | 202000 | 212066 | 105,0 |
| Дубровенская | 160166 | -4835 | 154 791 | 133900 | 151853 | 113,4 |
| Лепельская | 174481 | -784 | 300 418 | 280800 | 285509 | 101,7 |
| Лёзненская | 112931 | -796 | 139 397 | 135800 | 138828 | 102,2 |
| Мёрская | 129234 | -8083 | 177 483 | 162765 | 175453 | 107,8 |
| Аршанская | 702356 | -17277 | 965 885 | 931600 | 954129 | 102,4 |
| Полацкая | 496891 | -10899 | 819 609 | 800000 | 823731 | 103,0 |
| Пастаўская | 202041 | -1467 | 207 982 | 196800 | 197569 | 100,4 |
| Расонская | 86019 | -2277 | 121 332 | 120600 | 125590 | 104,1 |
| Сенненская | 186496 | -3625 | 211 700 | 208000 | 208006 | 100,0 |
| Талачынская | 139341 | -2859 | 174 350 | 167960 | 169778 | 101,1 |
| Ушацкая | 92649 | -1554 | 114 661 | 100500 | 101747 | 101,2 |
| Чашніцкая | 219030 | -12973 | 275 340 | 266245 | 273244 | 102,6 |
| Шаркаўшчынская | 125158 | -5652 | 142 083 | 129570 | 144264 | 111,3 |
| Шумілінская | 104543 | -4790 | 177 492 | 160000 | 178695 | 111,7 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **4273160** | **-116127** | **5 550 969** | **5254220** | **5430983** | **103,4** |
| г.Віцебск | 746346 | 5262 | 945 763 | 945750 | 964682 | 102,0 |
| г.Наваполацк | 387899 | -6824 | 441 722 | 441000 | 441739 | 100,2 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1134245** | **-1562** | **1 387 485** | **1386750** | **1406421** | **101,4** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **5407405** | **-117689** | **6 938 454** | **6640970** | **6837404** | **103,0** |
| Абласная б-ка | 668267 | -5913 | 667 512 | 700000 | 650231 | 92,9 |
| **УСЯГО** | **6075672** | **-123602** | **7 605 966** | **7340970** | **7487635** | **102,0** |
| 2022 год | | | | | | 101,7 |



Лепельская ЦБС (14,0 тыс. руб).

Самымі запатрабаванымі платнымі паслугамі па-ранейшаму застаюцца ксеракапіраванне, скапіраванне дакументаў, іх раздрукоўка на прынтары, а таксама выдача літаратуры і перыядычных выданняў з фонду камерцыйнага абанементу і чытальных залаў у часовае карыстанне.

Трэба адзначыць, што не зніжаецца цікавасць наведвальнікаў бібліятэк Наваполацкай ЦБС да такіх паслуг, як правядзенне квэстаў, квізаў, дзіцячых святаў, дзён нараджэння ў бібліятэцы. Аналагічным чынам рэалізуюцца камерцыйныя праекты Аршанскай ЦБС «Праздник-проказник», «Нескучный вечер в библиотеке», «Новогодняя сказка», выяздныя канцэртныя праграмы ад калектываў бібліятэк-клубаў, танцавальныя вечарыны. У справаздачным годзе сталі больш карыстацца попытам сярод наведвальнікаў бібліятэк-клубаў Докшыцкай ЦБС конкурсна-забаўляльныя, святочныя праграмы.

Грашовыя сродкі, атрыманыя ад аказання платных паслуг, выкарыстаны бібліятэкамі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, папаўненне фондаў і іншыя мэты.Магчымасцю ў той ці іншай меры папоўніць такім чынам свой фонд у 2023 годзе скарысталася больш за палову бібліятэчных сістэм. На гэтыя мэты пайшло 33,5% ад пазабюджэтных сродкаў Віцебскай РЦБС, 19,9% – Лёзненскай, 14,0% – Верхнядзвінскай, 12,8% – Глыбоцкай, 12,4% – Сенненскай ЦБС.

## Кадры

Па стане на 01.01.2024 у бібліятэках рэгіёну працавала 1 474 чал., з іх 287 – адміністрацыйна-ўпраўленчы персанал, 859 – спецыялісты, 4 – іншыя служачыя, 324 – рабочыя.

З агульнай спіскавай колькасці 1 070 чалавек складаюць бібліятэчныя супрацоўнікі па профілю ўстановы, што на 1,5% менш, чым у мінулым годзе. Колькасць дыпламаваных спецыялістаў з бібліятэчнай адукацыяй (вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай) у публічных бібліятэках вобласці склала 634 чалавекі (59,2% ад агульнай колькасці бібліятэчных супрацоўнікаў).

Агульная штатная колькасць работнікаў бібліятэк складае 1 600 адзінак. Іх колькасць павялічылася на 5,64 штатныя адзінкі да мінулага года, нягледзячы на закрыццё бібліятэк. У штаце Глыбоцкай ЦБС адзначаецца істотнае павелічэнне за кошт далучэння да сеткі бібліятэк Гатаўшчынскай сельскай бібліятэкі-клуба, якая была рэарганізавана з Гатаўшчынскага сельскага клуба-бібліятэкі.

На працягу 2023 года навучаліся ва ўстановах адукацыі на дзённай і завочнай формах навучання 14 супрацоўнікаў бібліятэк, з іх у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў – 5, Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў – 6, іншых установах – 3. Праходзілі перападрыхтоўку ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і

мастацтваў» 6 чалавек. На рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі павысілі прафесійны ўзровень 36 супрацоўнікаў.

Па размеркаванні ў бібліятэкі Віцебскага рэгіёна прыбылі 9 маладых спецыялістаў. З мэтай аказання дапамогі маладым спецыялістам у іх прафесійным станаўленні і працэсе адаптацыі на першым працоўным месцы над такімі супрацоўнікамі арганізавана настаўніцтва.

Кадравая сітуацыя ва ўсіх бібліятэках рэгіёна, уключаючы абласную, застаецца стабільна напружанай, сярод агульных праблем – недахоп высокапрафесійных спецыялістаў. На канец разгледжанага перыяду ў бібліятэках вобласці налічвалася 60 вакантных штатных адзінак.

## Узнагароды. Прэміі

На працягу 2023 года супрацоўнікі бібліятэк Віцебскай вобласці былі ўдастоены ўзнагарод living рознага ўзроўню.

За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё рэгіёну і ў сувязі з 85-годдзем з дня заснавання Віцебскай вобласці дырэктару ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» Таццяне Мікалаеўне Адамян аб’яўлена **Падзяка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**.

**Ганаровая грамата** «За шматгадовую добрасумленную працу і значны ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнай культуры» ўручана **Міністрам культуры Рэспублікі Беларусь** Анатолем Маркевічам намесніку дырэктара па асноўнай дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна Вользе Макараўне Камендантавай.

**Падзякай Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь** узнагароджана Караваева Марыя Віктараўна – дырэктар ЦБС г. Наваполацка.

**Ганаровымі граматамі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў** узнагароджаны Пячонава Вольга Усеваладаўна, загадчык аддзела па рабоце з дзецьмі цэнтральнай раённай бібліятэкі Лёзненскай ЦБС і Варанец Таццяна Валер’еўна, загадчык дзіцячай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка.

**Ганаровымі граматамі ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта** ўзнагароджаны: Мароз Таццяна Іванаўна, загадчык аддзела маркетынга цэнтральнай раённай бібліятэкі Бешанковіцкай ЦБС, Зуева Святлана Вячаславаўна, загадчык бібліятэкі-філіяла № 9 імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска, Крупко Анастасія Анатолеўна, загадчык аддзела абслугоўвання дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка, Іваноўская Таццяна Адамаўна, загадчык Гарадзішчанскай сельскай бібліятэкі-клуба філіяла № 37, Краміч Ганна Іосіфаўна, бібліятэкар Валкалацкай сельскай бібліятэкі філіяла № 34, Бабровіч Алена Віктараўна, бібліятэкар цэнтральнай раённай бібліятэкі. Докшыцкай ЦБС.

**Граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі** ўзнагароджаны «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных



*Працяг табліцы 6*

| ЦБС | Насель-ніцтва | Заданне (Культура Беларусі) | Факт | НАВЕДВАННІ | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | пл./ мін. да 2022 | у сярэд. на б-ку | Наведваль-насць 2023 |
| Бешанковіцкая | 13653 | 6014 | 6473 | -970 | 6255,9 | 10,1 |
| Браслаўская | 23428 | 3582 | 3714 | 1748 | 5181,7 | 9,3 |
| Верхнядзвінская | 19032 | 3665 | 4332 | -252 | 3841,6 | 7,7 |
| Віцебская | 34478 | 3368 | 3424 | -2259 | 4663,0 | 8,3 |
| Глыбоцкая | 33627 | 3527 | 4162 | 4751 | 4037,8 | 7,5 |
| Гарадоцкая | 20769 | 4826 | 5298 | -661 | 6070,9 | 8,1 |
| Докшыцкая | 21003 | 5574 | 5970 | 990 | 4700,2 | 8,7 |
| Дубровенская | 13386 | 5932 | 6447 | -1888 | 4398,6 | 10,2 |
| Лепельская | 30737 | 3688 | 3840 | -1811 | 6420,5 | 8,5 |
| Лёзненская | 15022 | 4473 | 6697 | 525 | 3971,5 | 9,5 |
| Мёрская | 17961 | 4265 | 4530 | 1025 | 3524,8 | 8,3 |
| Аршанская | 142331 | 2313 | 2516 | -3963 | 8178,6 | 6,7 |
| Полацкая | 100316 | 3369 | 3727 | -4132 | 8572,1 | 7,7 |
| Пастаўская | 32402 | 3536 | 3788 | -5552 | 4595,8 | 8,3 |
| Расонская | 8523 | 4954 | 5557 | 1467 | 4022,6 | 8,7 |
| Сенненская | 19035 | 5413 | 5782 | -3158 | 5729,5 | 9,7 |
| Талачынская | 22218 | 3153 | 3819 | 4152 | 4006,1 | 7,2 |
| Ушацкая | 11732 | 4354 | 4579 | -1235 | 4858,4 | 7,2 |
| Чашніцкая | 27047 | 5904 | 6564 | 8871 | 6963,9 | 8,5 |
| Шаркаўшчынская | 13362 | 5117 | 5749 | -403 | 4666,7 | 8,3 |
| Шумілінская | 16418 | 6127 | 6579 | -1633 | 5148,4 | 10,4 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***636480*** | | | **-4388** | **5507,3** | **8,2** |
| г.Віцебск | 359148 | 1426 | 1456 | -2821 | 23701,8 | 7,0 |
| г.Наваполацк | 96320 | 2305 | 2375 | -5433 | 22754,1 | 6,7 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***455468*** | | | **-8254** | **23413,4** | **6,9** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **1091948** | | | **-12642** | **6574,3** | **7,9** |
| Абласная б-ка | 359148 | 1655 | 1735 | -427425 | 135547,0 | 4,8 |
| **УСЯГО** | **1091948** | **4553** | **4851** | **-440067** | **6907,5** | **7,6** |
| 2022 год | 1103833 | 4553 | 5197 | | 7999 | 7,6 |

*Дадатак № 6*
*Табліца 6*

**НАВЕДВАННІ**

| ЦБС | НАВЕДВАННІ | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Выканана 2022 | План 2023 | Выканана / Факт | Рэальныя | Вірт. | Мерапр. * | % выкан. |
| Бешанковіцкая | 89 350 | 84000 | 88380 | 68815 | 7498 | 12067 | 105,2 |
| Браслаўская | 85 265 | 85020 | 87013 | 67362 | 3073 | 16578 | 102,3 |
| Верхнядзвінская | 82 706 | 74765 | 82454 | 65307 | 7270 | 9877 | 110,3 |
| Віцебская | 120 316 | 120240 | 118057 | 97923 | 4482 | 15652 | 98,2 |
| Глыбоцкая | 135 195 | 131940 | 139946 | 100944 | 21231 | 17771 | 106,1 |
| Гарадоцкая | 110 695 | 102350 | 110034 | 84993 | 15050 | 9991 | 107,5 |
| Докшыцкая | 124 390 | 118000 | 125380 | 89304 | 17810 | 18266 | 106,3 |
| Дубровенская | 88 193 | 82000 | 86305 | 74776 | 1096 | 10433 | 105,3 |
| Лепельская | 119 841 | 115525 | 118030 | 102728 | 2846 | 12456 | 102,2 |
| Лёзненская | 100 082 | 87710 | 100607 | 59573 | 26899 | 14135 | 114,7 |
| Мёрская | 80 338 | 78500 | 81363 | 63447 | 2651 | 15265 | 103,6 |
| Аршанская | 362 060 | 341900 | 358097 | 278072 | 46081 | 33944 | 104,7 |
| Полацкая | 378 023 | 348000 | 373891 | 300025 | 25814 | 48052 | 107,4 |
| Пастаўская | 128 279 | 122000 | 122727 | 82725 | 32725 | 7277 | 100,6 |
| Расонская | 45 897 | 45950 | 47364 | 36203 | 5319 | 5842 | 103,1 |
| Сенненская | 113 212 | 109500 | 110054 | 85943 | 9630 | 14481 | 100,5 |
| Талачынская | 80 708 | 71750 | 84860 | 60091 | 17287 | 7482 | 118,3 |
| Ушацкая | 54 950 | 52500 | 53715 | 43726 | 5154 | 4835 | 102,3 |
| Чашніцкая | 168 655 | 163250 | 177526 | 104458 | 54668 | 18400 | 108,7 |
| Шаркаўшчынская | 77 218 | 74710 | 76815 | 60667 | 8449 | 7699 | 102,8 |
| Шумілінская | 109 653 | 103500 | 108020 | 72078 | 14126 | 21816 | 104,4 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **2655026** | **2513110** | **2650638** | **1999160** | **329159** | **322319** | **105,5** |
| г.Віцебск | 525 653 | 514000 | 522832 | 379229 | 76983 | 66620 | 101,7 |
| г.Наваполацк | 234 215 | 227700 | 228782 | 159279 | 34297 | 35206 | 100,5 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **759868** | **741700** | **751614** | **538508** | **111280** | **101826** | **101,3** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **3414894** | **3254810** | **3402252** | **2537668** | **440439** | **424145** | **104,5** |
| Абласная б-ка | 2321901 | 1876000 | 1894476 | 135547 | 1741724 | 17205 | 101,0 |
| **УСЯГО** | **5736795** | **5130810** | **5296728** | **2673215** | **2182163** | **441350** | **103,2** |
| 2022 год | | | 5736795 | 3135424 | 2601371 | улік з 2023 | 110,9 |



бібліятэк» за актыўны ўдзел у гуманітарна-асветніцкім выхаванні насельніцтва.

**Ганаровай граматай Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму** ўзнагароджана Калбянок Святлана Уладзіміраўна, бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

**Граматай Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму** ўзнагароджана Голубева Наталля Аляксееўна, намеснік дырэктара ЦБС г. Наваполацка.

## Прэміі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта

Па традыцыі, да прафесійнага свята – Дня работнікаў культуры – адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў прэміі Віцебскага аблвыканкама за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва. Сярод бібліятэчных работнікаў адзначана **Галіна Кандратовіч**, бібліятэкар Відзаўскай гарпасялковай бібліятэкі ЦБС Браслаўскага раёна.

На пасяджэнні выніковай калегіі ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта адбылося прысуджэнне штогадовай прэміі па выніках 2023 года:

- у намінацыі «Лепшая раённая (гарадская) бібліятэка» адзначана **Глыбоцкая цэнтральная раённая бібліятэка;**
- у намінацыі «Лепшая сельская бібліятэка» адзначана **Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка** Гарадоцкага культурна-асветніцкага цэнтра і сеткі публічных бібліятэк;
- у намінацыі «Лепшая дзіцячая бібліятэка» адзначана **дзіцячая бібліятэка імя У.С. Караткевіча – філіял № 1** Аршанскай ЦБС.

## Літаратурная прэмія імя Петруся Броўкі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта

У снежні ў Віцебскай абласной бібліятэцы прайшла цырымонія ўзнагароджання лаурэатаў літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі за 2023 год.

У намінацыі «Паэзія» адзначаны пісьменнік з шумiлiншчыны Віктар Улюценка (творчы псеўданім Антон Параскевін) за зборнік вершаў «Белыя зоры».

У намінацыі «Літаратура для дзяцей» узнагароду атрымала Лідзія Піскун з Полацка за кнігу «Неверагодныя гісторыі Шалі і Полі».

Літаратурная прэмія была зацверджана аблвыканкамам у 2012 годзе ў мэтах папулярызацыі лепшых твораў, а таксама стымулявання і падтрымкі таленавітых паэтаў і пісьменнікаў рэгіёна.

## Конкурсы

### *Вынікі XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»*

26 мая 2023 года загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 118 зацверджаны вынікі XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступені былі адзначаны 22 публічныя бібліятэкі, 4 бібліятэкі прадстаўлены да заахвочвання. Сярод пераможцаў 3 бібліятэкі Віцебскай вобласці.

У намінацыі «**За пошукавую і даследчую дзейнасць»**

**Дыплом першай ступені** (50 базавых велічынь) атрымала Сасноўская сельская бібліятэка ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» за даследаванне партызанскага мінулага краю, стварэнне гісторыка-публіцыстычнага нарыса «Памяці жыць!..», інфармацыйнага даведніка «Рубеж славы».

**Заахвочвальныя грашовыя прэміі** (10 базавых велічынь) атрымалі:

- цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага ДУК «ЦБС г. Наваполацка», якая прадстаўляла сваю конкурсную работу ў намінацыі «За значны уклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»;
- Верхнядзвінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Т. Хадкевіча ДУК «Верхнядзвінская ЦБС», якая прадстаўляла ў намінацыі «За пошукавую і даследчую дзейнасць» работу па даследаванні жыццёвага і творчага шляху пісьменніка-земляка Тараса Хадкевіча.

### *Вынікі IX Рэспубліканскага конкурсу «Библиотека – центр духовного просвещения и воспитания»*

На падставе пратакола аб падвядзенні вынікаў IX Рэспубліканскага конкурсу «Библиотека – центр духовного просвещения и воспитания» Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веніямінам, Патрыяршым экзархам усея Беларусі Распараджэннем па Беларускай праваслаўнай царкве ад 15 лістапада 2023 года было зацверджана рашэнне журы, якое вызначына пераможцаў конкурса.

У намінацыі **«Гісторыя Праваслаўя роднага краю»**

**Першае месца** сярод бібліятэк, размешчаных у гарадской мясцовасці:

- Цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Віцебская РЦБС».

У намінацыі **«Сям'я – наследніца маральных і духоўных каштоўнасцей»**

**Другое месца** сярод бібліятэк, размешчаных у гарадской мясцовасці:

- Новалукомльская гарадская бібліятэка філіял ДУК «Чашніцкая РЦБС».





| ЦБС | КАРЫСТАЛЬНІКІ | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | % выкан. | пл./ мін. да 2022 | у сярэд. на б-ку | чыталь-насць 2023 | % ахопу насельн. |
| Бешанковіцкая | 100,2 | -541 | 729,6 | 19,8 | 58,8 |
| Браслаўская | 102,2 | -239 | 694,2 | 20,3 | 38,5 |
| Верхнядзвінская | 100,2 | -8 | 573,0 | 18,5 | 51,2 |
| Віцебская | 97,9 | -93 | 648,3 | 19,0 | 39,5 |
| Глыбоцкая | 100,9 | -285 | 630,2 | 18,8 | 46,9 |
| Гарадоцкая | 101,0 | -292 | 833,9 | 18,4 | 56,2 |
| Докшыцкая | 100,9 | -17 | 647,8 | 17,2 | 58,6 |
| Дубровенская | 110,5 | -509 | 492,1 | 18,2 | 62,5 |
| Лепельская | 100,3 | -309 | 845,8 | 21,1 | 44,0 |
| Лёзненская | 102,1 | 90 | 519,5 | 17,8 | 51,9 |
| Мёрская | 100,6 | -393 | 525,7 | 18,5 | 52,7 |
| Аршанская | 100,4 | -448 | 1366,6 | 20,5 | 32,6 |
| Полацкая | 100,8 | 89 | 1287,3 | 18,3 | 44,9 |
| Пастаўская | 100,1 | -232 | 601,4 | 18,3 | 33,4 |
| Расонская | 99,3 | 34 | 536,7 | 26,0 | 56,7 |
| Сенненская | 100,1 | -125 | 687,5 | 20,2 | 54,2 |
| Талачынская | 100,1 | -232 | 628,6 | 18,0 | 42,4 |
| Ушацкая | 102,4 | -802 | 750,7 | 15,1 | 57,6 |
| Чашніцкая | 101,4 | -180 | 960,5 | 19,0 | 53,3 |
| Шаркаўшчынская | 101,1 | -124 | 635,8 | 17,5 | 61,9 |
| Шумілінская | 99,9 | -148 | 646,0 | 19,8 | 55,1 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **100,8** | **-4764** | **784,3** | **19,1** | **44,7** |
| г.Віцебск | 100,9 | 569 | 3959,0 | 15,2 | 17,6 |
| г.Наваполацк | 100,6 | 213 | 4172,1 | 15,1 | 30,3 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **100,8** | **782** | **4023,9** | **15,2** | **20,3** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **100,8** | **-3982** | **977,3** | **18,1** | **34,5** |
| Абласная б-ка | 93,2 | -841 | 31567,0 | 20,6 | 8,8 |
| **УСЯГО** | **100,2** | **-4823** | **1056,3** | **18,3** | **37,4** |
| 2022 год | 99,5 | | 1058 | 18,3 | 37,6 |

*Дадатак № 5*
*Табліца 5*

## КАРЫСТАЛЬНІКІ

| ЦБС | 2023 | Кольк. жыхароў (тыс.) | Выканана 2022 | КАРЫСТАЛЬНІКІ | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | План 2023 | Выканана / Факт | Рэальныя | Вірт. |
| Бешанковіцкая | 11 | 13653 | 8 745 | 8185 | 8204 | 8026 | 178 |
| Браслаўская | 13 | 23428 | 9 263 | 8830 | 9024 | 9024 | 0 |
| Верхнядзвінская | 17 | 19032 | 10 603 | 10575 | 10595 | 9741 | 854 |
| Віцебская | 21 | 34478 | 13 707 | 13900 | 13614 | 13614 | 0 |
| Глыбоцкая | 25 | 33627 | 16 316 | 15890 | 16031 | 15756 | 275 |
| Гарадоцкая | 14 | 20769 | 12 572 | 12160 | 12280 | 11675 | 605 |
| Докшыцкая | 19 | 21003 | 12 626 | 12500 | 12609 | 12309 | 300 |
| Дубровенская | 17 | 13386 | 8 937 | 7630 | 8428 | 8365 | 63 |
| Лепельская | 16 | 30737 | 14 074 | 13720 | 13765 | 13532 | 233 |
| Лёзненская | 15 | 15022 | 7 770 | 7700 | 7860 | 7793 | 67 |
| Мёрская | 18 | 17961 | 10 145 | 9690 | 9752 | 9462 | 290 |
| Аршанская | 34 | 142331 | 47 113 | 46500 | 46665 | 46465 | 200 |
| Полацкая | 35 | 100316 | 45 774 | 45500 | 45863 | 45056 | 807 |
| Пастаўская | 18 | 32402 | 11 233 | 10990 | 11001 | 10825 | 176 |
| Расонская | 9 | 8523 | 5 301 | 5370 | 5335 | 4830 | 505 |
| Сенненская | 15 | 19035 | 10 615 | 10475 | 10490 | 10312 | 178 |
| Талачынская | 15 | 22218 | 9 888 | 9645 | 9656 | 9429 | 227 |
| Ушацкая | 9 | 11732 | 7 799 | 6835 | 6997 | 6756 | 241 |
| Чашніцкая | 15 | 27047 | 14 643 | 14265 | 14463 | 14408 | 55 |
| Шаркаўшчынская | 13 | 13362 | 8 493 | 8280 | 8369 | 8265 | 104 |
| Шумілінская | 14 | 16418 | 10 350 | 10215 | 10202 | 9044 | 1158 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***363*** | ***636480*** | ***295967*** | **288855** | **291203** | **284687** | **6516** |
| г.Віцебск | 16 | 359148 | 63 552 | 63555 | 64121 | 63344 | 777 |
| г.Наваполацк | 7 | 96320 | 31 238 | 31250 | 31451 | 29205 | 2246 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***23*** | ***455468*** | ***94 790*** | **94805** | **95572** | **92549** | **3023** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **386** | **1091948** | **390757** | **383660** | **386775** | **377236** | **9539** |
| Абласная б-ка | 1 | 359148 | 34 405 | **36000** | 33564 | 31567 | 1997 |
| **УСЯГО** | **387** | **1091948** | **425162** | **419660** | **420339** | **408803** | **11536** |
| 2022 год | 392 | 1103833 | | | 425162 | 414697 | 10465 |



## *Абласны конкурс дзіцячых бібліятэчных гульнявых праграм «Затея»*

Конкурс, які праводзіўся сярод публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, быў прызваны аб’яднаць намаганні спецыялістаў па папулярызацыі сучасных гульнявых тэхналогій у практыцы арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі, а таксама садзейнічаць іх інтэлектуальнаму развіццю і раскрыццю творчых здольнасцей. Ініцыятарамі конкурсу сталі ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» і Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму.

Са студзеня па красавік у гарадскіх і сельскіх бібліятэках вобласці ў рамках конкурсу адбыліся 38 гульнявых праграм, гледачамі якіх сталі больш за 600 дзяцей ва ўзросце ад 4 да 16 гадоў. Матэрыялы, дасланыя ў абласную бібліятэку па выніках праведзеных праграм, – сцэнарый, відэаролік і фотасправаздача – ацэньвала **прафесійнае журы**: Таццяна Адамян, дырэктар ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»; Зоя Гукава, галоўны спецыяліст аддзела работы арганізацый сферы культуры ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта; Алена Сабірава, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму; Святлана Дзядзінкіна, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта; Марыя Ножнікава, выкладчык цыклавой камісіі «Рэжысура і майстэрства акцёра» УА «Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў»; Мікалай Неменаў, рэжысёр Народнага Тэатра гульні ДУ «Цэнтр культуры “Віцебск”»; Алег Рыхтэр, артыст – вядучы майстар сцэны Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Беларускі тэатр “Лялька”».

Паводле вынікаў галасавання журы былі вызначаныя лаўрэаты і ўладальнікі спецыяльных узнагарод.

У намінацыі **«Сярод бібліятэк, размешчаных у горадзе (цэнтральныя раённыя/гарадскія, гарадскія, дзіцячыя)»**: І Прэмія – Шаркаўшчынская дзіцячая бібліятэка ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (фальклорная тэатралізаваная праграма «Ляліны забавы»); ІІ Прэмія – Дзіцячая бібліятэка ДУК «Верхнядзвінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (літаратурнае свята «Падарожжа ў Краіну Цудаў» паводле кніг Льюіса Кэрала); ІІІ Прэмія – Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 ДУК «Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (турнір знаўцаў беларускай мовы «Ад зерня – колас, ад слова – мова»).

У намінацыі **«Сярод бібліятэк, якія знаходзяцца ў пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах»**: І Прэмія – Капцянская сельская бібліятэка ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (гульня-падарожжа «Запрашаем у Беларусь»); ІІ Прэмія – Пагашчанская бібліятэка ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна» (марская вечарынка «Кругасветка з Какосам

Маракосам» паводле казкі Сержа Мінскевіча «Вялікія прыгоды Какоса Маракоса»; III Прэмія – «Старалядненская сельская бібліятэчная сістэма» ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (гульнявая праграма «Мы едзем, едзем, едзем у далёкія краі...»).

Уладальнікамі **спецыяльных прызоў** сталі: «За навацыйныя формы работы і крэатыўны падыход» – Цэнтральная бібліятэка імя А.С. Пушкіна ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (свята «Да здравствуют каникулы!»); «За адлюстраванне ў рабоце мясцовага фальклорнага матэрыялу» – Аддзел па рабоце з дзецьмі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (гульнявая праграма па работах М.Я. Нікіфароўскага «Як на нашым на балоце»); «За творчы падыход і артыстызм» – Вярхоўская сельская бібліятэка ДУК «Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (забаўляльна-гульнявая праграма «Усё пра казкі і не толькі»).

Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў у фармаце фестывальнага дня прайшла ў абласной бібліятэцы з удзелам артыстаў моладзевага тэатра «Кола» Цэнтра культуры «Віцебск», Беларускага тэатра «Лялька», Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікаў абласной бібліятэкі. Свае інтэрактыўныя праграмы для віцебскай аудыторыі прадставілі дзіцячая бібліятэка Верхнядзвінскай ЦБС і цэнтральная бібліятэка імя А.С. Пушкіна Аршанскай ЦБС. За круглым сталом «Тэатралізавана-гульнявыя формы публічных бібліятэк» журы і ўдзельнікі абласнога конкурсу падзяліліся сваімі ўражаннямі, абмеркавалі праблемы, з якімі сутыкнуліся пры падрыхтоўцы дзіцячых гульнявых праграм, пагаварылі аб эфектыўнасці і перспектывах падобных праектаў пры рабоце з маленькімі чытачамі.

## Міжнародныя праекты, акцыі. Бібліятэчнае супрацоўніцтва

Найбольш змястоўнымі міжнароднымі праектамі Віцебскай абласной бібліятэкі ў 2023 годзе сталі X міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край», навукова-практычны семінар «Смаленск – Віцебск: кніжны сусвет без межаў» (сумесна са Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкай імя А.Т. Твардоўскага); міжнародны сеткавы анлайн-праект «Лепшы казачнік свету, Шарль Перо: віртуальнае падарожжа па казках», міжнародны сеткавы лінгвалітаратурны квэст «195 год з Жулем Вернам» (сумесна з Пскоўскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкай імя В.Я. Курбатава); цыкл фотовыстаў (сумесна з Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-заказнікам А.С. Пушкина ”Міхайлаўскае“). Падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Віцебскай абласной бібліятэкай і Прэзідэнцкай бібліятэкай імя Б.М. Ельцына (Санкт-Пецярбург). На працягу года адбыўся шэраг трохбаковых анлайн-сустрэч Віцебскай абласной бібліятэкі з бібліятэкамі гг. Ніжні Ноўгарад (Расія) і Гюмры (Арменія), падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве. Такі ж



| | | | |
|---|---|---|---|
| **Мёрскі**<br>3/0/2 | Дварнасельская<br>Забалоцщеўская<br>Перабродская | | Лявонпальскі цэнтр культуры і вольнага часу<br>Папшулёўскі клуб-бібліятэка |
| **Полацкі**<br>3/1/0 | Дрэтунская,<br>Жарнасецкая,<br>Маласітнянская | Сільніцкая бібліятэка-музей этнаграфіі | |
| **Пастаўскі**<br>0/0/0 | | | |
| **Расонскі**<br>2/0/2 | Бібліятэка-клуб Кавалі<br>Бібліятэка-клуб Забор’е | | Галоўчыцкі,<br>Янкавіцкі |
| **Сенненскі**<br>1/0/2 | Сінягорская | | Канстантоўскі,<br>Першамайскі |
| **Талачынскі**<br>1/0/1 | Дзімітраўская | | Жукнеўскі |
| **Ушацкі**<br>1/0/4 | Жарская | | Дубраўскі,<br>Матырынскі,<br>Селішчанскі,<br>Сарочынскі |
| **Чашніцкі**<br>3/0/2 | Вядрэнская<br>Дварэцкая,<br>Замацкая | | Праземлянскі<br>Чырвонараніцкі |
| **Шаркаўшчынскі**<br>2/0/0 | Буеўшчынская<br>Зоркаўская | | |
| **Шумілінскі**<br>1/0/3 | Каўлякоўская | | Мішкаўскі,<br>Полькавіцкі,<br>Сіроцінскі |
| **УСЯГО**<br>**на 01.01.2023** | **42** | **7** | **41** |
| **на 01.01.2024** | **45** | **3** | **38** |

*Дадатак № 4*
*Табліца 4*

## СПІС БІБЛІЯТЭК ЗМЯШАНАГА ТЫПУ Ў ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

| Рэгіён | Бібліятэкі-клубы | Бібліятэкі-музеі | Клубы-бібліятэкі* (клубная сістэма) |
|---|---|---|---|
| **Аршанскі** 6/0/4 | Андрэеўшчынская, Бабініцкая, Белеўская, Пугляеўская Смалянская Якаўлевіцкая | | Міцкаўшчынскі, Стайкаўскі, Старскі, Юркаўскі |
| **Бешанковіцкі** 0/0/0 | | | |
| **Браслаўскі** 0/0/4 | | | Далёкаўскі, Друйскі, Мількаўскі, Казянскі |
| **Верхнядзвінскі** 3/0/7 | Марозаўская, Стралкоўская, Чыстапольская | | Бялькоўшчынскі, Відокскі, Дзёрнавіцкі, Росіцкі, Прудзінкаўскі, Сакалоўшчынскі, Сенькаўскі |
| **Віцебскі** 1/0/0 | Пестуніцкая | | |
| **Гарадоцкі** 2/0/2 | Руднянская Мяжанская | | Вярэцкі, Марачанскі |
| **Глыбоцкі** 5/0/0 | Абрубская, Бабічоўская, Гатаўшчынская, Івесьская, Карабоўская | | |
| **Докшыцкі** 6/0/4 | Бярозаўская, Гарадзішчанская, Глінская, Замастоцкая, Літоўская, Тумілавіцкая | | Бярозаўскі, Бярэзінскі, Крыпульскі, Таргуноўскі |
| **Дубровенскі** 5/0/0 | Арловіцкая, Баброўская, Рэдзькаўская, Сіпішчаўская, Чырынская | | |
| **Лепельскі** 0/0/0 | | | |
| **Лёзненскі** 0/2/1 | | Кавалёўская сельская бібліятэка-музей Бабінавіцкая сельская бібліятэка-музей | Емельяноўскі |



Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Віцебскай абласной бібліятэкай і цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай Канавінскага раёна г. Ніжняга Ноўгарада быў падпісаны ў аддаленым рэжыме ў маі справаздачнага года.

Павышэнню кваліфікацыі, абмену прафесійным вопытам садзейнічаў удзел супрацоўнікаў бібліятэк вобласці ў міжнародных навуковых канферэнцыях, семінарах і форумах. У красавіку ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы (г. Масква, Расія) праходзіў Міжнародны моладзевы форум «Захаваем гістарычную праўду для будучых пакаленняў», у якім прымала ўдзел намеснік дырэктара Віцебскай абласной бібліятэкі Камендантава Вольга Макараўна з дакладам «Рэсурсныя ваенна-патрыятычныя праекты Віцебскай абласной бібліятэкі». На міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «25 гадоў Першаму публічнаму Цэнтру прававой інфармацыі ў Расіі: сацыяльнае партнёрства і эфектыўнасць узаемадзеяння» (г. Смаленск) намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Вольга Камендантава прадставіла даклад «Вопыт работы публічных бібліятэк Віцебскай вобласці па прававой асвеце насельніцтва».

На Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Яраслаў Мудры. Праблемы вывучэння, захавання і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны», якая праходзіла ў цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя Яраслава Мудрага г. Яраслаўля, загадчык інфармацыйна-бібліяграфічным аддзелам цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Ф. Скарыны Полацкай РЦБС В. Прыданава выступіла з дакладам «Краязнаўчая дзейнасць як спосаб папулярызацыі бібліятэкі».

У Міжгарадской праваслаўнай краязнаўчай канферэнцыі «Мінулае і сучаснае праваслаўя Комі зямлі» арганізатарамі якой выступіла МУ «Цэнтральная біблятэка МОГО Ухта», прыняла ўдзел дырэктар Глыбоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі Валянціна Спасібёнак з дакладам «Сцяжынка да духоўных вытокаў». На анлайн-семінары МКУК «Цэнтралізаваная гарадская бібліятэчная сістэма» г. Астрахані «Віртуальныя рэсурсы бібліятэкі як інструмент прыцягнення ўвагі да бібліятэкі» выступіла загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска І. Хомчанка з дакладам «Электронныя рэсурсы бібліятэкі: перспектыва, магчымасці і рэальнасць». Бібліёграф інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Ф. Скарыны Полацкай РЦБС Г. Нэліна выступіла з дакладам «Школа юнага касманаўта ў бібліятэцы» на Міжрэгіянальным краязнаўчым форуме «Бібліятэка і космас: інфармацыя, культура, асветніцтва», які быў арганізаваны бібліятэкай-філіалам № 4 імя В. Церашковай Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Яраслаўля. Цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф. Скарыны Полацкай РЦБС на круглым стале «Руская мова ў міжкультурнай камунікацыі ў краінах Садружнасці» ў рамках міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Румянцаўскія чытанні» (г. Масква) прадставіла галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Кацярына Багданава з анлайн-дакладам «Руская мова як асноўны камунікатыўны сродак у краінах бліжняга замежжа».

Літаратурныя фестывалі і форумы аб’ядноўвалі паэтаў і празаікаў Беларусі і Расіі. У VI Літаратурным форуме «Цэнтр Еўропы», што ладзіўся ў Полацку напрыканцы мая, прымалі ўдзел прадстаўнікі літаратурных аб’яднанняў Беларусі, а таксама гг. Яраслаўль і Вялікія Лукі; у рамках мерапрыемства прайшоў круглы стол «Горад, што ў сэрцы маім». Сёмая Літаратурная прэмія імя Алеся Савіцкага была ўручана ў Полацку 15 верасня, у мерапрыемстве прынялі ўдзел больш 40 літаратараў з Беларусі, Расіі, Казахстана. У рамках міжнароднага музычнa-паэтычнага фестывалю «Мая любоў, родная Беларусь», арганізатарам якога выступіў Бібліятэчна-культурны комплекс імя А.В. Малчанава (г. Санкт-Пецярбург), удзельнікі студыі паэтычнай творчасці «Сустрэчы для душы» Глыбоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі прадэкламавалі аўтарскія вершы. Члены народнага аматарскага аб’яднання «Пад абажурам» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прымалі ўдзел у XI паэтычным фестывалі «Руднянскія зоры» і ў юбілейным штогадовым міжнародным паэтычным конкурсе «БібліяПарнас-2023» (г. Смаленск).

Бібліятэкі вобласці працягвалі супрацоўніцтва з гарадамі і рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. У акцыі «Чытаем Грыгор’ева разам», арганізаванай Бібліятэкай-Цэнтрам зносін і інфармацыі імя І.Н. Грыгор’ева ЦБС г. Пскова, прынялі ўдзел бібліятэкі-філіялы ЦБС Браслаўскага раёна і супрацоўнікі Гарадоцкага культурна-асветніцкага цэнтра і сеткі публічных бібліятэк. У праекце «Чытаем разам. Мой любімы верш», які быў ініцыяваны Пскоўскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкай імя В.Я. Курбатава і Віцебскай абласной бібліятэкай імя У.І. Леніна, прынялі ўдзел самадзейны паэт, удзельнік народнага аматарскага аб’яднання «Пад абажурам» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Р. Кузняцоў, бібліятэкары і чытачы бібліятэкі № 12, Дачнінскай сельскай бібліятэкі Аршанскай ЦБС, філіяла «Асінторфская сельская бібліятэка – цэнтр экалагічнай асветы» Дубровенскай ЦБС. Падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай г. Пскова і ЦБС г. Віцебска.

У Міжнародным творчым інтэрнэт-конкурсе «Сэрца, адкрытае людзям», прысвечаным пісьменнікам-юбілярам 2023 года, арганізаваным Дзяржаўнай казённай установай культуры «Чалябінская абласная бібліятэка для моладзі», ЦБС г. Магілёва, ЦБС Петрадварцовага раёна Санкт-Пецярбурга, прынялі ўдзел супрацоўнікі Верхнядзвінскай цэнтральная раённай бібліятэкі імя Т. Хадкевіча і бібліятэкі імя Я. Коласа Аршанскай ЦБС, чытачы Багушэўскай гарпасялковай бібліятэкі, Багданаўскай сельскай бібліятэкі Сенненскай ЦБС.

У кастрычніку загадчык аддзелам абслугоўвання дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка Анастасія Крупко і загадчык бібліятэкай-філіялам № 20 імя Е. Полацкай ЦБС г. Віцебска Любоў Забалоцкая прымалі ўдзел у праграме, распрацаванай Камітэтам па знешнім сувязям Санкт-Пецярбурга сумесна з Цэнтральнай гарадской публічнай бібліятэкай імя У. Маякоўскага і накіраванай на павышэнне



*Дадатак № 3*
*Табліца 3*

## ІНТЭГРАВАНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ (АБ’ЯДНАНЫЯ ПУБЛІЧНЫЯ І ШКОЛЬНЫЯ)

На 01.01.2023 г. у Віцебскай вобласці функцыянавала 18 інтэграваных устаноў. Па стане на 01.01.2024 г. дзейнічаюць 17 інтэграваных бібліятэк.

### Спіс інтэграваных (аб’яднаных) бібліятэк

| | Рэгіён | Назва населенага пункта | Назва аб’яднанай бібліятэкі |
|---|---|---|---|
| | *Бібліятэкі сеткі Міністэрства культуры* | | |
| 1 | **Браслаўскі** | в. Дрысвяты | Дрысвяцкая бібліятэка-філіял № 52 |
| 2 | Браслаўскі | в. Плюсы | Плюская бібліятэка-філіял № 21 |
| 3 | **Верхнядзвінскі** | аг. Каханавічы | Каханавіцкая бібліятэка-філіял № 29 |
| 4 | **Лепельскі** | в. Вялікі Полсвіж | Полсвіжская сельская бібліятэка-філіял № 27 |
| 5 | **Аршанскі** | аг. Барздоўка | Барздоўская сельская бібліятэка-філіял № 23 |
| 6 | **Полацкі** | в. Бабынічы | Бабыніцкая бібліятэка-клуб |
| 7 | Полацкі | в. Варонічы | Вароніцкая бібліятэка-філіял № 17 |
| 8 | Полацкі | аг. Мацюшы | Мацюшэўская бібліятэка-філіял № 7 |
| 9 | Полацкі | в. Шпакоўшчына | Шпакоўшчынская бібліятэка-клуб |
| 10 | Полацкі | аг. Гараны | Гаранская бібліятэка-філіял № 26 |
| 11 | Полацкі | аг. Завозер’е | Завзерская бібліятэка-філіял № 31 |
| 12 | Полацкі | аг. Зялёнка | Зялёнкаўская бібліятэка-філіял № 33 |
| 13 | Полацкі | аг. Кушлікі | Кушлікоўская бібліятэка-філіял № 5 |
| 14 | Полацкі | аг. Палата | Палатоўская бібліятэка-філіял № 61 |
| 15 | Полацкі | г. Полацк | Бібліятэка-філіял № 5 |
| 16 | **Сенненскі** | аг. Ходцы | Ходцаўская сельская бібліятэка-філіял № 50 |
| | *Бібліятэкі сеткі Міністэрства адукацыі* | | |
| 17 | **г. Віцебск** | п. Вярхоўе | Бібліятэка ДУА «Сярэдняя школа № 9 г.Віцебска» |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Лепельскі | Велеўшчанская сельская бібліятэка-клуб – філіял № 8 рэарганізавана з 01.12.2023 | **Велеўшчанская сельская бібліятэка – філіял № 8** | рэарганізацыя | Рашэнне Лепельскага РВК № 1038 п.1.1 ад 27.09.23 |
| | Чарэйшчынская сельская бібліятэка-музей вёскі – філіял № 3 рэарганізавана з 01.12.2023 | **Чарэйшчынская сельская бібліятэка – філіял № 3** | рэарганізацыя | Рашэнне Лепельскага РВК № 1038 п.1.1 ад 27.09.23 |
| | Баброўская сельская бібліятэка-музей Я.Мароза – філіял № 5 рэарганізавана з 01.12.2023 | **Баброўская сельская бібліятэка – філіял № 5** | рэарганізацыя | Рашэнне Лепельскага РВК № 1038 п.1.1 ад 27.09.23 |
| | Каменская сельская бібліятэка-музей Т.Кляшторнага – філіял № 21 рэарганізавана з 01.12.2023 | **Каменская сельская бібліятэка – філіял № 21** | рэарганізацыя | Рашэнне Лепельскага РВК № 1038 п.1.1 ад 27.09.23 |
| Пастаўскі (-1) | **Мулярская** сельская бібліятэка-філіял № 46 закрыта 31.07.2023 | | закрыццё | Рашэнне Пастаўскага РВК № 328 ад 21.03.2023 |
| Расонскі | Філіял № 10 Заборская сельская бібліятэка рэарганізавана з 01.09.2023 | **Бібліятэка-клуб Забор'е** | рэарганізацыя | Загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Расонскага РВК № 50 ад 26.06.2023 |
| Чашніцкі (-1) | Чырвонараніцкая сельская бібліятэка-клуб закрыта з 18.07.2023 | **Чырвонараніцкі сельскі клуб-бібліятэка** | закрыццё<br>рэарганізацыя | Загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чашніцкага РВК № 19 ад 17.05.2023 |
| Шаркаўшчынскі (-1) | **Верацееўская** сельская бібліятэка закрыта з 01.06.2023 | | закрыццё | Рашэнне Шаркаўшчынскага РВК № 365 ад 19.04.2023 |
| **АДКРЫТА** | | | | |
| Глыбоцкі (+1) | Філіял № 8 Гатаўшчынскі сельскі клуб-бібліятэка рэарганізаваны з 01.12.2023 | **Філіял № 17 Гатаўшчынская сельская бібліятэка-клуб** | адкрыццё<br>рэарганізацыя | Рашэнне Глыбоцкага РВК № 1123 ад 28.09.2023 |
| **УСЯГО** | адкрыта – **1**; закрыта – **6** | | | |



прафесійнага ўзроўню рускамоўных кадраў бібліятэчных устаноў за мяжой.

У рамках міжнароднага супрацоўніцтва адбыўся тэлемост «Расцім чытача разам» паміж супрацоўнікамі дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка і бібліятэкарамі Муніцыпальнай установы «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» гарадской акругі Электрасталь Маскоўскай вобласці. Тэмай дыялогу сталі пытанні сямейнага чытання.

Бібліятэкі Полацкай РЦБС прымалі ўдзел у анлайн-акцыях #ДниЯрославаМудрого, «Перекличка городов и сел #НашеНаследие», якія ініцыявала Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя Яраслава Мудрага (г. Яраслаўль, Расія).

Мастацкая выстава «Фларыстычны калаж» была арганізавана пры падтрымцы Міжнароднай асацыяцыі «Фларысіма» (г. Масква) у Кіраўскай сельскай бібліятэцы Віцебскай РЦБС Удзельнікамі сустрэчы сталі Прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі «Фларысіма» (г. Масква) І. Макеева, мастакі з Расіі і Беларусі, якія з’яўляюцца членамі асацыяцыі.

## Навукова-даследчая і метадычная дзейнасць бібліятэк

Дзейнасць аддзелаў і сектараў маркетынгу і сацыяльна-культурнай дзейнасці цэнтральных раённых бібліятэк у 2023 годзе была накіравана на каардынацыю работы бібліятэк сістэмы, метадычнае забеспячэнне іх прафесійнай дзейнасці, вывучэнне і распрацоўку сучасных перадавых напрамкаў у рабоце; павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў, умацаванне сувязей з грамадскасцю і СМІ, стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэк. Супрацоўнікі аддзелаў аказвалі кансультацыйна-метадычную дапамогу ў рэалізацыі планаў і мэтавых праграм бібліятэк, творчых праектаў, адказвалі за своечасовае напаўненне актуальнымі матэрыяламі афіцыйных сайтаў ЦБС і вядзенне старонак бібліятэк ў сацыяльных сетках.

Узровень прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў вызначае якасць і эфектыўнасць дзейнасці бібліятэк. На працягу года арганізоўвалася бесперапыннае павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэчных сістэм праз правядзенне семінараў, практыкумаў, круглых сталоў, дзён метадычнай дапамогі. На пачатку года ва ўсіх сістэмах прайшлі раённыя семінары, на якіх былі падведзены вынікі мінулага года і акрэслены арыенціры на будучае. На працягу года адбываліся семінары і круглыя сталы разнастайнай тэматыкі: «Аматарскае аб’яднанне ў бібліятэцы: значэнне, віды, арганізацыя, вядзенне дакументаў» (Бешанковіцкая ЦБС), «Бібліятэка ў адкрытай прасторы: новыя формы работы», выязны семінар «Сельская бібліятэка: новы вобраз, новыя прыярытэты» (Глыбоцкая ЦБС), «Бібліятэка ў сістэме экалагічнай асветы дзяцей і моладзі» (ЦБС г. Віцебска), «Краязнаўчая дзейнасць у сучасных умовах» (Докшыцкая ЦБС), «Правядзенне масавых мерапрыемстваў у рамках Года міру і стварэння» (Аршанская ЦБС), «Фарміруем наша будучае: дзеці і моладзь у бібліятэцы» (Сенненская ЦБС), «Чытанне з захапленнем: арганізацыя і

правядзенне мерапрыемстваў вулічнага фармату» (Шумілінская ЦБС), «Светлы мір народнай культуры», «Работа па абслугоўванню сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва» (Дубровенская ЦБС), «Асаблівы чытач у бібліятэцы: рэаліі, перспектывы, магчымасці» (Чашніцкая РЦБС) і інш. У студзені ў Пастаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся брэйнстормінг «Праектная дзейнасць у бібліятэцы», на якім былі разгледжаны тэарэтычны аспект бібліятэчных праектаў, афармленне дакументацыі, адбылося знаёмства з праектамі, якія рэалізуюцца ў іншых бібліятэках рэспублікі. У кастрычніку на базе дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка была арганізавана дыялогавая пляцоўка, на якой прайшло абмеркаванне розных аспектаў сямейнага чытання і ролі бібліятэкі ў ім. Напрыканцы года ва ўсіх бібліятэчных сістэмах адбыліся семінары, на якіх былі падведзены вынікі года, праведзены кансультацыі па запаўненні новых форм прадстаўлення дзяржаўнай статыстычнай інфармацыі. Усяго на працягу 2023 года ў бібліятэках вобласці было праведзена 152 такіх мерапрыемстваў.

У бібліятэках Докшыцкай, Пастаўскай, Лепельскай, Ушацкай ЦБС ладзіліся школы прафесійнага майстэрства, на пасяджэннях якіх разглядаліся пытанні работы ў сацыяльных сетках, аспекты бібліяграфічнай дзейнасці, асаблівасці стварэння публікацый для сайта, праводзіліся агляды прафесійнага перыядычнага друку, кансультацыі па камп’ютарнай граматнасці.

Сярод іншых форм павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў – кансультацыі і метадычныя парады. За год супрацоўнікамі аддзелаў маркетынгу дадзена 223 групавыя кансультацыі і 3,2 тыс. індывідуальных. З мэтай вывучэння стану работы і аказання метадычнай дапамогі па вядзенні дакументацыі, афармленні бібліятэчнай прасторы супрацоўнікамі аддзелаў маркетынгу здзейснены 773 выезды і 993 наведванні бібліятэк вобласці. За справаздачны год наведана амаль кожная падведамасная бібліятэка.

Кожны месяц праводзіліся нарады бібліятэкараў сістэмы па розных прафесійных пытаннях, рыхтаваліся даведкі, справаздачы, агляды, планы для вышэйстаячых арганізацый па іх запытах. На працягу года аддзеламі маркетынгу кожнай бібліятэчнай сістэмы вобласці падрыхтавана ў сярэднім 270 аналітычных, арганізацыйных, статыстычных матэрыялаў і дакументаў. На нарадах пры дырэктары, якіх на працягу года адбылося больш за 100, разглядаліся пытанні выканання планавых паказчыкаў, дзейнасці цэнтраў прававой інфармацыі, арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў у бібліятэцы, работы аматарскіх аб’яднанняў, бібліятэчнага краязнаўства, планавання сацыякультурнай дзейнасці бібліятэчных сістэм.

На працягу года работнікі аддзелаў маркетынгу займаліся выпускам друкаванай прадукцыі ў дапамогу бібліятэкарам: метадычных рэкамендацый, парад, дапаможнікаў. Усяго ў бібліятэках вобласці было выдадзена 148 метадычных выданняў.

Пошуку новых форм і метадаў работы з чытачамі, стварэнню прывабнага вобразу бібліятэкі спрыялі агляды-конкурсы па самых розных



*Дадатак № 2*
*Табліца 2*

## РЭАРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІЎ 2023 ГОДЗЕ

По стане на 31.12.2023 – **387** публічных бібліятэк (разам з абласной).

| Раён | Назва ўстановы, якая была аптымізавана | Новы тып установы | Від аптымі-зацыі | Нумары і даты рашэнняў |
|---|---|---|---|---|
| Аршанскі | Бабініцкая сельская бібліятэка рэарганізавана з 31.01.2023 | **Бабініцкая сельская бібліятэка-клуб** | рэаргані-зацыя | Рашэнне Аршанскага РВК №159 ад 31.01.2023 |
| Бешанковіцкі (-2) | Філіял ”**Бешанковіцкая гарпасялковая** бібліятэка“ закрыта з 01.01.2023 | | закрыццё | Загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага РВК № 30 ад 08.11.2022 |
| | **Дзіцячая** раённая бібліятэка рэарганізавана з 01.07.2023 | | рэаргані-зацыя ў **сектар** па абслугоў ванні дзіцячага чытача ЦРБ | Загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага РВК № 19 ад 16.06.2023 |
| Віцебскі (-1) | **Тулаўская** сельская бібліятэка закрыта з 01.07.2023 | | закрыццё | Рашэнне Віцебскага РВК № 982 ад 02.06.2023 |
| Глыбоцкі | Філіял № 49 ”Івеськая сельская бібліятэка“ рэарганізавана з 01.12.2023 | **Філіял № 49 Івеськая сельская бібліятэка-клуб** | рэаргані-зацыя | Рашэнне Глыбоцкага РВК № 1123 ад 28.09.2023 |
| | Філіял № 13 ”Азярэцкая сельская бібліятэка-музей этнаграфіі“ рэарганізаваны з 01.12.2023 | **Філіял № 13 Азярэцкая сельская бібліятэка** | рэаргані-зацыя | Рашэнне Глыбоцкага РВК № 1123 ад 28.09.2023 |
| Докшыцкі | Глінская сельская бібліятэка філіял № 56 рэарганізавана з 01.01.2023 | **Глінская сельская бібліятэка-клуб філіял № 56** | рэаргані-зацыя | Рашэнне Докшыцкага РВК № 1222 ад 23.12.2022 |

*Працяг табліцы 1*

| ЦБС | б-кі на 0,75 стаўкі | б-кі на 0,5 стаўкі | б-кі на 0,25 стаўкі | % ахопу бібл. абсл. | ЗМЯШАНАГА ТЫПУ (усяго) | | | **Інтэграваныя** | **Бібліёбус** | **Бібл. пункты** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | Б-кі-клубы | Б-кі-музеі | Клубы-б-кі | | | |
| Бешанковіцкая | 3 | 1 | 0 | 58,8 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 |
| Браслаўская | 4 | 0 | 0 | 38,5 | 0 | 0 | 4 | 2 | 1 | 0 |
| Верхнядзвінская | 1 | 2 | 0 | 51,2 | 3 | 0 | 7 | 1 | 1 | 0 |
| Віцебская | 3 | 0 | 0 | 39,5 | 1 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 |
| Глыбоцкая | 1 | 2 | 0 | 46,9 | 5 | 0 | 0 | 0 | 1 | 22 |
| Гарадоцкая | 3 | 1 | 0 | 56,2 | 2 | 0 | 2 | 0 | 1 | 1 |
| Докшыцкая | 1 | 1 | 0 | 58,6 | 6 | 0 | 4 | 0 | 1 | 0 |
| Дубровенская | 4 | 1 | 0 | 62,5 | 5 | 0 | 0 | 0 | 1 | 2 |
| Лепельская | 0 | 1 | 0 | 44,0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 4 |
| Лёзненская | 5 | 2 | 0 | 51,9 | 0 | 2 | 1 | 0 | 1 | 0 |
| Мёрская | 0 | 0 | 0 | 52,7 | 3 | 0 | 2 | 0 | 0 | 5 |
| Аршанская | 1 | 1 | 0 | 32,6 | 6 | 0 | 4 | 1 | 1 | 0 |
| Полацкая | 2 | 0 | 0 | 44,9 | 3 | 1 | 0 | 10 | 1 | 2 |
| Пастаўская | 3 | 1 | 0 | 33,4 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 2 |
| Расонская | 1 | 0 | 0 | 56,7 | 2 | 0 | 2 | 0 | 1 | 0 |
| Сенненская | 1 | 0 | 0 | 54,2 | 1 | 0 | 2 | 1 | 1 | 0 |
| Талачынская | 2 | 3 | 0 | 42,4 | 1 | 0 | 1 | 0 | 1 | 0 |
| Ушацкая | 0 | 0 | 0 | 57,6 | 1 | 0 | 4 | 0 | 0 | 0 |
| Чашніцкая | 0 | 2 | 0 | 53,3 | 3 | 0 | 2 | 0 | 1 | 1 |
| Шаркаўшчынская | 2 | 0 | 0 | 61,9 | 2 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Шумілінская | 2 | 0 | 0 | 55,1 | 1 | 0 | 3 | 0 | 1 | 1 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **39** | **18** | **0** | **44,7** | **45** | **3** | **38** | **16** | **18** | **41** |
| г.Віцебск | 0 | 0 | 0 | 17,6 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 19 |
| г.Наваполацк | 0 | 0 | 0 | 30,3 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **0** | **0** | **0** | **20,3** | **0** | **0** | **0** | **1** | 0 | **19** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **39** | **18** | **0** | **34,5** | **45** | **3** | **38** | **17** | **18** | **60** |
| Абласная б-ка | 0 | 0 | 0 | 8,8 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| **УСЯГО** | **39** | **18** | **0** | **37,4** | **45** | **3** | **38** | **17** | 18 | **60** |
| 2022 год | **41** | **17** | **0** | **37,6** | **42** | **7** | **41** | **18** | **18** | **72** |



напрамках бібліятэчнай дзейнасці. У Бешанковіцкай ЦБС праведзены раённыя конкурсы прафесійнага майстэрства «Лепшы бібліятэчны праект» і «Бібліятэчная прастора: позірк па-новаму». З мэтай павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк ЦБС г. Віцебска адбыліся гарадскі агляд-конкурс «Лепшая бібліятэка», конкурс буктрэйлераў па творах пісьменнікаў Віцебшчыны «Ведай нашых! Чытай нашых!». У летні перыяд у Глыбоцкай ЦБС праходзіў конкурс на лепшае бібліяграфічнае выданне для дзяцей «Вышэйшы пілатаж». Для стымулявання творчай і дзелавой актыўнасці бібліятэчных спецыялістаў у Полацкай РЦБС былі арганізаваны конкурсы «Лепшая публікацыя ў СМІ» і «Гульнятэка ў бібліятэку». Бібліятэкі Пастаўскай ЦБС прынялі ўдзел у раённых конкурсах на лепшы рэкамендацыйны спіс для сямейнага чытання «Папа, мама, я – чытаючая сям'я» і фотаконкурсе «Бібліятэкар у вобразе літаратурнага героя». Раённы прафесійны конкурс «Я снова открываю Льва Толстого» на лепшае масавае мерапрыемства, прысвечанае 195-годдзю з дня нараджэння пісьменніка, быў арганізаваны ў Талачынскай ЦБС. На працягу 2023 года ў Шаркаўшчынскай ЦБС праходзілі 2 раённыя конкурсы «Лепшы рэкламны прадукт па папулярызацыі кнігі і чытання» і конкурс на лепшую краязнаўчую выставу, прысвечаную гісторыі ўтварэння і развіцця калгасаў на зямлі шаркаўшчынскай «Сапраўдныя чараўнікі роднай зямлі».

Прыцягненню новых карыстальнікаў спрыяе **рэкламная дзейнасць бібліятэк**. Значная ўвага ў справаздачным годзе надзялялася арганізацыі бібліятэчнай прасторы, афармленню кніжных выстаў. Акрамя таго, бібліятэкі прымалі актыўны ўдзел у агульнагарадскіх і раённых мерапрыемствах, прысвечаных значным датам календара (Дню Перамогі, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Міжнароднаму дню аховы дзяцей, масленіцы), спартыўных мерапрыемствах (Віцебская і Гарадоцкая лыжня, Кубак льва – 2023), што спрыяе прыцягненню ўвагі да бібліятэк.

Супрацоўнікамі аддзела маркетынгу Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі на XXX юбілейным Дні беларускага пісьменства, што праходзіў ў Гарадку, арганізавана інтэрактыўная пляцоўка «Тарасава сядзіба». Аддзелам маркетынгу Докшыцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтаваны два брэндавыя раённыя мерапрыемствы «Бярозавы сок – здароўя глыток» і «Ручнік як лёс». Пры непасрэдным удзеле супрацоўнікаў аддзела маркетынгу Аршанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі быў праведзены шэраг культурна-забаўляльных праграм, акцый, праектаў: конкурсна-гульнявая праграма «Зіму праводзім, вясну сустракаем», адкрыццё новага сезона ў гарадскім дзіцячым парку «Казачная краіна», бібліялакацыя ў гарадскім парку да Дня Перамогі, летнія праекты «Лета з добрай кнігай», «Праздник-проказник», свята паэзіі ў Ляўках «Купала заўсёды ў сэрцы маім», «Нясумны вечар у бібліятэцы 2023». Інавацыйным у 2023 годзе для аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі імя У. Маякоўскага ЦБС г. Наваполацка стала арганізацыя марафону забаў «Книга, спорт, игра – УРА!» для ўдзельнікаў Спартакіяды Саюзнай дзяржавы.

Аддзеламі маркетынгу курыруецца работа, звязаная са

святкаваннем Дня бібліятэк – штогод у гэты вераснёвы дзень кожная цэнтральная раённая бібліятэка рыхтуе маштабнае свята для сваіх чытачоў.

Адным са сродкаў распаўсюджвання інфармацыі аб бібліятэцы з'яўляецца прэса. Матэрыялы, прысвечаныя дзейнасці бібліятэк, публікаваліся ў справаздачным годзе на старонках прафесійных часопісаў «Бібліятэчны свет» і «Бібліятэка прапануе», газет «Культура», «Віцьбічы», «Витебские вести», «Сельская газета», раённых газет. На працягу 2023 года было надрукавана 782 публікацыі аб дзейнасці бібліятэк, з іх 717 – у мясцовым друку. Пяру саміх супрацоўнікаў бібліятэк належыць 151 публікацыя, сярод іх – 17 артыкулаў у прафесійных выданнях. На працягу года бібліятэкары з'яўляліся ў эфіры радыё (5 выступленняў) і тэлебачання (12 выступленняў). Найбольш актыўнымі ва ўзаемадзеянні са сродкамі масавай інфармацыі ў 2023 годзе былі спецыялісты Віцебскай абласной бібліятэкі, Браслаўскай, Глыбоцкай, Лёзненскай, Лепельскай, Мёрскай, Аршанскай, Полацкай, Сенненскай, Чашніцкай бібліятэчных сістэм, ЦБС г. Наваполацка.

## АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

Жыццё бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2023 годзе было напоўнена культурна-асветніцкімі падзеямі і мерапрыемствамі, накіраванымі на папулярызацыю кнігі і чытання. На працягу года тэма міру і стварэння гучала на дыялогавых пляцоўках, круглых сталах і семінарах, а сацыякультурная дзейнасць бібліятэк праходзіла ў пошуку новых форм узаемадзеяння з карыстальнікамі і раскрыцці творчага патэнцыялу. Усяго ў бібліятэках вобласці праведзена 29,1 тыс. мерапрыемстваў, у тым ліку 20,5 тыс. – для дзяцей і падлеткаў.

### Сацыякультурныя мерапрыемствы і праекты да Года міру і стварэння

У рамках Года міру і стварэння ў бібліятэках Віцебскай вобласці прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя знакавым падзеям у гісторыі Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на выхаванне патрыятызму, гонару за дзяржаву, яе гісторыю і культуру, забеспячэнне міру і згоды ў беларускім грамадстве. Інфармацыя пра Год міру і стварэння была размешчана на інфармацыйных стэндах бібліятэк Віцебскай вобласці, афармляліся тэматычныя папкі, праведзеныя мерапрыемствы шырока асвячаліся на афіцыйных сайтах і ў сацыяльных сетках.

Бібліятэкі працягвалі працу ў рамках праграм і праектаў, мэтай якіх з'яўлялася ўмацаванне сярод насельніцтва ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы («Мая Радзіма – Беларусь» у ЦБС Браслаўскага раёна, «Каб на зямлі асобай стаць, не трэба толькі нарадзіцца» ў Глыбоцкай ЦБС, «Сохраняя память» у Докшыцкай ЦБС,



# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*
*Табліца 1*

**СЕТКА ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

| ЦБС | 2022 | 2023 | у аграгарадках | цэнтральных | гарадскіх | гарпасялковых | дзіцячых | сельскіх | штатныя адзінкі 2022 | штатныя адзінкі 2023 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бешанковіцкая | 13 | 11 | 9 | 1 | 0 | 0 | 0 | 10 | 44,25 | 43,50 |
| Браслаўская | 13 | 13 | 10 | 1 | 0 | 1 | 1 | 10 | 44,00 | 44,00 |
| Верхнядзвінская | 17 | 17 | 8 | 1 | 0 | 1 | 1 | 14 | 43,25 | 43,25 |
| Віцебская | 22 | **21** | 14 | 1 | 0 | 2 | 0 | **18** | 50,00 | 47,50 |
| Глыбоцкая | 24 | 25 | 16 | 1 | 0 | 1 | 2 | 21 | 70,75 | 81,75 |
| Гарадоцкая | 14 | 14 | 8 | 1 | 0 | 1 | 0 | 12 | 57,50 | 57,50 |
| Докшыцкая | 19 | 19 | 10 | 1 | 0 | 1 | 1 | 16 | 63,25 | 65,00 |
| Дубровенская | 17 | 17 | 15 | 1 | 1 | 0 | 0 | 15 | 60,53 | 60,53 |
| Лепельская | 16 | 16 | 8 | 1 | 0 | 0 | 1 | 14 | 52,00 | 52,00 |
| Лёзненская | 15 | 15 | 12 | 1 | 0 | 1 | 0 | 13 | 50,00 | 47,50 |
| Мёрская | 18 | 18 | 9 | 1 | 1 | 0 | 1 | 15 | 47,75 | 47,75 |
| Аршанская | 34 | 34 | 13 | 1 | 8 | 2 | 2 | 21 | 153,25 | 153,25 |
| Полацкая | 35 | 35 | 14 | 1 | 6 | 2 | 2 | 24 | 144,50 | 145,25 |
| Пастаўская | 19 | 18 | 7 | 1 | 1 | 2 | 1 | 13 | 52,22 | 51,36 |
| Расонская | 9 | 9 | 6 | 1 | 0 | 0 | 0 | 8 | 27,25 | 29,25 |
| Сенненская | 15 | 15 | 11 | 1 | 0 | 1 | 1 | 12 | 43,50 | 44,50 |
| Талачынская | 15 | 15 | 11 | 1 | 0 | 1 | 1 | 12 | 47,75 | 47,25 |
| Ушацкая | 9 | 9 | 6 | 1 | 0 | 0 | 0 | 8 | 28,85 | 28,85 |
| Чашніцкая | 16 | 15 | 8 | 1 | 1 | 0 | 2 | 11 | 50,50 | 49,00 |
| Шаркаўшчынская | 14 | 13 | 9 | 1 | 0 | 0 | 1 | 11 | 39,88 | 38,88 |
| Шумілінская | 14 | 14 | 8 | 1 | 0 | 2 | 1 | 10 | 42,25 | 42,50 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **368** | **363** | **212** | **21** | **18** | **18** | **18** | **288** | **1213,23** | **1220,37** |
| г.Віцебск | 16 | 16 | 0 | 1 | 10 | 0 | 5 | 0 | 148,50 | 148,50 |
| г.Наваполацк | 7 | 7 | 0 | 1 | 4 | 0 | 2 | 0 | 91,50 | 91,50 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **23** | **23** | **0** | **2** | **14** | **0** | **7** | **0** | **240,00** | **240,00** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **391** | **386** | **212** | **23** | **32** | **18** | **25** | **288** | **1453,23** | **1460,37** |
| Абласная б-ка | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 141,50 | 140,00 |
| **УСЯГО** | **392** | **387** | **212** | **23** | **32** | **18** | **25** | **288** | **1594,73** | **1600,37** |
| 2022 год | | -5 | 211 | 23 | 32 | 19 | 26 | 291 | | +5,64 |

***У 2023 годзе Цэнтральная раённая бібліятэка Віцебскага раёна пераехала ў будынак у пас. Тулава (сельская мясцовасць).**




**ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Раённы конкурс чытальнікаў «Нам свет завешчана берагчы»
у рамках фестывалю Васіля Цяпінскага







**ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Народны калектыў «Літаратурна – музычная гасцёўня «Крыніца»,
тэматычная пляцоўка «Абрус маёй краіны»



«Я вырос здесь и край мне этот дорог» у Полацкай РЦБС. У Відзаўскай бібліятэцы ЦБС Браслаўскага раёна актыўна рэалізаваўся школьна-бібліятэчны грамадзянска-патрыятычны праект «Жыву ў Беларусі – і тым ганаруся», у рамках якога былі праведзены гісторыка-інфармацыйная гадзіна «Гістарычны шлях і развіццё сінявокай Віцебшчыны за 85 гадоў», бліц-віктарына «Аб Віцебшчыне, пра Віцебшчыну». Ушацкая ЦБС працавала па праекце «Беларусь – мая краіна», які ўключаў акцыі і мерапрыемствы ваенна-патрыятычнага характару, ініцыяваныя раённай бібліятэкай і рэалізаваныя ў творчай садружнасці з культурнымі і адукацыйнымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі раёна.

Тэма мірнага жыцця і захавання гістарычнай памяці прасочвалася на уроках ведаў «Як хораша пад мірным небам жыць» (ЦБС Браслаўскага раёна), «Беларусь і я – дыялог міру і стварэння» (Ушацкая ЦБС); літаратурна-музычных вечарынах «Застаўся ў сэрцы вечны след вайны…» (Аршанская ЦБС), «Мару, каб мір быў з вайной не знаёмы» (Чашніцкая РЦБС); «Мы о войне стихами говорим» (Полацкая РЦБС); «Вы мужнасць, як сцяг, зберaглі» (Віцебская РЦБС); інтэлектуальных гульнях «Хатынь. Трагедыя беларускага народа» (ЦБС г. Наваполацка); «Будем Родину любить, будем Родине служить!» (ЦБС Расонскага раёна); акцыях «Без міру немагчыма стварэнне» (Пастаўская РЦБС); «Голуб міру» (Талачынская ЦБС). У Верхнядзвінскай ЦБС адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці народа».

Ладзіліся сацыякультурныя мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю дзяржаўных сімвалаў, дзяржаўнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у бібліятэках вобласці прайшлі гутаркі і пазнавальныя гадзіны «Асноўны закон нашай краіны» (ЦБС Браслаўскага раёна); «Беларусь – краіна маёй будучыні» (ЦБС г. Віцебска); «Рэспубліка Беларусь, сімвалы дзяржавы» (Пастаўская РЦБС); «Асоба, грамадства, дзяржава» (Шаркаўшчынская ЦБС); «Закон для ўсіх і для кожнага» (Віцебская РЦБС); «Па Канстытуцыі жыве мая краіна» (ЦБС Расонскага раёна).

Да Дня Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь праведзены патрыятычныя гадзіны, урокі і гутаркі «Дзяржава. Герб. Сцяг і Гімн», «У сімвалах нашы карані», «Сімвалы Беларусі» (ЦБС г. Віцебска); «Душа Беларусі ў яе сімвалах» (ЦБС Браслаўскага раёна); «Роднай краіны дзяржаўныя сімвалы» (Пастаўская РЦБС); «Ганаруся роднымі сімваламі» (Сенненская ЦБС); «Тры галоўныя сімвалы нашай краіны» (Лёзнская ЦБС); «Наш герб і наш сцяг – гэта сімвалы свабоды» (Лепельская ЦБС); «Я і мая краіна» (Міёрская ЦБС); майстар-клас «Сімвал свету – сімвал Беларусі» (Глыбоцкая ЦБС).

Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь адбыліся інфармацыйныя гадзіны «Незалежная, адзіная – у нашым сэрцы Беларусь» (ЦБС Браслаўскага раёна); «Давайце ганарыцца, што мы беларусы!» (ЦБС г. Віцебска); «Мы розныя – Беларусь адна» (Талачынская ЦБС); «Радзіма мая, дарагая, красуй і ў шчасці жыві» (Мёрская ЦБС); літаратурная пляцоўка «Рифмы малой родины» (Шумілінская ЦБС); краязнаўча-

патрыятычны паход «Знать историю земли, которой ты частица» (Лёзненская ЦБС); літаратурна-гульнявая праграма «Жыві, квітней, Беларусь!», паэтычная арт-сустрэча «Льецца верш над роднай старонкай» (Глыбоцкая ЦБС); патрыятычна-выхаваўчая гульня «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк); краязнаўчы серпанцін «Край цудаў, казак і буслоў» (Аршанская ЦБС); акцыя «Маленькім чытачам пра вялікую Беларусь» (Пастаўская РЦБС).

Да Дня народнага адзінства ў бібліятэках вобласці прайшлі патрыятычныя гадзіны і акцыі «Я люблю Беларусь», «В единстве мы непобедимы», «Адзіная зямля – адзін народ» (ЦБС г. Віцебска); «Моцныя адзінствам» (Докшыцкая ЦБС); майстар-клас «Беларуская лялька» (ЦБС г. Наваполацка) і інш.

На працягу года ва ўсіх бібліятэках былі аформлены кніжныя выставы, выставы-інсталяцыі, прысвечаныя Году міра і стварэння: «2023 – Год міру і стварэння», «Заўжды будуць жыць іх імёны», «Памяць у сэрцы жыве», «Беларусь – краіна тваёй будучыні», «Мір, стабільнасць, дабрабыт», «Созидайте на благо мира», «Уважение к прошлому – залог будущего», «Захоўваем, ганарымся і ствараем», «Беларусь мая сінявокая», «Віцебскай вобласці прысвячаецца…» і інш.

## Патрыятычнае выхаванне

У 2023 годзе бібліятэкі вобласці плённа працавалі над фарміраваннем у чытачоў пачуцця патрыятызму і павагі да культурна-гістарычнай спадчыны, выхаваннем нацыянальнага гонару, развіццём нацыянальнай самасвядомасці.

На працягу года бібліятэкі вобласці працавалі ў рамках праграм і праектаў: «Лёзненскія радкі Перамогі. Навечна ў памяці нашчадкаў» (Лёзненская ЦБС); «Памятаю – ганаруся» (Полацкая РЦБС); «Моладзь Беларусі» (Пастаўская РЦБС); «Памяць патрэбна жывым» (ЦБС Расонскага раёна); «Патрыёт» (Ушацкая ЦБС); «Жывая сувязь пакаленняў» (ЦБС г. Віцебска) і інш.

Мэтай патрыятычнага праекта «Далёкому мужеству верность храня», які рэалізоўваўся ў Бешанковіцкай ЦБС, стала выхаванне ў падрастаючага пакалення патрыятызму і павагі да гістарычнага мінулага сваёй Радзімы, зберажэнне памяці аб земляках – удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. У рамках праекта адбыліся урок гістарычнай памяці «Няхай светлай будзе наша памяць», акцыя па ўскладанні кветак да Брацкай магілы, урок мужнасці «Захаваем у сэрцах сваіх памяць светлую аб іх!», мастацка-публіцыстычная праграма «Маленькія героі вялікай вайны» і інш.

У Варанцэвічскай бібліятэцы-філіяле Талачынскага раёна трэці год запар рэалізоўваўся краязнаўчы праект «Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем». У рамках праекта працягвалася пошукава-даследчая праца па выяўленні і збору дакументаў, якія дапамогуць захаваць памяць





**ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Дзень вясёлых забаў у рамках абласнога праекта
«Ура! Канікулы: у аб'ектыве дзеці»



**ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі



**ДУК «Пастаўская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Раённы конкурс «Бібліятэкар у вобразе літаратурнага героя»




**ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Расонскага раёна»**
Квэст «Востраў кніжных скарбаў»



аб подзвігу ўдзельніка партызанскага руху Героя Савецкага Саюза М. Тапвалдыева, перапіска з ветэранамі і ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, землякамі М. Тапвалдыева з Ферганы, вывучэнне краязнаўчай літаратуры і архіўных матэрыялаў. У выніку складзена і аформлена тэматычнае дасье «Слова пра Героя» (старонкі жыцця Героя Савецкага Саюза, камандзіра разведкі партызанскай брыгады «Чэкіст» Мамадалі Топвалдыева). Сабраны ўнікальныя звесткі аб партызанскім руху на тэрыторыі краю, гісторыі калгаса «Камсамольская праўда», радаводзе асобных сямей. За тры гады рэалізацыі праекта назапашана вялікая колькасць краязнаўчых матэрыялаў, якія сфарміраваны ў тэматычныя папкі. У справаздачным годзе дапоўнены матэрыяламі і новымі раздзеламі рэсурсы «Летапіс вёскі Варанцэвічы», «Вёска. Час. Людзі», «Гісторыя роднай вёскі», «А ў нашых хатах майстры жывуць».

На працягу года ладзіліся сустрэчы чытачоў з воінамі-інтэрнацыяналістамі, ветэранамі баявых дзеянняў у Афганістане: урок памяці «Час абраў нас» (ЦБС г. Віцебска), гутарка-агляд «Афганістан – боль душы» (Глыбоцкая ЦБС), літаратурная кампазіцыя «Афганістан жыве ў душы маёй» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк). У ЦБС г. Віцебска прайшоў урок мужнасці «Афганістан: жывая памяць пакаленняў». Перад навучэнцамі сярэдніх школ № 4 і № 7 выступіў ветэран афганскай вайны, старшыня Віцебскай гарадской арганізацыі «Братэрства» Беларускага саюза ветэранаў у Афганістане Валерый Ананчанка, які распавёў пра патрыятызм, важнасць захавання памяці, герояў Вялікай Айчыннай і афганскай войнаў.

Да 105-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Дня абаронцаў Айчыны праведзены патрыятычныя гадзіны «Роднай краіны абарона» (ЦБС г. Віцебска), «Салдатам быць – Радзіме служыць» (Глыбоцкая ЦБС), «Апаленыя душы і сэрцы» (Глыбоцкая ЦБС), «Айчыне служаць сапраўдныя мужчыны» (Аршанская ЦБС) і інш.

Шэраг мерапрыемстваў быў прысвечаны Дню Перамогі, Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа: вечар-рэквіем «Не падлягае забыццю» (Бешанковіцкая ЦБС); урок-суд «Генацыд беларускага народа – злачынства без сроку даўніны» (ЦБС Браслаўскага раёна); завочная экскурсія «Вуліцы захоўваюць герояў імёны» (Верхнядзвінская ЦБС); гучныя чытанні «Радасць і слёзы Перамогі», акцыя «Дзень белых жураўлёў», патрыятычная гадзіна «Гучаць званы Хатыні» (ЦБС г. Віцебска); урок-рэквіем «Лучше б не было войны!» (Аршанская ЦБС); віртуальнае бібліятаксі «Імёны герояў у вуліцах горада» (Полацкая РЦБС); вечар памяці «Трагедыі ў Хатыні – 80 гадоў» (Лепельская ЦБС); літаратурная гасцёўня «Хатыні вогненныя сёстры» (ЦБС г. Наваполацка) і інш.

У Відзаўскай бібліятэцы ЦБС Браслаўскага раёна працягваецца папаўненне дасье «Нашы землякі – наш гонар», «Край блакітных азёр», «Відзы ў друку», «Свет малой радзімы» (для правядзення экскурсаў па пасёлку), сабрана відэатэка дакументальных фільмаў пра г.п. Відзы і

наваколле. Матэрыялы нязменна карыстаюцца попытам і прыцягваюць увагу наведвальнікаў бібліятэкі, студэнтаў, гасцей пасёлка.

На фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі і самасвядомасці былі накіраваны мерапрыемствы краязнаўчай тэматыкі: падарожжа «Край наш найдзівосны», гутарка «Шёл по городу трамвай», гульня «Любімы горад, табе я прысвячаю» (ЦБС г. Віцебска); урок ведаў «Знакамітыя людзі Глыбоччыны – наш гонар і слава» (Глыбоцкая ЦБС); урок мужнасці «Подзвіг Зоі» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк); краязнаўчае падарожжа па Сітцаўскім парку «Рэха даўніх часоў» (Докшыцкая ЦБС); круглы стол «Орша: вялікая гісторыя маленькага горада» (Аршанская ЦБС); вечар памяці «Вайна ў лёсе маёй сям'і» (Талачынская ЦБС); экскурсійная праграма «Наваполацку прысвячаецца», песенна-лірычны канцэрт-марафон «Прыгожая песня Дзвіны – Наваполацк» (ЦБС г. Наваполацка); краязнаўчы вернісаж «Партызанская галерэя Ушаччыны» (Ушацкая ЦБС) і інш.

У бібліятэках вобласці ладзіліся мерапрыемствы, прысвечаныя 85-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, якое адзначалася ў справаздачным годзе. Гэтай даце быў прысвечаны гарадскі конкурс буктрэйлераў па творах пісьменнікаў Віцебшчыны «Ведай нашых! Чытай нашых!». Урачыстае падвядзенне вынікаў конкурсу і ўзнагароджанне пераможцаў адбылося ў ЦГБ імя М. Горкага г. Віцебска падчас круглага стала, прысвечанага Дню народнага адзінства. «Ведай і любі свой родны Віцебскі край» – так называлася краязнаўчая гадзіна, якая была праведзена ў Глыбоцкай ЦБС. Падчас мерапрыемства школьнікі даведаліся, як ішло фармаванне вобласці як адміністрацыйнай адзінкі, якія гістарычныя і сучасныя асобы прадстаўляюць нашу Віцебшчыну. Успомнілі самыя старажытныя і маладыя гарады вобласці, узгадалі найбольш буйныя прамысловыя прадпрыемствы Віцебшчыны, брэнды якіх вядомы далёка за межамі Беларусі. У Докшыцкай ЦБС прайшло экспрэс-падарожжа «Віцебшчына сінявокая» для чытачоў з аддзялення дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту. Удзельнікам мерапрыемства была прапанавана віктарына, у ходзе якога чыталіся вершы, гучалі песні. Была аформлена кніжная выстава «Сэрцу мілы край – мая Віцебшчына».

У 2023 годзе ў бібліятэках вобласці ладзіліся мерапрыемствы, прысвечаныя вядомым дзеячам Віцебшчыны: вечар-прысвячэнне «Петр Машеров: человек-легенда» да 105-годдзя з дня нараджэння; урок мужнасці «Бацькава сэрца» – знаёмства з баявым шляхам Міная Шмырова; гадзіна мастацтва «Художник и педагог Юдэль Пэн»; літаратурна-мастацкі вернісаж «Шляхі Я. Драздовіча» да 135-годдзя мастака і інш.

Амаль ва ўсіх вёсках Віцебскай вобласці сумесна з сельскімі выканаўчымі Саветамі і сельскімі дамамі культуры ладзяцца святы вёскі. Гэтыя святы – аднаўленне даўно забытых традыцый. Правядзенню такога свята папярэднічае вялікая работа па збору матэрыялаў пра гісторыю вёскі і яе жыхароў. У час мерапрыемства адбываецца ўшанаванне ветэранаў вайны і працы, передавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, старажылаў вёскі. Надоўга застаюцца ў памяці вяскоўцаў і выставы творчасці народных






**ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Абласное свята-конкурс самадзейных паэтаў і кампазітараў
«Песні сунічных бароў–2023»



**ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»**
Квэст «Казачнае асарці»




**ДУК «Дубровенская централизованная библиотечная система»**
Бібліяноч – 2023 «12 стульев»



**ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Адкрыццё экспазіцыі «Книга – времён связующая нить»



майстроў, выставы сельскагаспадарчай прадукцыі: свята вёскі Латыгаль «Жыву і дыхаю, мой край, табой…» (Глыбоцкая ЦБС); свята вёскі Валодзькі «Мой родны куток, мая родная вёска» (Докшыцкая ЦБС) і інш.

На працягу года ва ўсіх бібліятэках былі аформлены кніжныя выставы: «Подзвігам слаўныя твае землякі», «Храним память. Гордимся победой!», «Усё жыццё – служэнне народу», «Край беларускі – край самабытны», «Радзімы слаўнае імя», «Мой родны край, мой клопат і мой лёс», «Я гэты край Радзімаю заву!», «Памяць у імя будучыні», «Маіх радкоў няма без Беларусі», «Память хранят живые» і інш.

## Духоўная асвета і выхаванне

Духоўнае выхаванне з'яўляецца важным накірункам у рабоце бібліятэк вобласці. Належную ўвагу надаюць бібліятэкары супрацоўніцтву з праваслаўнай царквой: на мерапрыемствы запрашаюцца святары, арганізоўваюцца сустрэчы з вучнямі, вядзецца работа па папулярызацыі кніг праваслаўных пісьменнікаў. Нязменнымі напрамкамі ў рабоце бібліятэк застаюцца адраджэнне духоўнай культуры, выхаванне маральных ідэалаў.

Дзякуючы супрацоўніцтву з выдавецтвам Беларускага Экзархату фонды бібліятэк рэгулярна папаўняюцца кнігамі духоўнага зместу. Літаратура знаходзіцца ў свабодным для чытачоў доступе і дэманструецца на кніжных выставах («Крыніца духоўнай спадчыны», «Праз кнігу – да дабра і святу», «Пасха – дзень святых чудес», «Зоркай свеціцца імя тваё, Еўфрасіння», «Жывое слова мудрасці духоўнай», «Крещение – святое Богоявление», «Слова праваслаўнае», «Пасха радость нам несёт», «Живой родник православной книги», «У жыццё – са светам духоўнай кнігі», «Кніга духоўная – кніга мудрасці», «Её глаза – небо Беларусі», «Азбука славян», «Святло пад кніжнай вокладкай» і інш.).

На базе бібліятэк працуюць клубы і аматарскія аб'яднанні духоўнага накірунку: «Духоўны прыстанак», «Лучынка» (Глыбоцкая ЦБС), «Вытокі» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк), «Благовест», «Благодать» (Чашніцкая РЦБС) і інш.

У 2023 годзе бібліятэкі працавалі ў рамках праграм і праектаў па духоўнаму выхаванню, сярод якіх «Чарадзейная скарбонка», «Сцяжынкамі родных традыцый» (Бешанковіцкая ЦБС), «Праз кнігу да дабра і святу» (Глыбоцкая ЦБС), «Под сенью духовности» (Полацкая ЦБС), «Духовность дарит нам добро» (Лёзненская ЦБС), «От традиций к духовному возрождению» (ЦБС г. Наваполацка), «Духовная спадчына ў кнігах і чытанні» (Аршанская ЦБС), «На шляху да духоўнасці» (Ушацкая ЦБС), «Гісторыя праваслаўя роднага краю» (Шаркаўшчынская ЦБС).

У сацыяльных сетках «ВКонтакте» і «Інстаграм» Докшыцкая ЦБС пачала анлайн-праект «Мая праваслаўная кніга». Асноўная мэта гэтага праекта – прыцягненне ўвагі і фарміраванне цікавасці да духоўнай літаратуры.

На працягу года сацыякультурныя мерапрыемствы праводзіліся да рэлігійных і народных святаў: Раства Хрыстова («Очарование Рождества», «Вслед за Рождественской звездой», «Рождество – свет небесного чуда», «Зазвенел рождественский колокольчик», «Рождества волшебные мгновенья»); Хрышчэння («Крещение Господне», «Крещенские праздники»); Вялікадня («Светлае свята Вялікдзень», «Вялікдзень – вялікі і светлы», «Пасха светлая пришла», «Пасхальный благовест», «Вот и Пасха! Запах воска, запах теплых куличей», «Пасха – светлое христово воскресенье»); Спаса («Жнівеньскія Спасы», «Ореховый Спас всем хлеба припас!», «Пришёл Спас – всему час»); Масленіцы, Пакрова Прасвятой Багародзіцы і інш.

Да Дня праваслаўнай кнігі арганізоўваліся праваслаўна-літаратурныя вечарыны («Духоўная спадчына нашых продкаў», «Душа по капле собирает свет», «Духоўнае сямейнае чытанне», «Об Боге, вере, истине, красоте, добре и надежде», «Вечные ценности православия», «Праваслаўная кніга – шлях да пазнання божага слова», «Дарогамі праваслаўя» і інш.).

Традыцыйна ў публічных бібліятэках вобласці праходзілі сустрэчы з духавенствам, мерапрыемствы з удзелам святароў мясцовых храмаў. Духоўная сустрэча «Свет праваслаўя – свет душы» прайшла ў Аршанскай ЦБС з удзелам настаяцеля храма Прэабражэння Гасподня іерэя Вадзіма. На сустрэчы «Пасхальной радости сиянье…» са святаром Богаяўленскага кафедральнага сабора іерэем Георгіем, якая адбылася ў Полацкай РЦБС, айцец Георгій успомніў пра асноўныя падзеі евангельскай гісторыі, пра хрысціянскі сэнс свята Вялікадня і сямейныя велікодныя традыцыі. Сустрэча з духавенствам «Павага да кожнай рэлігіі – аснова здаровага грамадства» праходзіла з удзелам святара касцёла святога Андрэя з вёскі Нарач і біскупа Віцебскай дыяцэзіі (Пастаўская ЦБС). Сустрэча «Пра Вялікдзень са святаром» з удзелам іерэя Дзмітрыя, настаяцеля храма святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра адбылася ў Талачынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, гадзіна духоўнасці «Верба ў дом – бяда з дому» са святаром з царквы св. Пятра і Паўла айцом Анатолем – у Віцебскай РЦБС, сустрэча з настаяцелем храма Палажэння Рызы Прасвятой Багародзіцы ва Улахерне протаіерэем Віктарам Вабішчэвічам – у Мёрскай ЦБС, сустрэча з удзелам сясцёр Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра – у ЦБС г. Наваполацка.

Пашырэнню ведаў аб праваслаўных традыцыях беларускага народа, фарміраванню пазітыўнага стаўлення да хрысціянскіх маральных каштоўнасцей, павагі да духоўных традыцый народа садзейнічалі акцыі, якія праходзілі ў бібліятэках да святочных дзён праваслаўнага календара: «От всей души», «Навстречу детским сердцам», «Пошли мне чтения доброго…», «Белыя птушкі Благавешчання» і інш.

Да Дня памяці Еўфрасінні Полацкай бібліятэкар бібліёбуса Бешанковіцкай ЦБС на маршруце ПМК 41 прапанавала чытачам гутарку ля кніжнай выставы «Пуцяводная зорка Беларусі: прападобная Еўфрасіння Полацкая». У бібліятэцы імя Еўфрасінні Полацкай ЦБС г. Віцебска










**ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Праект «Кніга пачынаецца з пісьменніка»,
свята «Бярозавы сок – здароўя глыток»



**ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»**
Акцыя памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны
«Дзень белых жураўлёў»



**ДУК «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Літаратурна-тэатралізаванае свята «Няхай кніга стане святам для ўсіх»



адбыўся вечар духоўнай музыкі і паэзіі, прысвечаны беларускай святой, з удзелам лаўрэата конкурсу духоўнай паэзіі Вольгі Дарошчанкі, протаіерэя з Оршы айца Аляксандра Лапцева. Удзельнікі творчых груп «Адраджэнне» і «Каўчэг» выконвалі на мерапрыемстве духоўныя песні, а культурна-інфармацыйны цэнтр «Сокровища мира» прадставіў выставу рэпрадукцый карцін і абразоў «Святло Еўфрасінні».

У 2023 годзе вялася выдавецкая дзейнасць бібліятэк у духоўным накірунку. Супрацоўнікі сектара інфармацыйна-бібліяграфічнай работы ЦБС г. Віцебска выдаюць серыю «Храмы Віцебска» (гісторыя культавай архітэктуры). У 2023 годзе яна папоўнілася буклетам «Свято-Покровский кафедральный собор». Каля культавых збудаванняў Віцебска ўстаноўлены інфармацыйныя стэнды з QR-кодамі, якія ўтрымліваюць гіперспасылкі на артыкулы гэтай серыі, размешчаныя на афіцыйным сайце ЦБС.

У Гарадоцкай ЦБС у справаздачным годзе прайшоў раённы конкурс на лепшы макет царквы Гарадоцкага раёна «Макетирование Городокских храмов». Макет «Храм святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны ў вёсцы Халамер’е» (аўтар А.Л. Шышкоў) быў прызнаны лепшым сярод іншых удзельнікаў конкурсу. Журы адзначыла высокую тэхнічную і мастацкую працу аўтара, а таксама яго ўменне перадаць духоўную атмасферу храма.

## Здаровы лад жыцця

Найважнейшая складаючая частка здаровага ладу жыцця – сістэма прафілактыкі. І адна з вядучых роляў у гэтай справе, нароўні з установамі аховы здароўя і адукацыі, належыць бібліятэкам. Удзел дзяцей і падлеткаў у мерапрыемствах па здаровым ладзе жыцця, накіраваных на фарміраванне і развіццё культуры душы праз культуру цела – адзін са спосабаў прафілактыкі наркаманіі, алкагалізму і тытунекурэння. У 2023 годзе не спынялася работа па папулярызацыі здаровага ладу жыцця і прафілактыцы шкодных звычак у бібліятэках вобласці: праводзіліся мерапрыемствы, афармляліся куткі здароўя, адкрытыя прагляды літаратуры, тэматычныя паліцы.

Станаўленню каштоўнасных адносін да здароўя спрыяла работа бібліятэк у межах доўгатэрміновых праектаў і праграм: «Зялёная аптэка» (Бешанковіцая ЦБС), «Дарога да здароўя» (ЦБС Браслаўскага раёна), «Здаровае пакаленне» (Лёзненская ЦБС), «Здравушка» (Аршанская ЦБС), «Лекавыя расліны ад А да Я» (Полацкая РЦБС), «МЫ выбіраем жыццё! Жыццё выбірае НАС!» (ЦБС г. Наваполацка) і інш.

Відзаўская гарпасялковая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна вяла работу па праекце «Жыць – са здароўем сябраваць». У рамках праекта ў 2023 годзе адбыліся інтэлектуальня гульня «Поле здароўя» з выхаванцамі дзіцячага дома сямейнага тыпу, кірмаш карыснай інфармацы «У кабінеце доктара Небалейкі», гульнявая праграма «Гульня – здароўю верная сястра». Мерапрыемствы праходзілі на свежым паветры, як і арганізаваная спартыўна-аздараўленчая пляцоўка.

Заслугоўваюць увагі мерапрыемствы бібліятэк Гарадоцкага раёна. У 2023 годзе ў Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы рэалізоўваўся міні-праект «Мы за ЗОЖ». Для людзей пенсійнага ўзросту быў арганізаваны відэалекторый «Жыццё і здароўе». Удзельнікі прагледзелі відэаролік аб важнасці вядзення актыўнага ладу жыцця ў пажылым узросце, пазнаёміліся з літаратурай на тэму здаровага харчавання і атрымалі памятку «Карысць ранішняй зарадкі». Для дзяцей прайшоў бібліятэчны квіз «Да здароўя навыперадкі», дзе ўдзельнікі спаборнічалі паміж сабой, складалі прыказкі аб здароўі, гулялі ў гульню «шкодна-карысна». У рамках праекта «Велабібліятэка» супрацоўнікі Бычыхінскай сельскай бібліятэкі арганізавалі для моладзі веламарафон «Моладзь і спорт». Бібліятэкары пазнаёмілі хлопчыкаў і дзяўчынак з літаратурай на тэму спорта, а затым разам наведалі чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя на даму, прывезлі ім цікавыя кнігі. З 2006 года Пальмінская сельская бібліятэка Гарадоцкага раёна з'яўляецца школай здаровага ладу жыцця. Кніжныя выставы, агляды, мерапрыемствы пра здароўе з'яўляюцца адным з прыярытэтных напрамкаў яе работы. Бібліятэка працуе па праграме «Праз кнігу – да здароўя». У 2023 годзе ў рамках яе былі праведзены урок здароўя «Скажи микробам – нет!», інфармацыйная гадзіна «Красота и здоровье без табака», гадзіна інфармацыі «СПИД: это серьезно» і інш. Супрацоўнікі Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі прынялі ўдзел у спартыўным мерапрыемстве «Віцебская лыжня – 2023», які праходзіў ва ўрочышчы «Вераб'ёвы горы». Работнікі бібліятэкі частавалі ўсіх жадаючых духмянай гарбатай з печывам, а таксама знаёмілі з літаратурай аб спорце і дасягненнях беларускіх спартсменаў на кніжнай выставе «О спорт, ты мир!».

У бібліятэках Аршанскай ЦБС праходзілі маштабныя мерапрыемствы з запрашэннем прадстаўнікоў сістэмы аховы здароўя, накіраваныя на папулярызацыю здаровага ладу жыцця. «ВІЧ/СНІД, туберкулёз, венерычныя захворванні – што трэба ведаць» – пад такой назвай прайшоў адкрыты дыялог у цэнтральнай бібліятэцы імя А.С. Пушкіна сумесна са спецыялістамі Аршанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. У горадзе Барань прайшоў III фестываль здаровага ладу жыцця «Майскі FEST». Для жыхароў і гасцей горада былі падрыхтаваны інтэрактыўныя і спартыўныя пляцоўкі, выступленні творчых калектываў. Дзіцячая бібліятэка імя Н.К. Крупскай працягвала рэалізацыю адукацыйнага праекта «Тэрыторыя бяспечнага дзяцінства». Інспектар Аршанскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Ю.С. Алесіна правяла для чытачоў бібліятэкі – вучняў ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Оршы» – урок-практыкум «Пяць крокаў выратавання». У г.п. Балбасава прайшоў III фестываль здаровага ладу жыцця «Импульс здоровья» ў рамках дзяржаўнага прафілактычнага праекта «Балбасава – здаровы гарадскі пасёлак». Супрацоўнікамі бібліятэкі № 10 Аршанскай ЦБС была прадстаўлена выстава-рэкамендацыя «Захоўвай маладосць, здароўе і актыўнае даўгалецце». У сельскіх бібліятэках Аршанскай ЦБС








**ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Квэст «Да вытокаў душой дакраніся»,
тэатралізаванае прадстаўленне «Лясны сход»




**ДУК «Верхнядзінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Навукова-практычная канферэнцыя
«Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці народа»



пры ўдзеле супрацоўнікаў ФАП праводзіліся прафілактычныя гутаркі, абмеркаванні.

Традыцыйна супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі Сенненскай ЦБС прынялі ўдзел у XXXV Сенненскім прабегу памяці Героя Савецкага Саюза П.М. Машэрава. Была аформлена тэматычная выстава «Мы выбираем ЗОЖ», на якой была прадстаўлена літаратура аб знакамітых спартсменах Беларусі, розных відах спорту і правілах харчавання.

Ульская сельская бібліятэка Бешанковіцкай ЦБС праводзіла шэраг мерапрыемстваў для навучэнцаў УА «Ульскі дзяржаўны каледж імя Л.М. Даватара» «За жизнь без табачного дыма». Цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска правялі заняткі з элементамі трэнінгу «Курению скажем – STOP» з удзелам псіхолага Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анжалікі Дзіканавай. Бягомльская гарпасялковая бібліятэка імя П. Панчанкі Докшыцкай ЦБС размясціла ў сацыяльных сетках інфармацыйны ролік «Паліць не модна. Дыхай свабодна».

У рамках праекта «Здравушка» для вучняў ДУА «Сярэдняя школа № 11 г. Оршы» прайшоў калейдаскоп фактаў «Вірус і лічбы». Супрацоўнікі бібліятэкі імя Я. Коласа Аршанскай ЦБС запрасілі на мерапрыемства ўрача ДУЗ «Аршанскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» М.М. Жупікаву, якая расказала пра невылечную хваробу.

## Нестацыянарнае абслугоўванне

Бібліятэчнае абслугоўванне сельскага насельніцтва пры дапамозе бібліёбусаў ажыццяўляецца ў 18 раёнах Віцебскай вобласці, за выключэннем Мёрскага, Пастаўскага і Ушацкага.

У 2023 годзе бібліёбусамі абслугоўвалася 737 населеных пунктаў. У параўнанні з мінулым годам іх колькасць павялічылася на 14 адзінак. На адзін бібліёбус у сярэднім прыходзілася па 40 населеных пунктаў. За 2023 год па 197 маршрутах (-3 да мінулага года) было здзейснена 1 605 (+83) выездаў.

Усяго па вобласці абслужана пры дапамозе бібліёбусаў 6 184 чытачы, што на 1,1% больш, чым у мінулым годзе. Колькасць наведванняў дасягнула 35 294 адзінак (108,7% да мінулага года), выдадзена 186 981 дакументаў (105,4%). Такім чынам, як і ў мінулым перыядзе, адзначаецца рост колькасных паказчыкаў дзейнасці бібліёбуса. Высокімі паказчыкамі дзейнасці вылучыліся бібліёбусы Бешанковіцкага, Браслаўскага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Аршанскага, Сенненскага, Шумілінскага раёнаў.

Для чытачоў бібліёбуса прапануецца разнастайная мастацкая літаратура, газеты, часопісы, галіновая літаратура. Пры адборы літаратуры для чарговага выезду бібліятэкарам улічваюцца запыты ў канкрэтных пунктах маршрута. Наведвальнікі маюць магчымасць загадзя заказаць неабходную літаратуру.

Акрамя дастаўкі літаратуры жыхарам аддаленых вёсак, падчас

абслугоўвання праводзіліся культурна-масавыя мерапрыемствы, сярод якіх больш распаўсюджаны былі малыя формы масавай работы: гутаркі «Не подлежит забвению» (Бешанковіцкая ЦБС), «Духовный мир православной книги» (Верхнядзвінская ЦБС), інфармацыйныя гадзіны «Журналу «Маладосць – 70 год» (Глыбоцкая ЦБС), «Сацыяльныя гарантыі пенсіянераў у Рэспубліцы Беларусь у 2023 годзе» (Віцебская РЦБС), краязнаўчы экскурс «Церковь Святого пророка Ильи» (Докшыцкая ЦБС), а таксама культурныя мерапрыемствы, сярод якіх вечарына «Имя тебе – женщина!» (Аршанская ЦБС), інтэлектуальныя гульні «Классики» (Полацкая РЦБС), «Чарующая классика» (Лёзненская ЦБС), гульнявыя праграмы «Гульні з бабулінага кошыка» (Сенненская ЦБС), «Наліўны яблык» (Чашніцкая РЦБС), «У пошуках маладзільных яблыкаў» (Шаркаўшчынская ЦБС), спектакль «Послание другим мирам» (Шумілінская ЦБС) і інш.

На працягу года на маршрутах бібліёбуса праводзіліся акцыі «Бібліятэчная служба» (ЦБС Браслаўскага раёна), «С книжкой на скамейке» (Верхнядзвінская ЦБС), «У новы дзень без тытуню і курэння» (Віцебская РЦБС), «Ад сэрца да сэрца», «Падаруй цяпло душы сваёй» (Дубровенская ЦБС), «Песні памяці і славы» (Лепельская ЦБС), «Чытаем беларускую кнігу разам» (ЦБС Расонскага раёна) і інш.

Асобнай увагі патрабуе агляд практыкі сумесных выездаў бібліёбусаў з аўтаклубамі, якія практыкуюцца ў шэрагу ЦБС. Сумесна з аўтаклубамі праводзяцца акцыі, літаратурна-музычныя кампазіцыі, канцэртныя праграмы, ушанаванні чытачоў-юбіляраў, мерапрыемствы да юбілейных і памятных дат. Так, тэматычная праграма «Дзве сястры» была арганізавана работнікамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі Лепельскага раёна сумесна з работнікамі нестацыянарнага аддзела ДУК «Лепельскі РДК» на маршруце № 5 бібліёбуса для жыхароў вёсак Чэрцы і Межыца, якія пазнаёміліся з кніжнай выставай «Созвучие сердец: Беларусь и Россия». Прысутныя паўдзельнічалі ў адкрытым мікрафоне і паслухалі выступленні артыстаў РДК з любімымі песнямі.

У верасні ў Тулаўскім сельскім доме культуры ДУК «Віцебскі раённы цэнтр культуры і творчасці» адбыўся метадычны дзень, на якім былі падведзены вынікі абласнога сумеснага праекта ўстаноў культуры па формах нестацыянарнага абслугоўвання насельніцтва «Ура! Канікулы: у аб’ектыве дзеці». Праект, арганізатарамі якога выступалі ўпраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама, Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, праходзіў на працягу летніх месяцаў. Унікальнасць праекта – у партнёрскай дзейнасці супрацоўнікаў бібліёбусаў і аўтаклубаў, якія выязджалі ў аддаленыя вёскі сваіх раёнаў з сумеснымі мерапрыемствамі, выставамі, майстар-класамі, конкурсамі, прызванымі разнастаіць летні вольны час дзяцей у сельскай мясцовасці. Па выніках праекта сярод дасланых партфоліа журы выбрала лепшых удзельнікаў: установы культуры Дубровенскага, Лёзненскага, Талачынскага і Шаркаўшчынскага раёнаў.





**ДУК «Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Фота-экскурс «Мінулых гадоў святая памяць»
на мемарыяльным комплексе «Узрэчча»



**ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»**
Восеньскія канікулы ў дзіцячай бібліятэцы



**ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»**
Адкрыццё выставачнай залы «ExLibris»



**ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Адкрыццё фестывалю праваслаўнай кнігі «Дарогамі праваслаўя»



Спецыяльным дыпломам за папулярызацыю традыцыйнай народнай культуры сродкамі дзіцячай творчасці адзначаны Глыбоцкая ЦБС і Глыбоцкі ЦТКіНТ. Падчас метадычнага дня ўдзельнікі выступалі з прэзентацыяй сваёй дзейнасці. Супрацоўнікі аддзела бібліятэказнаўства прынялі ўдзел у дыялогавай пляцоўцы «Нестацыянарнае культурнае абслугоўванне насельніцтва. Позірк у заўтра», дзе прайшло абмеркаванне праекта, былі вызначаны перспектыўныя накірункі развіцця нестацыянарных форм абслугоўвання насельніцтва ў сельскай мясцовасці.

Бібліёбус Бешанковіцкай ЦБС прыняў удзел у раённым аўтапрабегу па памятных месцах і ўрачыстым мітынгу на мемарыяльным комплексе «Узрэчча», прысвечаным Дню вызвалення Бешанковіцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Бібліятэкары падрыхтавалі фотаэкскурс «Бешенковичи в годы Великой Отечественной войны» і «Мінулых дзён жывая памяць». Жыхары і госці раёна з цікавасцю разглядалі гістарычныя фатаздымкі, слухалі аповед бібліятэкара.

Нестацыянарнае абслугоўванне ажыццяўляецца і ў бібліятэчных пунктах выдачы, якія арганізаваны па месцах працы, вучобы, адпачынку чытачоў, у медыцынскіх установах. У 2023 годзе працягнута тэндэнцыя па змяншэнні іх колькасці, на канец года налічвалася 60 бібліятэчных пунктаў (-12 да 2022 года). Акрамя таго, супрацоўнікі бібліятэк абслугоўваюць на даму чытачоў пажылога ўзросту і людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Асноўнымі праблемамі, якія адзначаюць бібліятэкары ў нестацыянарным абслугоўванні, застаюцца скарачэнне колькасці сельскага насельніцтва, няспраўнасць аўтамабіля, адсутнасць тэхнічнага забеспячэння. У 2023 годзе толькі для Полацкай РЦБС у рамках рэалізацыі Комплекса мер па развіццю Полацкага раёна набыты сучасны бібліёбус, абсталяваны камфортным адсекам для абслугоўвання і кніжнымі стэлажамі. Срок эксплуатацыі пераважнай большасці аўтамабіляў перавышае 10 год (77,8%), што адмоўным чынам адбіваецца на іх тэхнічным стане.

## Папулярызацыя беларускай культуры, мовы, літаратуры

Мэтанакіраваную працу ў напрамку папулярызацыі беларускай культуры праводзяць бібліятэкі Віцебскай вобласці. Выхаванне павагі да роднай культуры, мовы і літаратуры пачынаецца з афармлення памяшканняў бібліятэк: родная мова выкарыстоўваецца ў назвах кніжных выстаў, цытатах, аб’явах. У аздабленні інтэр’еру бібліятэкі выкарыстоўваюць элементы беларускай нацыянальнай культуры – тканыя ручнікі, вырабы з дрэва, гліны і інш.

У 2023 годзе г. Гарадок стаў месцам правядзення XXX Дня беларускага пісьменства і друку. Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна прадстаўляла на свяце маштабную кніжную экспазіцыю, у якую ўвайшлі звыш за 100 лепшых кніг пра наш рэгіён. Сярод прадстаўленых выданняў – «Верхні замак Віцебска (IX–XVIII стст.)» Леаніда

Калядзінскага, зборнікі дакументаў «Віцебская губерня», выдадзеныя абласным архівам, кнігі віцебскага гісторыка Мікалая Півавара і іншыя. Супрацоўнікамі Гарадоцкага культурна-асветніцкага цэнтра і сеткі публічных бібліятэк была арганізавана інтэрактыўная пляцоўка «Тарасава сядзіба». У Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэцы прайшла літаратурная сустрэча «На адным дыханні!» з віцебскімі пісьменнікамі і паэтамі, якія прымалі ўдзел у акцыі «Пісьменнікі краіны – Гарадку» на чале са старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы Тамарай Красновай-Гусачэнка. У чытальнай зале сабраліся аматары літаратуры розных узростаў і інтарэсаў. Тамара Іванаўна, а таксама член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы, ураджэнец Гарадоччыны Андрэй Герашчанка і віцебскі пісьменнік, байкапісец Сяргей Красаў расказвалі пра свае кнігі, натхненне ў творчым працэсе, дзяліліся асабістымі гісторыямі поспеху, чыталі свае творы. Да гэтай даты ў бібліятэках вобласці праводзіліся мерапрыемствы «Свята друкаванага слова» (ЦБС Браслаўскага раёна), «Дар Кірыла і Мяфодзія» (Докшыцкая ЦБС), «Ад Скарыны да нашых дзён» (Аршанская ЦБС), «З вытокаў роднай мовы» (ЦБС Расонскага раёна), «Узрасло буйным коласам зерне Скарыны» (Пастаўская РЦБС), «Праз кнігу – да дабра і святла» (Сенненская ЦБС), «Ля вытокаў пісьменства» (Талачынская ЦБС), «Мова маіх продкаў знікнуць не павінна» (Шаркаўшчынская ЦБС), «Вытокі кніжнай культуры» (Лепельская ЦБС), «Як слова наша нарадзілася» (Чашніцкая РЦБС), «Гісторыя беларускай кніжнасці» (Лёзненская ЦБС).

Шэраг мерапрыемстваў, праведзеных у бібліятэках, быў прасвечаны юбілейным датам беларускіх пісьменнікаў. Да 140-годдзя з дня нараджэння Я. Маўра Лёзненская ЦБС правяла літаратурную гадзіну «Яго звалі беларускім Жулем Вернам», літаратурную гасцёўню «Чараўнік з краіны маленства», прыгодніцкі квэст «Попробуй стать Робинзоном, или Робинзонада по-лиозненски». У Лёзненскай ЦБС адбылася творчая сустрэча з пісьменнікамі – лаўрэатам Першай Нацыянальнай літаратурнай прэміі, аўтарам гімна г. Віцебска, старшынёй Віцебскага аддзялення Беларускага Саюза пісьменнікаў Т.І. Красновай-Гусачэнка і членам Віцебскага аддзялення Беларускага Саюза пісьменнікаў Беларусі С.А. Красавым. Сустрэча была прымеркавана да 75-гадовага юбілею Т.І. Красновай-Гусачэнкі, удзельнікі праслухалі вершы ў аўтарскім выкананні, зацікавіў чытачоў зборнік прозы «Жизнь моя – молитва», які разам з іншымі кнігамі аўтар падаравала бібліятэцы. У Полацкай РЦБС у межах праекта «Далучыся да роднага слова» прайшоў урок-знаёмства «Аб чым пяе крынічка» да 80-годдзя з дня нараджэння М. Чарняўскага. Літаратурныя вечары і гутаркі былі арганізаваны да 100-годдзя з дня нараджэння А. Шашкова, 130-годдзя М. Гарэцкага.

Наша зямля багатая на творчых людзей, пісьменнікаў і паэтаў. Сустрэча з добрай кнігай – заўсёды свята, але не меншае свята – гэта сустрэча з аўтарамі кніг. Творчая сустрэча з маладым і таленавітым пісьменнікам Паўлам Гушынцом адбылася ў Аршанскай ЦБС, удзельнікамі



## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ





**ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»**
Бібліятэчная пляцоўка ў рамках XXX Дня беларускага пісьменства ў Гарадку

дзіцячай паліклініцы горада, а выхаванцаў ДУА «Сацыяльна-педагагічны цэнтр г. Наваполацка» запрасілі на літаратурную мазаіку «Чур, я ў доміку» і літаратурную гадзіну «Вясёлыя апавяданні М. Носава». Супрацоўнікі бібліятэкі імя Я. Коласа ЦБС г. Наваполацка правялі для выхаванцаў прытулку тэатралізаваную гульнявую праграму «Важна верыць у цуды!». 21 снежня ў рамках навагодняй акцыі «Нашы дзеці» ў цэнтральнай бібліятэцы імя А.С. Пушкіна Аршанскай ЦБС адбыліся два дабрачынныя навагоднія тэатралізаваныя прадстаўленні «Новая гісторыя Снежнай Каралевы» для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю.

Ва Ушацкай раённай бібліятэцы імя Е. Лось 25 мая адбылася юрыдычная кансультацыя «Прыёмная сям'я. Апякунства і ўсынаўленне» з удзелам метадыста ДУ «Ушацкі раённы вучэбна-метадычны кабінет», псіхолага Ушацкай цэнтральнай раённай бальніцы і прыёмных бацькоў. На мерапрыемстве былі разгледжаны пытанні дзяржаўнай падтрымкі дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, усынаўлення і афармлення апякунства. Бібліятэкарамі падрыхтаваны інфармацыйныя буклеты «Прыёмная сям'я. Апякунства і ўсынаўленне». Дзеці з апякунскай сям'і з аг. Альшанка з'яўляюцца ўдзельнікамі клуба інтэлектуальнай гульні «Эрудыт» Альшанскай сельскай бібліятэкі Чашніцкай ЦБС і прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні пасяджэнняў клуба.

У 2023 годзе прадоўжылася дзейнасць бібліятэк па абслугоўванні пажылых людзей і інвалідаў па месцы пражывання, у тым ліку з дапамогай бібліёбуса. Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка працуе па праграме «Кнігу ў кожную веску», у рамках якой жыхароў маланаселеных і аддаленых вёсак, у тым ліку пажылых людзей і людзей з інваліднасцю, на даму абслугоўвае бібліёбус. Супрацоўнікі бібліёбуса Глыбоцкай ЦБС сумесна з аўтаклубам у лютым у вёсках Мосар і Луцк-Мосарскі правялі акцыю «Ад усей душы» для людзей сталага ўзросту і інвалідаў, падарыўшы вяскоўцам музычную праграму, а таксама памятныя сувеніры. Супрацоўнікі Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з аўтаклубам у рамках праекта «Бібліяаўтаклубны Вояж» наведалі 8 сакавіка аддзяленне кругласутачнага знаходжання пажылых і інвалідаў ТЦСАН Лёзненскага раёна ў аграгарадку Высачаны. У маі работнікі Лепельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з работнікамі нестацыянарнага аддзела ДУК «Лепельскі РДК» на маршруце бібліёбуса правялі акцыю «Песні памяці і славы». У маі ў рамках праекта «Бібліяаўтаклубны Вояж» супрацоўнікі Лёзненскай ЦБС правялі ў населеных пунктах Заольша, Чарніцы, Уно і Кляўцы патрыятычную акцыю «Чытаць, каб памятаць» і павіншавалі ўсіх з Днём Перамогі.

У 2023 годзе рэалізаваўся праект Бешанковіцкай ЦБС і ТЦСАН Бешанковіцкага раёна «Інфармацыя ў кожны дом», у рамках якога ажыццяўляліся сумесныя выезды ў аддаленыя населеныя пункты з дапамогай бібліёбуса з мэтай абслугоўвання і кансультавання па пытаннях аказання сацыяльных паслуг.



мерапрыемства сталі каля 80 чалавек рознага ўзросту. Дзіцячая бібліятэка імя У.С. Караткевіча Аршанскай ЦБС сустракала дзіцячых пісьменнікаў Кацярыну Хадасевіч-Лісавую і Ірыну Карнавухаву. Ініцыятарам сустрэчы выступіў выдавецкі дом «Звязда», удзельнікамі сталі вучні ДУА «Гімназія № 2 г. Оршы».

У Полацкай РЦБС адбылася творчая сустрэча «Еще раз про любовь…» з паэткай Любоўю Міхайлавай. Любоў Ніканаўна распавяла пра сваё жыццё, творчы шлях і вытокі натхнення. Алена Ясюкевіч выканала песні на вершы Любові Міхайлавай ва ўласнай аранжыроўцы. Сустрэча прайшла ў душэўнай, цёплай абстаноўцы. Любоў Ніканаўна падарыла бібліятэцы два новыя зборнікі «Пад сузор'ем Вадалея», «У часу ў даўгу».

Лепельская ЦБС у рамках святкавання Дня праваслаўнай кнігі правяла літаратурнаю сустрэчу з членам ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мікалаем Гарбачовым і ўдзельнікамі народнага літаратурна-музычнага клуба «Выток» ДУК «Лепельскі раённы Дом культуры» Валянцінай Ясень, Святланай Латышавай.

У ЦБС Расонскага раёна прайшла сустрэча з дзіцячай пісьменніцай Ірынай Багданавай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюзнай дзяржавы, народнага літаратурнага аб'яднання «Надзвінне» (г. Полацк). Пісьменніца пазнаёміла школьнікаў са сваёй серыяй пад назвай «Наша дружная сям'я», у якую ўваходзяць 9 кніг. Напрыканцы сустрэчы пісьменніца падарыла раённай бібліятэцы свае кнігі.

У Чашніцкай РЦБС адбылася творчая сустрэча «Душы цудоўныя парывы» з пісьменнікам, перакладчыкам, ураджэнцам Чашніцкага раёна Аляксандрам Вашчанкам. Пісьменнік паведаміў пра свой жыццёвы і творчы шлях, пазнаёміў прысутных з выданнем «Гісторыя паселішча Дварэц», прысвечаным гісторыі вёскі Дварэц Чашніцкага раёна, дзе ён нарадзіўся і вырас. На працягу мерапрыемства гучалі аўтарскія песні ў выкананні пісьменніка.

У бібліятэцы імя Я. Коласа ЦБС г. Наваполацка прайшла сустрэча старшакласнікаў СШ № 14 з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Марынай Шуханковай. Падчас сустрэчы паэтэса прэзентавала новую кнігу «Памяць – бяссмерце народа», прысвечаную Году міру і стварэння, у якую ўвайшлі вершы Марыны Мікалаеўны і іншых членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Праектная дзейнасць дае магчымасць пашырэння функцый бібліятэк, рэалізацыі асветніцкіх задач. Так, у дзіцячай бібліятэцы Браслаўскага раёна дзейнічала мэтавая праграма «Чытайце самі, чытайце з намі!», накіраваная на папулярызацыю лепшых узораў нацыянальнай літаратуры, у рамках якой адбыліся літаратурныя мерапрыемствы па кнігах «Срэбная табакерка» З. Бядулі, «Вавёрчына гара» В. Віткі, «Мы з Санькам у тыле ворага» І. Сяркова, літаратурныя экскурсы «Беларусь у прасторы і часе», «Добры дзень, кніжка беларуская!». У рамках праекта «БиблиоИстории» Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі праходзіў цыкл выстаў «Юбилейный экспресс», дзе карыстальнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з кнігамі і пісьменнікамі-юбілярамі 2023 года. У дзіцячай

бібліятэцы імя А.С. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка працягваў работу літаратурны медыяпраект «Беларуская чытанка», які знаёміў маленькіх чытачоў з творамі беларускай літаратуры ў анімацыйным фармаце.

Папулярызацыі беларускай культуры, мовы, літаратуры садзейнічалі акцыі, што праводзіліся, пераважна, да Міжнароднага дня роднай мовы: «Гучы, беларускае слова!» (Бешанковіцкая ЦБС), «Незвычайныя словы беларускай мовы» (ЦБС Браслаўскага раёна), «Чытаем Яўгенію Янішчыц разам. Усе пачынаецца з любві» (Верхнядзвінская ЦБС), «Чытаем кнігі на роднай мове» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк), «Размаўляй са мной па-беларуску» (Докшыцкая ЦБС), «Чытанні ўслых» (Пастаўская РЦБС), «Давайце чытаць беларускую кнігу!» (Талачынская ЦБС), «Чароўная скарбонка» (Шумілінская ЦБС), «Дык шануй, беларус, сваю родную мову» (ЦБС Расонскага раёна), «Працягні прыказку» (ЦБС г. Наваполацка) і інш. Да Дня роднай мовы праводзіліся літаратурныя вечарыны, урокі і гутаркі: «Беларуская мова? З задавальненнем!» (Глыбоцкая ЦБС), «Ты, як песня салаўя, мова родная мая» (Докшыцкая ЦБС), «Ззяць, гуляць з табой гатовы словы нашай роднай мовы» (Аршанская ЦБС), «Казка родная беларуская» (Пастаўская РЦБС), «Мілагучнае, звонкае, роднае слова» (Сенненская ЦБС), «Роднай мовы гук чароўны» (Талачынская ЦБС), «Вандроўка ў родную мову» (Ушацкая ЦБС), «Які ж гэта цуд – слова, мова твая…», «Ад зерня – колас, ад слова – мова» (Чашніцкая РЦБС) і інш.

На працягу года ў бібліятэках вобласці ладзіліся літаратурна-музычныя вечары, літаратурна-музычныя кампазіцыі, літаратурныя аўкцыёны, літаратурныя галерэі, літаратурныя дыліжансы: «Добры і мудры настаўнік» (Бешанковіцкая ЦБС), «Уладзімір Караткевіч. Вялікія словы на вялікай мове» (ЦБС г. Віцебска), «Чароўны свет паэзіі» (Глыбоцкая ЦБС), «Сцежкамі Тараса» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк), «Званочак роднага слова» (Аршанская ЦБС), «Люблю наш край, старонку гэту…» (Пастаўская РЦБС), «Заўсёды сэрцам быў з Радзімай» (Сенненская ЦБС), «Ручай крыштальны роднай мовы» (ЦБС Расонскага раёна), «Барадулінскае слова» (Ушацкая ЦБС), «Знаёмцеся – таленты роднага краю» (Чашніцкая РЦБС) і інш.

Добрай традыцыяй бібліятэк вобласці стала правядзенне літаратурных мазаік, экспрэс-віктарын, бібліялато: «І застанецца песняй у народзе» (Бешанковіцкая ЦБС), «З любоўю да роднага слова» (Докшыцкая ЦБС), «Чароўны свет краіны дзяцінства», «Я не так сабе гуляю – на роднай мове размаўляю!» (Аршанская ЦБС), «Беларуская скарбонка» (Аршанская ЦБС), «Гучы, родная мова!» (Полацкая РЦБС), «Сюжэт для вечнасці» (Пастаўская РЦБС), «Дазволь душы маёй адкрыцца» (Шаркаўшчынская ЦБС), «Твае першыя кнігі па-беларуску» (Шумілінская ЦБС), «Той, хто зладзіў калодзеж» (Ушацкая ЦБС) і інш.

На працягу года ў бібліятэках дзейнічалі традыцыйныя і віртуальныя кніжныя выставы: «Мілагучная мова бацькоў» (Верхнядзвінская ЦБС), «Традыцыі. Духоўнасць. Культура» (ЦБС



духоўна-асветніцкую гадзіну «Нябесная заступніца Беларусі». 10 мая супрацоўнікі Бешанковіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі запрасілі наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ТЦСАН Бешанковіцкага раёна на вечар франтавой паэзіі «Франтавыя паэты, вашы лёсы вайна рыфмавала». У жніўні ў Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Т. Хадкевіча для інвалідаў аддзялення дзённага знаходжання ТЦСАН Верхнядзвінскага раёна была праведзена пазнавальная гадзіна «Прыйшлі Спасы – рыхтуй запасы», у верасні – краязнаўчае падарожжа «У горадзе маім – мой лёс». 14 верасня ў бібліятэцы імя М. Лынькова ЦБС г. Віцебска адбылося адкрыццё выставы творчых работ інваліда 1-й групы Аляксея Асмалоўскага.

Важнымі напрамкамі інфармацыйнай работы бібліятэкі з неабароненымі слаямі насельніцтва застаюцца прававая і фінансавая граматнасць. На базе бібліятэк, у публічных цэнтрах прававой інфармацыі праходзіць бясплатнае індывідуальнае кансультаванне натарыусамі (афармленне спадчыны, дагаворы куплі-продажу, падзел маёмасці, дарэнне зямельных участкаў і інш.). У ЦБС г. Наваполацка пачалася рэалізацыя праекта «Школа прававых ведаў для старэйшага пакалення», распрацаванага ПЦПІ сумесна з аддзяленнем дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ТЦСАН.

Адной з умоў паўнавартаснай сацыяльнай адаптацыі сацыяльна неабароненых слаёў дзіцячага насельніцтва з’яўляецца далучэнне да кнігі і інфармацыйных рэсурсаў. Дзеці са шматдзетных сем’яў, дзеці-сіроты, дзеці-інваліды на роўных правах прымаюць удзел у мерапрыемствах бібліятэк. Лёзненскую цэнтральную раённую бібліятэку наведваюць дзеці з сацыяльнага прытулку, для іх у другім квартале 2023 года праведзены гульнявы агляд «Улетные каникулы с Домовенком Кузькой», імяніны Матроскіна «А ў нас у Прастаквашына». Дзеці са шматдзетных сем’яў прымалі ўдзел у забаўляльным шоу «Здесь верят в волшебство, здесь дружат с чудесами...», прысвечаным Міжнароднаму Дню абароны дзяцей. Бібліятэка імя Я. Коласа і дзіцячая бібліятэка імя А.С. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка супрацоўнічалі з дзіцячым сацыяльным прытулкам ДУА «Сацыяльна-педагагічны цэнтр г. Наваполацка». У справаздачным перыядзе выхаванцы прытулку паўдзельнічалі ў латарэі кніжных ведаў «Беларускія загадкі на кніжнай закладцы». Напярэдадні пачатку навучальнага года ў рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Соберемся в школу вместе!» калектыў бібліятэкі падарыў выхаванцам дзіцячага прытулку канцылярскія прыналежнасці і кнігі для чытання. У бібліятэкі Верхнядзвінскай ЦБС напярэдадні Дня бібліятэк былі запрошаны сем’і, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Для іх былі праведзены экскурсіі, гульні, майстар-класы, уручаны кнігі, сабраныя бібліятэкарамі сістэмы падчас акцыі «100 кніг – 100 усмешак».

Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка падрыхтавалі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя гульнявую праграму «У казку добрую клічам», якую правялі ў

«Ветразь» (Бешанковіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), «Добрыя сустрэчы», «Спазнаем свет», (Лепельская цэнтральная раённая бібліятэка), клуб «Аранжавы настрой» (бібліятэка імя К. Сіманава ЦБС г. Наваполацка) і інш.

Бібліятэка № 12 Аршанскай ЦБС функцыянуе на базе Аршанскага філіяла УП «Элект», асноўнымі чытачамі з’яўляюцца супрацоўнікі гэтага прадпрыемства – інваліды па зроку. Для абслугоўвання выкарыстоўваецца радыёвузел прадпрыемства, праводзяцца аудыёмерапрыемствы (інфармацыйныя выступленні «Алкоголь і ты – разбитые мечты», «Блакітныя вочы прыроды», літаратурная гадзіна «Знаёмцеся, Эдуард Асадаў», рэтра-канцэрт «Залатыя мелодыі майго юнацтва» і інш.), за год агучана каля 10 кніг.

Работа бібліятэк па дадзеным напрамку вядзецца ва ўзаемасувязі з установамі сацыяльнай абароны насельніцтва, карэкцыйнымі адукацыйнымі ўстановамі, медыцынскімі ўстановамі, грамадскімі аб’яднаннямі. На працягу 2023 года бібліятэкары філіялаў «Бабінавіцкая сельская бібліятэка-музей» і «Веляшковіцкая сельская бібліятэка» Лёзненскай ЦБС штомесяц наведвалі аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў Бабінавіцкай і Веляшковіцкай сельскіх бальніц, знаёмілі з навінкамі кніг і перыядычных выданняў, праводзілі мерапрыемствы. Рэгулярна бібліятэкар Пастаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі наведвае дзяцей у Цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама ў аддзяленні сацыяльнай адаптацыі, рэабілітацыі і дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «Пастаўскі ТЦСАН». Цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска супрацоўнічае з Віцебскім гарадскім грамадскім аб’яднаннем пажылых людзей «Залаты ўзрост», для гэтай аўдыторыі ў бібліятэцы на працягу года прайходзілі вечар-партрэт «Марына Уладзі: Я несла сваю бяду...», вечар-прысвячэнне «Пётр Машэраў: чалавек-легенда» і інш. 20 студзеня ў аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў ТЦСАН Полацкага раёна бібліятэкар дзіцячай бібліятэкі імя Л.М. Талстога-філіяла № 1 Полацкай РЦБС правяла гутарку «Ганарымся гісторыяй нашых продкаў» пра трагічны лёс полацкай князёўны Рагнеды.

Цэнтральная бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна ў рабоце з наведвальнікамі дзённага аддзялення ТЦСАН Браслаўскага раёна ў 2023 годзе праводзіла святочны калейдаскоп «Традыцыі дзяцінства ў розных краінах свету», творчую сустрэчу «Беларуская кухня», завочнае падарожжа «Водная артэрыя зямлі». 15 мая супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Аршанскай ЦБС прынялі ўдзел у раённым свяце «Мир начинается с семьи», арганізаваным тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва на адкрытай пляцоўцы.

Цэнтральная бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна ў рамках праекта «Бібліятэка без межаў» па рабоце з наведвальнікамі дзённага аддзялення ТЦСАН Браслаўскага раёна у справаздачным годзе правяла інфармацыйную гадзіну «Асцярожна, агонь!», краязнаўчую гадзіну «Слаўны доктар Нарбут», завочнае падарожжа ў Белавежскую пушчу,



г. Віцебска), «Вянок беларускіх раманаў» (Глыбоцкая ЦБС), «З любоўю да роднага слова» (Докшыцкая ЦБС), «Пад небам беларускага слова» (Аршанская ЦБС), «Добры дзень, кніжка беларуская» (Полацкая РЦБС), «Трывогі і надзеі чалавека: па старонках кніг В. Адамчыка» (Талачынская ЦБС), «Саюз пісьменнікаў Беларусі рэкамендуе» (Дубровенская ЦБС), «Іх жыццё – служэнне літаратуры і чытачу» (Лепельская ЦБС), «Максім Гарэцкі: сцяжынкамі жыцця» (Ушацкая ЦБС), «Беларуская мова – вольная, пявучая» (ЦБС г. Наваполацка).

## Прававая асвета

Забяспячэнне свабоднага доступу да прававой інфармацыі для карыстальнікаў розных катэгорый адбываецца публічныя цэнтры прававой інфармацыі бібліятэк вобласці. У 2023 годзе ў Віцебскай вобласці функцыянавала 107 ПЦПІ , з іх 54 – у сельскай мясцовасці.

Адным з асноўных фактараў паспяховай работы прававых цэнтраў з’яўляецца іх інфармацыйна-рэсурснае забеспячэнне. У дзейнасці ПЦПІ выкарыстоўваецца інфармацыйна-пошуковая сістэма «Эталон», якая змяшчае банкі даных «Заканадаўства Рэспублікі Беларусь», «Рашэнні органаў мясцовага накіравання і самакіравання», «Міжнародныя дагаворы», «Судовая практыка». Сфарміраваны масіў юрыдычнай літаратуры: гэта кодэксы, каментарыі заканадаўства, тэматычныя зборнікі прававых дакументаў, даведнікі, слоўнікі, вучэбныя дапаможнікі, перыядычныя выданні прававой тэматыкі. Усе ПЦПІ Віцебскай вобласці маюць выхад у інтэрнэт і штодзённае абнаўленне інфармацыі ў online доступе.

Сукупны фонд дакументаў ПЦПІ вобласці складае 61,8 тыс. экзэмпляраў дакументаў. Тэматыка зваротаў да прававой літаратуры самая разнастойная і ахоплівае ўсе галіны права. У 2023 годзе абслужана 11,8 тыс. карыстальнікаў, ім выдадзена 80 тыс. экзэмпляраў дакументаў. Колькасць наведванняў ПЦПІ склала 34,6 тысяч, колькасць зваротаў да прававых баз даных – 11,6 тысяч.

Станаўленне сучаснай дзяржавы немагчыма без фарміравання прававой культуры, таму шэраг мерапрыемстваў былі накіраваны на павышэнне юрыдычнай граматнасці карыстальнікаў рознага ўзросту. У гэтым напрамку ПЦПІ працуюць у рамках мэтавых праграм і праектаў: «Мы і правa» (Докшыцкая ЦБС), «Бібліятэка – школа прававой культуры» (Аршанская ЦБС), «Бібліятэка ў прававой інфармацыйнай прасторы» (Віцебская РЦБС), «Правовой компас» (Лёзненская ЦБС), «Школа правовых знаний для старшего поколения» (ЦБС г. Наваполацка), «Правовой ориентир» (Ушацкая ЦБС) і інш.

Ва ўсіх ПЦПІ на працягу года праводзяцца масавыя мерапрыемствы, на якія запрашаюцца прадстаўнікі праваахоўных органаў, юрысты-практыкі, медыцынскія работнікі. Так, у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Т. Хадкевіча Верхнядзвінскага раёна з мэтай павышэння інфармацыйнай культуры супрацоўнікаў бібліятэкі была праведзена

інфармацыйная гадзіна «Как не стать жертвой киберпреступника», дзе оперупаўнаважаны аддзялення крымінальнага вышуку Верхнядзвінскага РАУС, капітан міліцыі Ю.А. Мацюк, распавёў пра метады, якія дапамогуць не стаць ахвярай кіберзлачынстваў. У Докшыцкай ЦБС прайшла сустрэча са старэйшым памочнікам пракурора раёна Н.А. Піскуновіч, яна прачытала лекцыю «Экстремизм как угроза патриотизму. Противодействие экстремизму и терроризму». Для жыхароў горада Чашнікі ў Чашніцкай РЦБС адбыліся тэматычныя кансультацыі: «Спажывец пад аховай закона», «Аб сацыяльных ільготах пенсіянерам па ўзросце», «Ільготны крэдыт для маладога спецыяліста», «Сацыяльнае забеспячэнне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь», дзе на тэматычныя кансультацыі запрашаліся спецыялісты розных устаноў.

Аказанне насельніцтву кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі ажыццяўляецца з дапамогай юрыстаў-практыкаў падчас індывідуальных і групавых кансультацый насельніцтву ў бібліятэках. Для кансультацый запрашаюцца спецыялісты выканкамаў, падатковых інспекцый, аддзелаў унутраных спраў, банкаў, цэнтраў занятасці насельніцтва («Имущественные правоотношения супругов. Брачный договор», «Как вступить в права наследования», «Завещание. Что нужно знать?», «Льготы, извещения и расчеты. Порядок уплаты имущественных налогов в 2023 году», «Праца рэгулюецца і ахоўваецца законом», «Камунальная гаспадарка: пытанні і адказы», «Падарыць або завяшчаць?», «В новый год с новым налогом», «Льготный кредит на реконструкцию жилого дома», «Публичный центр правовой информации приглашает», «Цэнтралізаваны экзамен замест школьных выпускных экзаменаў. Што новага для абітурыента?», «Электрасамакат, гіраскутар, сігвей, манакола. Які сродак персанальнай мабільнасці лепш?», «Составление завещания», «Удостоверение доверенности», «Правоспособность и дееспособность» і інш).

У бібліятэках на інфармацыйных стэндах рэгулярна абнаўляюцца звесткі пра паслугі і новыя магчымасці ПЦПІ, аб кніжных навінах і новых электронных рэсурсах. Для найбольш поўнага раскрыцця інфармацыйных рэсурсаў ПЦПІ вялася выставачная дзейнасць, афармляліся кніжныя выставы: «Пенсионный возраст: потребности и возможности», «Что мне скажет этот знак?», «Надежная опора государства», «Наркотики – путь в никуда», «Юридические профессии», «Пенсионное обеспечение», «Новинки права на книжной полке», «Права ребёнка зарождаются в семье», «З правам па жыцці», «Прававы эрудыт», «Прававое інфармаванне», «Весці ПЦПІ» і інш.

Пры правядзенні мерапрыемстваў для дзяцей бібліятэкары актыўна выкарыстоўваюць матэрыялы дзіцячага прававога сайта mir.pravo.by: «Есть права и у детей», «Права ребенка», «Финансовая грамотность, или Как защитить банковскую карту от мошенников», «Право в твоей жизни», «С песней, шуткой и в игре – изучаем ПДД», «Для чаго патрэбен закон?», «Як важна ведаць свае правы», «Правы дзіцяці», «Правазнайка», «Вялікія правы маленькіх дзяцей», «Я – дзіця, я –



Спецыялізаванае абслугоўванне інвалідаў па зроку вядзецца ў бібліятэцы-філіяле № 12 Аршанскай ЦБС. Ад цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага (ЦБС г. Віцебска) працуюць 3 спецыялізаваныя пункты выдачы літаратуры: 2 пункты на УП «Элект» ГА БелТІЗ і адзін – у аддзяленні рэабілітацыі інвалідаў па зроку ДУСА «Віцебскі дом інтэрнат для састарэлых і інвалідаў». Акрамя таго, усе бібліятэкі вобласці на роўных правах абслугоўваюць людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, пажылых людзей і інвалідаў.

Сукупны фонд спецыяльных выданняў для інвалідаў з парушэннямі зроку ў публічных бібліятэках Віцебскай вобласці па стане на 01.01.2024 г. склаў 19 759 экз. За тры гады ён павялічыўся на 1 760 асобнікаў або на 9,8% (01.01.2021 – 17 999 экз.). Асновай спецыялізаванага фонду з'яўляецца агучаная літаратура, якая складае 98% ад агульнай колькасці (19 422 экз. па стане на 01.01.2024 г.). Колькасць новых паступленняў агучанай літаратуры ў фонды бібліятэк вобласці на працягу апошніх трох гадоў стабільная: 2021 год – 828 экз., 2022 – 861 экз., 2023 – 755 экз. Колькасць выданняў, выкананых шрыфтам Брайля, у сукупным фондзе бібліятэк вобласці складае 335 экз. або 2% ад агульнай колькасці. За тры гады яны павялічыліся на 40 экз. (11,9%).

Сайты ўсіх бібліятэчных сістэм вобласці маюць версіі, адаптаваныя для слабавідушчых карыстальнікаў. Работа па абслугоўванні людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, пажылых людзей і інвалідаў вядзецца ў бібліятэках ў рамках праграм і праектаў «Чалавек сярод людзей» (Пастаўская ЦБС), «Бібліятэка без межаў» (Браслаўская цэнтральная раённая бібліятэка), «Дарога дабра» (ЦБС г. Наваполацка), «Міласэрнасць» (Сенненская ЦБС) і інш. У бібліятэцы-філіяле № 21 замежнай літаратуры ЦБС г. Віцебска рэалізуецца праект для людзей з інваліднасцю «Распраў крылы»/«Spread the wings». На базе цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Ф. Скарыны Полацкай РЦБС рэалізуецца сацыяльны праект «Разам мы многае зможам!» для выхаванцаў ДУ «ТЦСАН Полацкага раёна».

Улічваючы рознабаковыя інтарэсы карыстальнікаў дадзенай катэгорыі, супрацоўнікі бібліятэк распрацоўваюць адукацыйныя праекты і праграмы: праграма «WEB-пенсіянер» (Полацкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны), праект «Школа прававых ведаў для старэйшага пакалення» (цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага ЦБС г. Наваполацка сумесна з аддзяленнем дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Наваполацкага ТЦСАН), праект па ўдасканаленні навыкаў працы з інфармацыйнымі рэсурсамі (Лепельская цэнтральная бібліятэка). Для пажылых грамадзян на базе Бабініцкай, Альгоўскай, Мазалаўскай бібліятэк Віцебскай РЦБС працуюць курсы камп'ютарнай граматнасці на бясплатнай аснове. Вольны час пажылых людзей, людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў бібліятэках забяспечваецца ў рамках работы клубаў і аматарскіх аб'яднанняў: «Клопат» (цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны Полацкай РЦБС), «Добрыя сустрэчы» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк),

(Віцебская РЦБС), краязнаўчы ўрок-вернісаж «Акно маей душы» (Дубровенская ЦБС), урок-гутарка «По пути к добру и свету» (Лёзненская ЦБС), музычная гадзіна «Кумір некалькіх пакаленняў» (Мёрская ЦБС), літаратурна-музычная гасцёўня «Вершы, якія спяваюць» (Чашніцкая РЦБС) і інш.

У наведвальнікаў бібліятэк карыстаюцца папулярнасцю мастацкія выставы, канцэрты, сустрэчы з пісьменнікамі і таленавітымі майстрамі. Так, бібліятэкамі вобласці былі арганізаваны мастацкія выставы: «Струна, звучащая стихами» (Бешанковіцкая ЦБС), «Нереальная реальность: жизнь и творчество Марка Шагала» (Глыбоцкая ЦБС), «Творения души и рук» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк), «Красовались лубочные картинки» (Аршанская ЦБС), «Жизнь, отданная родному краю» (Полацкая РЦБС), «Фарбы вясны» (Талачынская ЦБС), «Омар Хайям и его мудрые высказывания» (Віцебская РЦБС), «Вёсачка мая, ты мая старонка...» (Лепельская ЦБС), «Из бабушкиного сундука» (Міёрская ЦБС), «Майстар і акварэль» (Чашніцкая РЦБС) і інш.

На працягу года праходзілі майстар-класы: «Ружа для мамы», «Калядныя ўпрыгажэнні», «Зімовая карцінка», «Клубок, крючок и спицы в руках у мастерицы», «Лубочная картинка», «Чуткий слух, тонкий нюх» і інш.

## Абслугоўванне карыстальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя

Публічныя бібліятэкі ў сваёй дзейнасці імкнуцца стаць даступнымі для людзей з абмежаваннямі ў жыццядзейнасці, пажылых людзей і інвалідаў, даць ім роўныя магчымасці ў атрыманні інфармацыі і арганізацыі вольнага часу.

З мэтай стварэння безбар'ернага асяроддзя бібліятэкі Віцебскай вобласці прыкладваюць пэўныя намаганні, каб павысіць даступнасць будынкаў і памяшканняў для ўсіх катэгорый карыстальнікаў. Каля 34% ад агульнай колькасці бібліятэк знаходзяцца ў будынках, спецыяльна абсталяваных элементамі безбар'ернага асяроддзя: пандусамі, пад'ёмнікамі, альбо маюць кнопкі выкліку персаналу для забеспячэння камфортнага абслугоўвання. У 2023 годзе ў Віцебскую абласную бібліятэку імя У.І. Леніна набыты лесвічны гусенічны пад'ёмнік «Барс УПГ-130», маўленчы гукавы электронны інфарматар з дыстанцыйным кіраваннем, тактыльныя налепкі на поручні, мнемасхема з планам першага паверха і падлогавая стойка для яе размяшчэння, мнемасхема для вызначэння санпамяшкання, тактыльная плітка ПВХ. У цэнтральную гарадскую бібліятэку імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска набыты інфарматар маўленчы гукавы электронны з дыстанцыйным кіраваннем. Шаркаўшчынская ЦБС закупіла кнопкі выкліку персаналу, дзве тактыльныя таблічкі са шрыфтам Брайля «Расклад працы бібліятэкі» і «Абанемент». Тактыльная вулічная шыльда для бібліятэкі імя А. Савіцкага-філіяла № 9 была набыта ў Полацкай РЦБС. Кнопка выкліку персаналу – у Лёзненскай ЦБС.



чалавек!», «Я, ты, ён, яна – мы маем усе правы», «Юныя сябры закона», «Прававая культура школьніка» і інш.

## Сямейнае выхаванне

Бібліятэкамі вобласці надаецца вялікая ўвага сямейнаму выхаванню, а таксама ролі сям'і ў развіцці і выхаванні дзіцяці, пытанням сямейных адносін і сямейнаму чытанню. Бібліятэкі Віцебшчыны працуюць у рамках мэтавых праграм, праектаў па пытаннях сямейнага выхавання: «Пад сямейным парасонам» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк, Шаркаўшчынская ЦБС); «Сямья – як шмат у гэтым слове…» (Докшыцкая ЦБС); «Библиотека и семья» (Полацкая РЦБС); «Усё пачынаецца з сям'і» (ЦБС г. Віцебска); «Библиоформат» (ЦБС г. Наваполацка) і інш.

У Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы імя П. Панчанкі Докшыцкага раёна рэалізаваўся праект «Бацькоўскі дзень у бібліятэцы». Бацькі разам з дзецьмі прымалі ўдзел у розных мерапрыемствах і акцыях: этна-знаёмства «Мама, тата, я – беларуская сям'я», акцыі «Сямейныя чытанні», «Я чытаў і табе раю».

У Публічным цэнтры прававой інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Аршанскага раёна ў рамках мэтавай комплекснай праграмы «Бібліятэка – школа прававой культуры» для студэнтаў Аршанскага каледжа УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» прайшла прававая размова «Семья через зеркало закона». Гасцямі мерапрыемства сталі натарыусы натарыяльнай канторы Н.М. Чыкан і В.Г. Дзямідава, псіхолаг Аршанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі К.А. Шамбоўская, святар царквы Нараджэння Прасвятой Багародзіцы айцец Аляксандр.

У рамках праграмы «Інфармацыйна-бібліятэчны ліцэй» у Лепельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла гутарка-дыспут «Адносіны з бацькамі: здаровая дыстанцыя». Вечная тэма – здаровыя адносіны паміж дарослымі і падлеткамі, якія павінны насіць даверлівы і ўзаемадапаўняльны характар.

Праект цэнтральнай бібліятэкі імя У. Маякоўскага г. Наваполацка «Ура! ПРАЗДНИК!» дапамог прыцягнуць у бібліятэку наведвальнікаў рознага ўзросту і адрадзіць традыцыі сямейнага чытання і сямейных святаў. У сценах бібліятэкі праходзілі дзіцячыя дні нараджэння, навагоднія ранішнікі, выпускныя пачатковых класаў.

Адной з галоўных падзей года стала, традыцыйнае, свята-ўшанаванне «Самая читающая семья» з урачыстым узнагароджаннем сямей, якія чытаюць у ЦБС г. Віцебска. Чытачка бібліятэкі замежнай літаратуры А. Ражко павіншавала ўсіх музычнай кампазіцыяй, а Д. Гайсёнак, якая прадстаўляла бібліятэку імя Е. Лось – падаравала ўсім гасцям свята сваю аўтарскую экалагічную казку. Народны тэатр моды «Стыль» Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа з калекцыяй «Вялікія святы» надаў мерапрыемству нацыянальны каларыт і

выклікаў шчырае захапленне гасцей. Мерапрыемства было арганізавана пры падтрымцы грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

У межах Міжнароднага дня сям'і ў бібліятэках вобласці праходзілі масавыя мерапрыемствы, якія спрыялі ўмацаванню статусу сям'і, папулярызацыі сямейных каштоўнасцей: дзень новай кнігі «Новая кніга для сямейнага чытання» (ЦБС Браслаўскага раёна); літаратурныя вячоркі «Вся семья вместе, так и душа на месте» (Полацкая РЦБС); літаратурны караван «Счастья и мира вашему дому» (Пастаўская РЦБС); літаратурна-музычны вечар «Семь цветов радуги – СЕМЬЯ!» (Сенненская ЦБС); тэматычная вечарына «Востраў сямейных скарбаў» (Талачынская ЦБС); дзень сямейнага чытання «Всей семьёй в библиотеку» (Лёзненская ЦБС); гульнявая праграма «Береги, мой друг, семью – крепость главную свою» (Лепельская ЦБС); конкурсна-гульнявая праграма «Если есть семья – значит счастлив я!», «Маці і бацька – святыя імёны!» (ЦБС г. Наваполацка); літаратурная гадзіна «Семья – это маленькая вселенная» (Ушацкая ЦБС); гутарка-дыялог «Мая сям'я – мае каштоўнасці» (Чашніцкая РЦБС) і інш.

У Мёрскай цэнтральнай бібліятэцы прайшоў адкрыты дыялог «Партнерство государства и семьи в интересах поколений». На сустрэчы прысутнічалі маладыя, мнагадзетныя сем'і, моладзь раёна, прадстаўнікі духавенства, спецыялісты па працы, адукацыі, аддзела архітэктуры і будаўніцтва і інш. Бібліятэкар прапанавала паўдзельнічаць у гадзіне разважанняў для бацькоў «Что читают наши дети?».

У рамках рэспубліканскай акцыі «Мая сям'я – мая краіна!» цэнтральнай раённай бібліятэцы Бешанковіцкага раёна прайшла дыялогавая пляцоўка на тэму: «Партнёрства дзяржавы і сям'і ў інтарэсах будучых пакаленняў». Мадэратарам выступіла загадчык аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў ТЦСАН Бешанковіцкага раёна А. Цапота. Удзел у размове аб сям'і як найважнейшым сацыяльным інстытуце прынялі старшыня раённага выканаўчага камітэта Г. Унуковіч, намеснік старшыні райвыканкама А. Ерашоў, кіраўнікі і спецыялісты аддзелаў і службаў райвыканкама, прадстаўнікі духавенства, сямейныя пары. Бібліятэкар правяла агляд кніг «Гісторыя сям'і ў мастацкай літаратуры».

У Глыбоцкай ЦБС прайшоў вечар сямейнага адпачынку «Дзень сям'і, кахання і вернасці», на які былі запрошаны сем'і з розным жыццёвым вопытам. Прысутныя прынялі ўдзел у гульнявой праграме «Што важней за ўсё на свеце – мір, каханне, сям'я і дзеці».

У рамках Тыдня бацькоўскай любові, які аб'яднаў два святы – Дзень маці і Дзень бацькі, прайшлі мерапрыемствы: літаратурны вечар «Жаночыя імёны ў гістарычна-культурнай прасторы Беларусі» (Глыбоцкая ЦБС); пасядзелкі «Сердце матери – исток доброты» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк); свята дабра «Родные руки берегут домашний ласковый уют» (Аршанская ЦБС); літаратурна-музычная кампазіцыя «Самы лепшы тата» (Верхнядзвінская ЦБС); гадзіна сямейнага выхавання «Лучше папы друга нет» (Докшыцкая ЦБС); адукацыйна-забаўляльная гадзіна «Рядом с папиным плечом все обиды



прысвячаецца», «Велікодная вясёлка» (выстава работ навучэнцаў ДУА «Лепельская ДШМ») і інш. У рамках мастацка-літаратурнага праекта «Сябруюць кніга і кіно» сектар па абслугоўванні дзіцячага чытача Бешанковіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі запрасіў дзяцей з ДУА «Бешанковіцкі раённы сацыяльны педагагічны цэнтр» на кінасустрэчу «Паглядзеў кіно – прачытай кнігу», дзе дзеці пазнаёміліся з гісторыяй стварэння першых кінастужак, паслухалі агляд кніг, па якіх былі зняты ўсімі любімыя фільмы.

У рамках праграмы «Свет мастацтва: прастора і час» у ЦБС г. Наваполацка пачалася рэалізацыя сумеснага з Наваполацкім дзяржаўным музычным каледжам праекта па эстэтычнаму выхаванню, у рамках якога адбылося ток-шоу «Паспяховы дэбют», падчас якога быў прадстаўлены творчы калектыў «AstroCellos» – трыа віяланчэлістаў: выкладчык і музыкант Рудольф Чыркоў, а таксама навучэнцы каледжа Марк Лешчанка і Уладзіслаў Піталенка. Харызматычныя музыканты выканалі класічныя і сучасныя творы. Таксама наведвальнікі бібліятэкі сустрэліся з ансамблем беларускай народнай песни «Вербіца» і інш.

У канцы мая ў Віцебску прайшоў Першы фестываль літаратурнай казкі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Касцюм для героя», прысвечаны ўраджэнцу Віцебска, аўтару знакамітай чароўнай аповесці-казкі «Стары Хатабыч» Лазару Лагіну. Творчыя сустрэчы з удзельнікамі фестывалю прайшлі ў бібліятэках імя Е. Полацкай і М. Лынькова г. Віцебска. Чытачы пазнаёміліся з пісьменнікам і журналістам Марынай Козікавай (Санкт-Пецярбург), дзіцячым пісьменнікам Аленай Курынай (Растоў-на-Доне), беларускім пісьменнікам Ірынай Карнавухавай, настаўнікамі пачатковых класаў з Віцебска Анастасіяй Фунцікавай і Аленай Хлудзенкай, расійскай казачніцай Валянцінай Касарэўскай і іншымі.

У ЦБС Браслаўскага раёна ў рамках гісторыка-патрыятычнага марафона «Пазнай Беларусь – и ты яе палюбишь» і краязнаўчага курса «Браславазнаўства» прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя розным відам мастацтва: галерэі партрэтаў «Их лица высветило время: белорусские художники», «Их лица высветило время: белорусские музыканты, режиссёры, артисты», слайд-падарожжы «Беларусь – краіна замкаў і палацаў», «Замкі і сядзібы Браслаўшчыны».

Выхаванне эстэтычнага густу праходзіла і ў межах іншых мерапрыемстваў: музычна-паэтычны вечар «Струна оборванного сердца» (Бешанковіцкая ЦБС), пазнавальная гадзіна «История простых вещей. Балалайка» (Глыбоцкая ЦБС), гадзіна ветлівасці «Дзякуй слова не простае» (Аршанская ЦБС), мастацка-гістарычны экскурс «Почему мы так одеты» (Полацкая РЦБС), эстэтычная гадзіна «Суриков и его картины» (Пастаўская РЦБС), літаратурны турнір «Моя любимая книга» (Сенненская ЦБС), арт-гадзіна «Вялізны свет яго душы» (Талачынская ЦБС), гадзіна мастацтва «Б. Кустодиев – мастер психологического портрета» (Шаркаўшчынская ЦБС), кінагасцёўня «Ожившие картинки» (Шумілінская ЦБС), літаратурны вернісаж «Окрыленность поэтической строки»

«Чернобыля чёрный апрель» (Аршанская ЦБС); грамадскі форум «Чорны дзень красавіка» (Полацкая РЦБС); інфармацыйная гадзіна «Катастрофа длинною в жизнь» (Сенненская ЦБС); інфармацыйнае дасье «Пад ценем крылаў Чарнобыльскай бяды» (Талачынская ЦБС); экагадзіна «Чарнобыль – чорны боль» (Шаркаўшчынская ЦБС); гадзіна памяці «Чарнобыль: па слядах катастрофы» (Лепельская ЦБС); урок-рэквіем «Чарнобыльская катастрофа: мінулае і сучаснасць» (ЦБС г. Наваполацка) і інш.

Выхаванню экалагічнай культуры чытачоў садзейнічалі і кніжныя выставы, фотавыставы, презентацыі і відэаагляды: «Па старонках Чырвонай кнігі», «Дикие и домашние – все такие важные», «Расказы дзеда Прыродаведа», «Парады па энергазберажэнні», «Экалагічны вернісаж», «Мусор + Фантазия», «Останьтесь на Земле», «Энергосбережение в нашей жизни», «Гэтыя дзіўныя жывёлы», «Чернобыль – эхо ядерного века», «Чернобыль: Не гаснет памяти свеча», «У черты, за которой мрак», «Чарнобыльскі набат» і інш.

## Эстэтычнае выхаванне

Фарміраванне ў чытачоў эстэтычнага ўспрымання свету з дапамогай лепшых узораў беларускага і сусветнага мастацтва і літаратуры – важная задача бібліятэк як установ культуры. Індывідуальныя праграмы, шматлікія мерапрыемствы і выставачная дзейнасць дазваляюць чытачам праз творчасць мастакоў, пісьменнікаў, музыкантаў звяртацца да сусветных культурных каштоўнасцей, выхоўваць свой асабісты эстэтычны густ, пашыраць кругагляд і садзейнічаць усебаковаму развіццю асобы.

Бібліятэка – традыцыйнае месца сустрэчы пісьменнікаў і таленавітых людзей са сваімі чытачамі. У Бешанковіцкай ЦБС прайшла творчая сустрэча «Таленты сярод нас» з наведвальніцай аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ТЦСАН Бешанковіцкага раёна Галінай Халабузар. «Вышыўка» пластылінам – умоўная назва таго, чым займаецца Галінай Рыгораўнай. Партрэты, пейзажы, іконы ў яе выкананні ўражваюць тонкасцю. У ЦБС Браслаўскага раёна адбыласясустрэча з творчымі людзьмі: юнай мастачкай Евай Камінскай і аўтарам «Азбуки в стихах» Ганнай Лемяшонак.Цёпла прайшла онлайн-сустрэча з пісьменніцай Вольгай Маслюковай у Мёрскай ЦБС, бібліятэкары і чытачы адкрылі для сябе новыя рысы яе творчасці. Не менш душэўна прайшла творчая сустрэча з паэткай Святланай Захарэвіч, на якой адбылася прэзентацыя зборніка паэзіі «Жемчужины моей души», у які ўвайшлі вершы, напісаныя ў розныя перыяды жыцця.

Мэтавыя праграмы і праекты надаюць эстэтычнаму выхаванню сістэмны і паслядоўны характар. У Лепельскай ЦБС рэалізаваўся праект «Свет мастацтва». На працягу года ў «Галерэі «Арт-Лепель» адбылося адкрыццё 12 мастацкіх выстаў: «Марознае чараўніцтва», «Творчае трыа» (персанальная выстава Г. Сакаловай, А. Сярэбранай і Ю. Папковай, навучэнцаў ДУА «Лепельская ДШМ»); «Маляўнічы дэбют» (персанальная выстава Фаміной Варвары і Бельскай Сафіі), выстава-віншаванне «Мамам



нипочем» (Аршанская ЦБС); тэматычны вечар «Ты для меня пример во всём» (Пастаўская РЦБС); шчырая размова «Бацька – сям'і апора» (Талачынская ЦБС); забаўляльная праграма «Вместе – дружная семья» (Лёзненская ЦБС); тэматычная праграма «Мы ўсе жывём пад зоркамі матуль» (Лепельская ЦБС) і інш. У Мяжанскай бібліятэцы-клубе Гарадоцкага раёна была арганізавана дыялогавая пляцоўка «Укрепление семейных ценностей – залог счастливой семьи», на якой прысутнічалі прадстаўнікі розных пакаленняў. Гаворка ішла аб сямейных традыцыях, якія існавалі шмат гадоў назад і сучасных, ролі бацькі і маці ў выхаванні дзяцей, адносін і павагі паміж мужам і жонкай. На працягу тыдня дзейнічалі кніжная выстава «Папой быть – совсем непросто», выстава-фотапогляд «Я и моя мама», фотаздымкі на якую прадставілі самі чытачы.

У Сяляўшчынскай бібліятэцы Расонскага раёна для выхаванцаў ДУА «Сяляўшчынскі дзіцячы сад-базавая школа Расонскага раёна» была праведзена літаратурна-гульнявая праграма «Дружная семейка». Падчас мерапрыемства хлопчыкі і дзяўчынкі пазнаёміліся з традыцыямі святкавання Дня маці і Дня бацькі, слухалі вершы, удзельнічалі ў конкурсах «Какая мама?», «Какой папа?», «Поможем маме», «Самый, самый…» і адгадвалі загадкі пра бацькоў. У завяршэнні праграмы дзеці зрабілі падарунак для таты ў тэхніцы аплікацыі.

Дзень абароны дзяцей – гэта не толькі вясёлае свята, гэта і напамін грамадству аб неабходнасці абараняць правы дзяцей. Ва ўстановах ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» быў праведзены цыкл мерапрыемстваў па прафілактыцы злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці і свабоды непаўналетніх. Супрацоўнікі Чашніцкай РЦБС на вуліцах горада правялі інфармацыйную акцыю «Дзяцінства без гвалту. Разам мы справімся». Падчас акцыі скарыстаны друкаваныя выданні малых форм уласнага выпрабу з рэкамендацыямі бацькам: «Як абараніць дзіця ад гвалту», «Што рабіць, калі дзіця стала ахвярай гвалту», «Як абараніць дзіця ад гвалту ў Інтэрнэце».

Конкурсна-забаўляльная праграма «Вясёлка – планета Дзяцінства» прайшла ў Бароўскай сельскай бібліятэцы – філіяле № 6 Лепельскага раёна. У госці да дзяцей завітала Сонейка, якое правяло з дзецьмі эстафеты, гульні, танцы. Сенненская раённая і дзіцячая бібліятэкі правяла на летняй танцпляцоўцы забаўляльную праграму «Планета дзяцінства» з удзелам ДШМ і РЦДіМ. Казачныя героі весялілі дзяцей і дарылі ім пазітыўны настрой. Народны лялечны тэатр кнігі «Пятрушка» прадэманстраваў спектакль «Летняя казка».

У Докшыцкай ЦБС да Дня абароны дзяцей была афармлена вітражная фотавыстава «Свет пачынаецца з дзяцінства». На выставе былі размешчаны фотаздымкі дзяцей горада, дзе кожны меў сваю сямейную гісторыю.

У гарадскім дзіцячым парку Оршы «Казачная краіна» адбылося Свята марожанага. У рамках свята супрацоўнікі Аршанскай ЦБС падрыхтавалі для хлопчыкаў і дзяўчынак займальную культурна-

забаўляльную праграму «Солнце, книга и игра – наша летняя пора». Свята атрымалася па-сапраўднаму сямейным і вясёлым.

Асаблівая ўвага ў бібліятэках надаецца арганізацыі вольнага часу непаўналетніх карыстальнікаў падчас канікулаў. Пры планаванні і правядзенні мерапрыемстваў бібліятэкі цесна супрацоўнічаюць з установамі культуры, адукацыі, аховы здароўя, праваахоўнымі органамі. Бібліятэкі актыўна наведвалі дзеці з школьных аздараўленчых лагераў. Для іх працавалі гульнявыя пляцоўкі, праводзіліся розныя мерапрыемствы.

У бібліятэках вобласці дзейнічалі тэматычныя выставы «Сям'я на старонках кніг» (Глыбоцкая ЦБС); «Говорите мамам нежные слова» (Полаоцкая РЦБС); Зазірніце ў сямейны альбом» (Талачынская ЦБС); «Часцінка бацькоўскай душы» (Шаркаўшчынская ЦБС); «Семья – хранилище души» (Лёзненская ЦБС); «Семейные кризисы. Как их преодолеть?» (Лепельская ЦБС) і інш.

У аснове работы па сямейным выхаванні ляжыць ідэя ўздзеяння кнігі і чытання на сямейнае выхаванне. Бібліятэкары праводзяць немалую работу, каб прыцягнуць у бібліятэкі сем'і, арганізаваць іх вольны час, прапанаваць літаратуру па розных напрамках выхавання дзяцей, па педагогіцы, псіхалогіі, працоўнаму, эстэтычнаму выхаванню, здароваму ладу жыцця і інш.

## Экалагічнае выхаванне

Бібліятэкі Віцебскай вобласці актыўна прымаюць удзел у выхаванні экалагічнай культуры насельніцтва. У мэтах экалагічнага інфармавання насельніцтва, экалагічнай асветы падрастаючага пакалення ў бібліятэках паспяхова рэалізуюцца больш за 26 мэтавых праграм і праектаў: «Падаруйце зямлю нашчадкам» (Шаркаўшчынская ЦБС); «Абараніць. Захаваць. Зберагчы» (Глыбоцкая ЦБС); «Да экалогіі праз кнігу» (Мёрская ЦБС); «Зелёное платье родного края» (ЦБС Расонскага раёна); «Родную землю познаём і бережём» (Сенненская ЦБС); «Чистый мир» (Ушацкая ЦБС); «Свет вакол нас» (Чашніцкая РЦБС); «Экалогия. Свет. Чалавек», «Мусорная корзинка» (ЦБС г. Віцебска); «Дети. Экология. Книга» (ЦБС г. Наваполацка) і інш. Бібліятэка імя Л. Талстога г. Віцебска працавала па мэтавай экалагічнай праграме «Экология. Мир. Человек». Супрацоўнікі бібліятэкі вялі тэматычную картатэку «Календарь экологических дат», у якой адлюстроўваецца тэматычная літаратура. На працягу года афармляліся кніжныя выставы: «Болотная сага» да Сусветнага дню водна-балотных угоддзяў, «Полон лес чудес» да Міжнароднага дню леса, «Живая палитра планеты» да Міжнароднага дню біялагічнай разнастайнасці і інш.

Барздзоўская сельская бібліятэка Аршанскай ЦБС сумесна з супрацоўнікамі Барздзоўскага сельскага Дома культуры ў рамках праекта «Посиделки на подушках» для вучняў школьнага лагера «Дружны» ДУА «Барздзоўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа Аршанскага раёна» правялі



экалагічны квіз «Воробышки пляшут – крылышками машут», прысвечаны Міжнароднаму дню птушак.

У рамках сацыяльна-экалагічнага праекта «Вместе мы многое сможем!» Полацкая РЦБС сумесна з наведвальнікамі ДУ «ТЦСАН Полацкага раёна» АДПІ пабывалі «В подснежном царстве», дзе віртуальна пазнаёміліся з першацветамі. Майстар-клас па вырабу паштовак «Цветочные фантазии» стаў заключным акордам мерапрыемства.

У бібліятэках вобласці працуе 48 экалагічных клубаў і аматарскіх аб'яднанняў: «Юный эколог», «Жураўлік» (Глыбоцкая ЦБС); «Лесовичок» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк); «Светлячок» (Докшыцкая, Лепельская ЦБС); «Подснежник» (Дубровенская ЦБС), «Сябры прыроды» (Мёрская ЦБС); «Флорята» (Лёзненская ЦБС); «Цветок» (Аршанская ЦБС); «Экоша», «Весёлый муравейник» (Полацкая РЦБС); «Крынічка» (Пастаўская РЦБС); «Книгочей-Эколог» (ЦБС Расонскага раёна); «Чароўная кветка» (Сенненская ЦБС); «Флора» (Чашніцкая РЦБС); «Веснянка» (Шаркаўшчынская ЦБС) і інш. На пасяджэннях клубаў іншых накірункаў таксама падымаюцца пытанні экалагічнай тэматыкі. Так, у Бешанковіцкай ЦБС прайшло пасяджэнне клуба «Парус», дзе кіраўнік клуба прапанавала ўдзельнікам мерапрыемства экалагічны відэарэпартаж «Путешествие в заповедный мир». Удзельнікі клуба здзейснілі займальнае падарожжа па запаведных мясцінах Беларусі, даведаліся аб прызначэнні запаведнікаў і нацыянальных паркаў.

Бібліятэкі прымалі актыўны ўдзел у прыродаахоўных акцыях: «Час змяняць звычкі», «Мой самы верны сябар» (ЦБС г. Віцебска); «Пасадзі дрэва», «Цяжка птушкам зімаваць – трэба ім дапамагаць» (Глыбоцкая ЦБС); «Гадзіна Зямлі» (Полацкая РЦБС); «Прывядзём у парадак сваю планету!», «Сакрэты беражлівасці» (Шумілінская ЦБС); «Мы сябры твае, прырода» (Віцебская РЦБС); «Давайце эканоміць разам» (Чашніцкая РЦБС) і інш. Ва Ульянавіцкай сельскай бібліятэцы Сенненскай ЦБС прайшла экалагічная акцыя «Птушыная сталовая». Удзельнікі – вучні рознага ўзросту – майстравалі кармушкі з падручных матэрыялаў.

У Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы Гарадоцкага раёна прайшоў экалагічны турнір «Адчуй гармонію прыроды». Падчас мерапрыемства дзеці спаборнічалі паміж сабой у ведах аб прыродзе. Успомнілі правілы бяспекі каля вадаёмаў і ў лесе, прагледзелі відэаролік «Сэрцу мілая старонка» аб прыродзе пасёлка Езярышча, які падрыхтавалі бібліятэкары. У Сітцаўскай сельскай бібліятэцы Докшыцкай ЦБС у час правядзення экападарожжа «Лес поўны цудаў» была падрыхтавана сустрэча з ляснічым Параф'янаўскага лясніцтва, дзеці адказвалі на пытанні віктарыны, адгадвалі загадкі, пазнаёміліся з кнігамі пра прыроду і жывёл.

Асобнай тэмай для мерапрыемстваў стала тэма *Чарнобыльскай катастрофы*. У красавіку кожная бібліятэка вобласці лічыць сваім абавязкам нагадаць чытачам аб гэтай падзеі: відэапрагляд «Чарнобыль: дні выпрабаванняў» (Бешанковіцкая ЦБС); інфармацыйная гадзіна «Чарнобыль – боль і памяць» (Докшыцкая ЦБС); інфармацыйная гадзіна